Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 29 (4524) 7 жніўня 2009 г.

У нумары:

Паклон Купалавай зямлі

Віцебскае абласное свята паэзіі ў Ляўках.

Стар. 2

«Сапажкоў прагрымеў на ўвесь Лондан»

Рускамоўныя пісьменнікі Беларусі атрымліваюць прэстыжныя ўзнагароды па-за межамі краіны.

Стар. 5

Тысяча гадоў пісьменства

У філалогіі таксама ёсць месца для адкрыццяў!

Стар. 7

Адметная дынастыя

У Крупскай карціннай галерэі — мастацкая выстава «Дынастыя Аракчэевых».

Стар. 10

Міф пра 25-ы кадр

Выснова аўтара — адназначная і катэгарычная.

Стар. 12

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 7760 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 10060 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 5200 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі:
1 месяц — 7870 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Крыніца прыгожага — Ракуцёўшчына

У чарговы раз аматары беларускай літаратуры сабраліся на Маладзечаншчыне. У філіяле Літаратурнага музея Максіма Багдановіча прайшло традыцыйнае свята паэзіі "Ракуцёўскае лета-2009".

— Кожны год тут гучаць прыгожыя вершы, прыгожая беларуская мова, прыгожая музыка, прыгожыя песні. Той, хто прыехаў сюды ўпершыню, зразумеў, чаму гэтыя мясціны натхнялі вялікага беларускага паэта Максіма Багдановіча, — сказала галоўны спецыяліст упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Беларусі Святлана Гаўрылава.

І сапраўды, мясціны тут асаблівыя. Нездарма сюды кожны год прыязджаюць пісьменнікі. І пабываўшы ў Ракуцёўшчыне, праз год літаратары прыязджаюць сюды з новымі прысвячэннямі класіку айчыннай літаратуры. З кожным разам яны пераасэнсоўваюць ягоную паэзію, што ўзбагачае і іх уласную творчасць.

Сёлета сваім словам шанавалі Максіма Багдановіча Леанід Дранько-Майсюк, Віктар Шніп, Уладзімір Арлоў, Людміла Рублеўская, Анатоль Зэкаў і многія іншыя творцы.

Радуе тое, што паслухаць паэзію сабраліся не толькі самі пісьменнікі. Шмат было людзей не творчых прафесій. Але ад гэтага іх любоў да літаратуры не меншая. А галоўнае, што прысутнічалі дзеці. Калі яны з дзяцінства ўжо гадуюцца на высокай паэзіі, то вырастуць шчырымі беларусамі. Такімі, якім быў сам Максім-кніжнік.

Прыемнай неспадзяванкай для прысутных на свяце стала сустрэча з нашчадкам роду Багдановічаў — Вольгай Дашкоўскай. Вольга Паўлаўна з'яўляецца сваячкай паэта па лініі яго бацькі Адама Багдановіча. Жанчына толькі восемдзесяць гадоў таму даведалася пра свае роднасныя сувязі з Багдановічамі.

— Даведаліся пра сваяцтва пасля публікацыі ўспамінаў Адама Ягоравіча Багдановіча. Мы прачыталі, што ягоны род паходзіць з вёскі Касарычы, адкуль паходзіла і мая прабабка. Затым адшукалі ў архіве і дакументы, што пацвярджаюць такі факт. Але мы не рабілі з гэтага нейкай сенсацыі. І толькі калі мой брат у адной з перадач па тэлебачанні пра Максіма Багдановіча пачуў, што ў паэта не засталося сваякоў, тады мы ўжо звязаліся з Літаратурным музеем Багдановіча ў Мінску.

І вось у нядзелю Вольга Дашкоўская ўпершыню прыняла ўдзел у "Ракуцёўскім леце". Яна завітала з падарункам. Гэта вышыванка, якую зрабіла яшчэ да рэвалюцыі 1917 года Дар'я, сястра Максіма ў трэцяй стрэчы. На жаль, мужчынская лінія ў сям'і Вольгі Паўлаўны абарвалася. І яна застаецца адзіным прадстаўніком роду Багдановічаў.

У фальварак Ракуцёўшчына, які належаў дробнаму шляхціцу Вацлаву Лычкоўскаму, Максіма Багдановіча летам 1911 года прывезлі нашаніўцы браты Антон і Іван Луцкевічы. На Маладзечаншчыне паэт напісаў серыю вершаў пад назвай "Старая Беларусь" і паэму "Вераніка", якая ўвайшла ў вядомы цыкл "Мадонны":

І конь крылаты да Парнаса
Мой дух імчыць тады, каб я
Былое апяваў пасля.
Ды як знайсці сляды Пегаса
На бруку места? Цяжка ўперш!
Спачынь жа трохі, верны верш!

У чэрвені 1977 года ля вёскі Ракуцёўшчына былі пастаўленыя два камяні. Адзін сімвалізуе свечку вечнай памяці, а на другім прымацаваная памятная шыльда з партрэтам паэта і радкамі з ягонага верша. Пятнаццаць гадоў таму была створана першая музейная экспазіцыя ў Ракуцёўшчыне, якая з часам пашыралася. І на сёння філіял музея паэта ў вёсцы ўключае ў сябе Дом арандатара, Дом гаспадара, гумно, Максімаву крыніцу, помнік і Максімаў сад.

Антон КАЧАН

На здымках: памятная шыльда каля вёскі Ракуцёўшчына; Алесь Камоцкі спявае "Зорку Венеру" Багдановіча. Фота аўтара

Пункцірам

● На тэрыторыі былога лагера смерці "Трасцянец", у раёне вуліцы Сяліцкага ў Мінску, паўстане мемарыяльная кампазіцыя. Рэспубліканскі конкурс на стварэнне такой кампазіцыі абвясціў Мінгарвыканкам. Вынікі конкурсу будуць падведзены сёлета ў кастрычніку. А ў наступным годзе плануецца прыступіць да ўпарадкавання тэрыторыі і рэалізацыі праекта. З часам у комплексе павінен размясціцца філіял музея Вялікай Айчыннай вайны.

● Сёлета павінны быць завершаны рамонтныя работы ва ўсходнім крыле Мірскага замка, упарадкаванне тэрыторыі вакол яго, будаўніцтва кантрольна-прапускнога пункта. Пра гэта паведамілі на калегіі Міністэрства культуры Беларусі. Акрамя гэтага павінны быць праведзены рэстаўрацыйныя работы ў паўночным крыле замка, мантаж інжынерных сістэм, мантажныя работы ў вежах. Рэстаўрацыя помніка архітэктуры XVI стагоддзя Мірскага замка праводзіцца ў рамках Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы.

● У Івянецкім музеі традыцыйнай культуры працуе фотавыстава Ігара Лявінскага. На ёй выстаўлены 15 работ, на якіх адлюстравана мястэчка і яго краявіды. "Усе работы падобныя на акварэльныя эцюды, — кажа дырэктар музея Алег Раманоўскі. — Захапляюць арыгінальнасцю кампазіцыі, стрыманасцю каларыту, а таксама высокай тэхнікай выканання".

● У Мінску пачалося пераўладкаванне тэрыторыі вакол касцёла святых Сымона і Алены (Чырвонага касцёла). Аўтар праекта — заслужаны архітэктар Беларусі Леанід Левін. Яго задума заключаецца ў тым, каб стварыць уражанне, што храм акружаны квітнеючым архітэктурным вянком. Касцёл будзе стаяць на велічным пастаменце з мноствам прыступак. Адбудзецца таксама перанос помнікаў вакол святыні. Скульптура арханёла Міхаіла зойме месца "Званоў Нагасакі", якія таксама перамесцяцца. На іншым месцы будзе помнік першаму ваеннаму рэдактару газеты "Звязда", а на яго месцы — скульптура Яна Паўла II.

● У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрылася выстава італьянскай графікі. У экспазіцыі прадстаўлена 16 твораў, выкананых у тэхніцы літаграфіі, афорта і змяшаных матэрыялаў. На гравюрах адлюстраваны жаночыя партрэты, сярэднявечныя рыцары, героі міфаў, фантастычныя пейзажы. Іх выканалі Рыкарда Бенвенуці, Рафаэль дэ Роза, Энрыка Мастраяні, Джорджыа дэ Кірыка. Выстава працуе да 30 жніўня.

● У Докшыцкім раёне з'явіўся мемарыяльны знак у памяць пра жыхароў, спаленых нацыстамі. Калі фронт у 1944 годзе падыходзіў да гэтых мясцін, атрад гітлераўцаў акружыў вёскі Верацеі, Чупры і Таўшчы. Іх жыхароў сагналі разам у свіран і падпалілі. Тады загінулі 56 вяскоўцаў, з якіх 29 дзяцей. Праз дзесяцігоддзі па архіўных дакументах было адшукана месца трагедыі. Сёння пра той жудасны дзень нагадвае памятны знак з граніту.

● Помнік вядомаму музыканту Чэславу Неману (Відржыцкаму) на Шчучыншчыне будзе дэманціраваны. Такое рашэнне прынялі ў Шчучынскім райвыканкаме, спаслаўшыся на парушэнне заканадаўства пры яго ўстаноўцы. Драўляны помнік быў пастаўлены на тэрыторыі касцёла святога Іаана Хрысціцеля ў в. Васілішкі па ініцыятыве генеральнага консула Польшчы ў Гродне, мясцовых вернікаў і святара.

Падрыхтаваў Павел РАДЫНА

Паклон Купалавай зямлі

Традыцыі

У вёсцы Ляўкі, што на Аршаншчыне, на былой дачы Янкі Купалы, адбылося Віцебскае абласное свята паэзіі "Паклон табе, зямля Купалы", якое стала ўжо традыцыйным.

У свяце ўдзельнічалі віцебскія і аршанскія паэты на чале са старшынёй Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамарай Красновай-Гусачэнка, а таксама госці з Мінска — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міхась Башлакоў, паэты Павел Саковіч і Андрэй Цяўлоўскі, калектывы народнай самадзейнасці, прадстаўнікі раённага і абласнога кіраўніцтва.

Надоўга запомніцца ўдзельнікам свята гасціннасць гаспадароў. Сустрэча хлебам-соллю і прывітальнай песняй у выкананні Зубаўскага народнага хору. Запрашэнне пакаштаваць страў, прыгатаваных мясцовымі жыхарамі па народных рэцэптах і калісьці любімых Купалам. Экскурсія па Ляўкоўскім доме-музеі Янкі Купалы, якую правяла навуковы супрацоўнік Л. Упенік... Як заўсёды, прыемна ўразіла цікавасць да паэзіі мясцовых жыхароў: многія з іх ішлі на свята паэтычнага Слова пешшу за некалькі кіламетраў. Дый наогул слухачоў сабралася шмат, нягледзячы на тое, што Ляўкі знаходзяцца ўбаку ад буйных трас. Значнасць мерапрыемства падкрэсліў і ўдзел у ім начальніка ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Мікалая Пашынскага і намесніка старшыні Аршанскага райвыканкама Дзмітрыя Хуцкага.

Пасля завяршэння свята, даведаўшыся, што ў гасцей з Мінска яшчэ засталася гадзіна да адпраўлення цягніка, начальнік аддзела культуры Аршанскага райвыканкама Святлана Чобат і дырэктар цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Аршанскага раёна Марына Поляк арганізавалі для іх імправізаваную экскурсію па адноўленай Оршы. Паэты наведалі старажытныя храмы, пабывалі ў будынку былога езуіцкага калегіума, дзе цяпер, апроч іншых устаноў, месціцца гарадская дзіцячая бібліятэка і карцінная галерэя.

Андрэй КАНСТАНЦІНАЎ

На здымку: удзельнікаў свята вітае харэаграфічны калектыў "Візаві" Аршанскага Палаца чыгуначнікаў.

Без прыўкрас

Прэм'еры

Мазырскі драматычны тэатр імя І. Мележа парадаваў сваіх гледачоў чарговай прэм'ерай: на сцэне ажылі героі апошняй аповесці народнага пісьменніка Васіля Быкава "Бліндаж".

П'есу паводле гэтага твора напісаў Васіль Ткачоў. У тым, што спектакль атрымаўся, заслуга рэжысёра-пастаноўшчыка Рамана Цыркіна, мастака-пастаноўшчыка Андрэя Дзюбака, музычнае афармленне — Вольгі Кашынскай.

У спектаклі "Бліндаж" заняты вядучыя акцёры тэатра Вольга Кашынская і Алена Пракопава (Серафімка), Міхаіл Кліменка (Хлебнікаў), Раман Цыркін (Хольц), Вадзім Дубраў (Дземідовіч), Юрый Шмак (Парфір), Ян Гарбачэўскі, Рыгор Даўцян і Яўген Кузьмянкоў (браты-паліцаі Піліпёнкі).

На прэм'еры прысутнічаў аўтар п'есы Васіль Ткачоў, які шчыра падзякаваў калектыву тэатра за тое, што ён, кажучы словамі самога Васіля Быкава, "паказаў праўду вайны без прыфарбоўвання, без лакіроўкі, — такой, якая яна ёсць".

Станіслаў СКІБА

На здымку: сцэна са спектакля — Р. Цыркін у ролі Хольца.

Сустрэчы

Вітае альманах «Вожык»

У Магілёўскай абласной бібліятэцы адбылася сустрэча з галоўным рэдактарам часопіса сатыры і гумару "Вожык" Юліяй Зарэцкай.

На сустрэчу завіталі члены Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі на чале з яго старшынёй У. Дуктавым.

Юлія Зарэцкая звярнула ўвагу на тое, што з II паўгоддзя 2009 года часопіс будзе выходзіць як альманах (два разы на год аб'ёмам 96 старонак), падзялілася творчымі планамі рэдакцыі. Бібліятэцы і гасцям сустрэчы Юлія Францаўна падарыла чарговы нумар часопіса і народную паэму "Тарас на Парнасе", выдадзеную ў бібліятэчцы часопіса "Вожык".

Размова пра гумарыстычнае выданне не абышлася без гумару. Свае невялічкія гумарыстычныя творы прачыталі В.Кунцэвіч і С.Украінка, цікава расказалі гісторыю свайго аўтарства ў часопісе І. Аношкін і В. Арцем'еў.

Вольга ЧУМАКОВА

Адпачынак з кнігай

У санаторыі "Сасновы бор", што за Радашковічамі, большасць адпачываючых летам — расіяне. Безумоўна, і кнігі, якія яны бяруць пачытаць у тамтэйшай бібліятэцы, — на рускай мове. Тым не менш, бібліятэкар Ларыса Пішчальнікава нават у такім выпадку рэкамендуе перакладныя творы беларускіх аўтараў: Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча, Івана Шамякіна, Янкі Брыля, Івана Мележа, Барыса Сачанкі, Івана Чыгрынава...

А каб далучыць гасцей да беларускага слова, Ларыса Феліксаўна перыядычна наладжвае сустрэчы з сучаснымі пісьменнікамі. Пра тое, што тыя тут нярэдкія госці, сведчыць бібліятэчны стэнд "Кнігі пісьменнікаў, якія наведалі санаторый". Сярод іх — Валянціна Куляшова, Змітрок Марозаў, Віталь Гарановіч, Наталля Касцючэнка, Міхась Пацёмкін, Леанід Левановіч, Анатоль Зэкаў.

Лізавета ШЫЛАЙ

Анонс

Праменьчыкі духоўнасці

Ствараецца новая турыстычная праграма "Беларусь праваслаўная". Гэты супольны праект Беларускай Праваслаўнай Царквы і кампаніі "Белорусский Спутник" мае на мэце духоўна-асветніцкую дзейнасць па прапагандзе нашай багатай культурна-рэлігійнай спадчыны.

Сама праграма будзе рэалізоўвацца ў два этапы. Па першым часе плануецца стварыць некалькі экскурсійна-асветніцкіх маршрутаў па горадзе Мінску і яго ваколіцах. Прадбачыцца наведванне Свята-Духава кафедральнага сабора, Свята-Елісавецінскага манастыра, Дома міласэрнасці, прыходу ў імя іконы Божай Маці "Усіх тужлівых Радасць", Петра-Паўлаўскага сабора, прыхода ў гонар Пакрова Прасвятой Багародзіцы.

На наступным этапе пералік экскурсійных маршрутаў будзе пашыраны і яны пройдуць па ўсёй Беларусі. Пры жаданні можна будзе завітаць у Лядзенскі Свята-Благавешчанскі мужчынскі манастыр, Дамашанскі Іаана-Багаслоўскі жаночы манастыр у Заслаўі, манастыр Блажэннай Ксеніі на беларускай зямлі ў вёсцы Барань Барысаўскага раёна, да святых крыніц у Ракаве, Лагойску, Крупцах.

Прапанаваныя вандроўкі будуць кардынальна адрознівацца ад тых, якія на сённяшні дзень прапануюць турыстычныя агенцтвы. Па-першае, яны будуць стварацца пры непасрэдным удзеле прадстаўнікоў царквы, і пры рэалізацыі такіх адмысловых "паломніцкіх" шляхоў арганізатары тураў будуць мець кансультацыі ў людзей уцаркаўлёных. Па-другое, плануецца непасрэдны ўдзел святароў, якія з веданнем справы змогуць распавесці пра наведваемыя храмы і дакладна патлумачыць сутнасць з'яў, адказаць на пытанні экскурсантаў.

Мінгарвыканкам пайшоў насустрач "Белорусскому Спутнику" і выдзеліў памяшканне пад офіс насупраць галоўнага праваслаўнага храма Беларусі — Свята-Духава кафедральнага сабора. Плануецца, што на адной з аглядных пляцовак каля яго і будуць пачынацца духоўныя экскурсіі. Першыя такія вандроўкі плануецца распачаць у жніўні, да канца 2009 завершыцца пракладванне праменьчыкаў-дарог да праваслаўных храмаў сталіцы, а цалкам рэалізацыя задуманага праекта магчымая да сярэдзіны наступнага года.

Ірына ТУЛУПАВА

Братэрства

Перакладчыцкае папаўненне

Традыцыі беларуска-літоўскага пабрацімства настолькі шырокія, што адзін толькі пералік перакладчыкаў беларускага мастацкага слова на літоўскую мову мог бы заняць ці не цэлы лімаўскі нумар. Тым болей, што няспыннай рака дружбы застаецца і зараз.

Нядаўнім госцем РВУ "Літаратура і Мастацтва", рэдакцый часопісаў "Маладосць" і "Нёман" разам з дзіцячым пісьменнікам Яронімасам Лауцюсам быў і журналіст з Вільнюса Вітаўтас Жэймантас. Спадар Яронімас, якога сёлета прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі, прывёз рукапіс сваёй вершаванай кнігі "Азбука бяспекі". Зараз пераклад яе на беларускую мову завяршыў паэт Віктар Гардзей. Спадзяёмся, што ў хуткім часе гэтая сімпатычная і патрэбная юнаму чытачу кніга пабачыць свет і ў Мінску.

А Вітаўтас Жэймантас, расказаўшы беларускім сябрам пра колішняе супрацоўніцтва літоўскіх газетчыкаў з мінскай "Звяздою", набраў з сабою ў Вільнюс стос часопісаў "Полымя", "Маладосць" і "Нёман". І як высветлілася, зусім не дарэмна. У штодзённай літоўскай газеце "Рэха Літвы" ў перакладах спадара Вітаўтаса ўжо пабачылі свет урыўкі з дзённікаў Георгія Марчука, лірычныя мініяцюры Лідзіі Арабей. Як высветлілася пазней, Жэймантас — яшчэ і аўтар нарыса пра віленскія сцежкі Максіма Гарэцкага.

— Цікавіць мяне і біяграфія Цёткі ў стасунках з Літвою, — расказаў у тэлефоннай размове з рэдакцыяй спадар Вітаўтас. — Збіраюся напісаць і пра сувязі іншых беларускіх пісьменнікаў з Вільняй, Вільнюсам. Сабраў шмат матэрыялаў пра адрасы Янкі Купалы ў нашым горадзе. І, канечне ж, чакаю ад вас часопісы, газету "Літаратура і мастацтва", каб перакладаць новыя старонкі з сучаснай беларускай прозы на літоўскую мову. Раблю гэта з аднолькавым задавальненнем і з рускіх, і з беларускіх тэкстаў. А яшчэ ведаю польскую мову... Між іншым, лічу, што трэба перакладаць і пісьменніцкую эсэістыку. Так склалася, што ў апошнія гады мы мала ведаем адзін пра аднаго. Эсэістыка, публіцыстыка якраз і маглі б зліквідаваць гэтую загану. Таму з задавальненнем прачытаў у беларускай літаратурна-мастацкай перыёдыцы тэксты Лідзіі Арабей, Георгія Марчука, Андрэя Федарэнкі, Леаніда Галубовіча, Уладзіміра Сцяпана.

Кастусь ЛЕШНІЦА

Набыткі

Маскоўская кінакампанія "М — Production" завяршыла вытворчасць 4-серыйнага тэлевізійнага мастацкага фільма "У агонь і ваду" па сцэнарыі беларускага кінадраматурга.

У 2009 годзе прэм'ера павінна адбыцца на адным з расійскіх тэлеканалаў. Рэжысёр-пастаноўшчык — Барыс Бірман. Аператар-пастаноўшчык — Аляксандр Нікольскі. Сярод артыстаў, занятых у галоўных ролях, — Міхаіл Парэчанкаў, Святлана Шчадрына, Сяргей Агафонаў, Антон Багроў. Пра што ж расказваецца ў гэтым фільме? На гэтае пытанне адказвае аўтар сцэнарыя са Слуцка:

— Між іншым, хацеў бы акрэсліць і такую дэталь, якая, верагодна, будзе цікавай маладым гледачам. У карціне здымаецца Майк Міраненка — нядаўні выпускнік "Фабрыкі зорак". Ён

Пра агонь і ваду

Алег Буркін — член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Афіцэр запасу. Прайшоў праз службу ў Афганістане. Аўтар некалькіх кніг паэзіі і прозы. Друкаваўся ў часопісах "Нёман", "Маладосць". Жыве ў Слуцку. У апошнія гады шмат і плённа працуе ў галіне кінадраматургіі.

паспеў пабываць на гастролях разам з Алай Пугачовай і зняць (упершыню ў гісторыі шоу-бізнесу!) кліп на Чырвонай плошчы ў Маскве. У міні-серыяле Майк іграе ролю папулярнага спевака, які дапамагае дзяўчыне з правінцыі дасягнуць вяршынь шоу-бізнесу. А што да зместу фільма, то ў карціне расказваецца пра трох сяброў, якія з дзяцінства мараць стаць афіцэрамі. Заканчваюць вучобу на пачатку 1990-х. Выпрабоўваюць на ўласнай скуры ўсе "выдаткі" перабудовачнага ці постперабудовачнага жыцця. І ўсе трое закаханы ў адну і тую ж дзяўчыну. Дзеля яе гатовы пайсці і ў агонь, і ў ваду. Таццяна спыняе свой выбар на адным — Барысе (акцёр Антон Багроў). Праходзіць час — і ў Чачні сустракаюцца ўсе трое маладых афіцэраў. Барыс пасля ранення памірае на руках у Аляксея (Сяргей Агафонаў). Але жыццё працягваецца. Цяпер за каханне Таццяны (яе іграе

Святлана Шчадрына) змагаюцца Аляксей і Уладзімір (Фёдар Лаўроў)...

Да месца будзе сказаць, што шэраг іншых кінасцэнарыяў Алега Буркіна таксама прыцягнуў увагу расійскіх кінарэжысёраў.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

З-пад пяра

У брэсцкім выдавецтве "Альтернатива" выйшла кніга Уладзіміра Сітухі "Возвышенно сердце стучит", прысвечаная герою Савецкага Саюза Васілю Марозаву.

Пачынаецца кніга з твора самога В. Марозава "Труд солдата", у якім ёсць і раздзел са шматзначнай назвай "Вечна абавязаны народу і Радзіме". Вершы У. Сітухі, нарысы аднапалчан, лісты, фатаграфіі, дакументы з сямейнага архіва, тэксты выступленняў В. Марозава асвятляюць яго жыццёвы шлях і грамадзянскую пазіцыю. Дарэчы, летась была адкрыта мемарыяльная дошка ў яго гонар. Варта нагадаць, што Васіль Фёдаравіч плённа працаваў на карысць радзімы і пасля службы ў войску: быў дэпутатам Вярхоўнага Савета дванаццатага склікання, больш як дзесяць гадоў узначальваў Брэсцкую абласную арганізацыю ветэранаў вайны і працы, узброеных сіл і праваахоўных органаў.

Аляксандр ЮДЗІЦКІ

Сваё 65-годдзе Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы сустракае ў новым чатырохпавярховым будынку. Для гэтага выкарыстана адрэстаўраванае і дабудаванае дагэтуль вольнае памяшканне трыкатажнай фабрыкі. Залы і кабінеты бібліятэчнай установы аснашчаны неабходным абсталяваннем і новай мэбляй. На ўрачыстасці з нагоды прыемнай падзеі супрацоўнікаў бібліятэкі-імянінніцы і яе чытачоў павіншавалі намеснік міністра культуры Беларусі Віктар Кураш, старшыня Лідскага райвыканкама Андрэй Худык і начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр Лойка.

Алесь ЖАЛКОЎСКІ

У сталіцы і шэрагу іншых населеных пунктах краіны адбыліся прэзентацыі кнігі баранавіцкага краязнаўцы Міхася Маліноўскага. "З берагоў Друці да ракі Мышанка". Аўтар — нястомны падарожнік. У выніку бясконцых вандровак і нараджаюцца яго кнігі і артыкулы ў часопісах і газетах.

Кніга мае шэсць сшыткаў, дзе ёсць прысвячэнні выдатнаму беларускаму кінарэжысёру, краязнаўцу і даследчыку Анатолю Шнэйдару з горада Талачына, згадваецца і адзін са старажытнейшых гарадоў Беларусі Друцк, на 1000-гадовым юбілеі якога прысутнічаў Міхась Маліноўскі. Акрамя таго, у кнізе — нарысы, прысвечаныя паэтам Анатолю Станкевічу і Венанцы Бутрыму, а таксама "галоўнай" рацэ Баранавіцкага раёна Мышанцы, дрэварыту Васіля Цяпінскага ў Крашыне. Выдрукаваны замалёўкі пра знішчаны горад Мыш, пра месца нараджэння Адама Міцкевіча, пра бацьку народнага паэта Пімена Панчанкі, які ў Першую сусветную вайну ваяваў пад Баранавічамі. У змястоўную кнігу ўключаны вершы Раісы Раманчук, якія яна прысвяціла Агінскаму каналу.

Людміла БЕЛАВЕЖСКАЯ

Ракурс

Мастацтва аўтсайдэраў

У галерэі "Лабірынты" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстава "Мастацтва аўтсайдэраў".

Больш за шэсцьдзесят твораў жывапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, выстаўленыя ў галерэі, знаёмяць з творчасцю дванаццаці аўтараў. Гэта не прафесійныя мастакі, а аматары, які займаюцца ў студыі выяўленчага мастацтва пры Мінскім псіханеўралагічным інтэрнаце № 2. А мастацтва для іх не толькі любімы занятак, але яшчэ і лячэнне.

— *Тэрапія мастацтвам з'яўляецца альтэрнатыўным відам працы з людзьмі, якія маюць пэўныя праблемы на фізічным і душэўным узроўнях*, — сказаў у прывітальным слове старшыня Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Анатоль Ражанец. — *Для іх выражэнне думак і пачуццяў праз словы ў размовах з тэрапеўтам з'яўляецца праблематычным.*

І ўсе свае перажыванні і радасці яны пераносяць на палатно. Гэта людзі не страчаныя для грамадства. На гэта звяртала ўвагу ў сваім выступленні і дырэктар установы Галіна Мазуркевіч. Тры гады таму яна паставіла за мэту стварыць умовы, каб насельнікі інтэрната пачувалі сябе як дома. У рамках рэалізацыі Беларуска-ірландскага праекта дапамогі інвалідам пад кіраўніцтвам Эда Цімаці Джордана былі створаны два цэнтры арт-тэрапіі. А калі дырэктар убачыла, што абстаноўка спрыяе рэалізацыі насельнікаў інтэрната ў мастацтве, вырашыла правесці выставу іх работ. У 2007 годзе яна запрасіла Фёдара Ястраба, каб ён прафесійным вокам ацаніў карціны. Тады, праўда, выбранай колькасці карцін не хапала для паўнавартаснай выставы. І рэалізацыю задумы адклалі на два гады.

Правесці выставу атрымалася дзякуючы дапамозе Пасольства В'етнама ў нашай краіне, Міжнароднаму жаночаму клубу, Беларуска-ірландскаму праекту дапамогі інвалідам.

Напрамак арт-брут ці аўтсайдэр-арт з'явілася ў Еўропе на рубяжы XIX і XX стагоддзяў. Тады некаторыя псіхіятры прызналі вартымі ўвагі мастацкія работы сваіх пацыентаў.

Выстава ў галерэі "Лабірынты" працягнецца да 28 жніўня. Затым яна будзе правезена па рэгіёнах краіны. А завершыцца праект паказам у Маскве ў Музеі аўтсайдэрскага мастацтва.

Дзмітрый БЕРАЖНЫ

На здымку: падчас паказу ўдзельнікамі тэатральнай студыі псіханеўралагічнага інтэрната №2 урыўка з тэатралізаванай пастаноўскі па матывах твора Леаніда Філатава "Сказ про Федота-стрельца, удалого молодца".

Фота аўтара

Прастора Хаіма Суціна

Імёны

Выставы гэтых вядомых нашых землякоў праходзяць па ўсім свеце, карціны прадаюцца на аўкцыёнах за немагчымыя грошы, французы ўпарта лічаць іх сваімі мастакамі, але кожны з іх мае пэўную прастору, тут, на Беларусі — Віцебск Юдаля Пэна і Лёзна Марка Шагала, пра якія беларусам прыйшла пара даведацца толькі ў пачатку 90-х, Гродна Льва Бакста і Гомель Міхаіла Кікоіна, а цяпер прыспеў час уключыць у нацыянальны кругагляд і мястэчка Смілавічы, што ў 35 кіламетрах ад Мінска, дзе прайшло дзяцінства сусветна вядомага мастака-экспрэсіяніста Хаіма Суціна.

Прынамсі, для гэтага сёння з'явіліся ўсе магчымасці — ужо прыкладна паўтара года ў мясцовым Доме дзіцячай творчасці дзейнічае экспазіцыя "Прастора Хаіма Суціна", створаны турыстычны маршрут пад назвай "Смілавіцкая мазаіка", а ў дадатак да яго выдавецтва "Чатыры чвэрці" сумесна з Нацыянальнай камісіяй па справах ЮНЕСКА выпусціла адмысловы буклет на беларускай, рускай, французскай і англійскай мовах, які змяшчае дастаткова падрабязныя карты і тэксты пра гістарычныя адметнасці Чэрвеньскага раёна і гарадскога пасёлка Смілавічы ў прыватнасці.

Мястэчка Смілавічы — сапраўдны куфэрак гісторый, легенд і шляхецкай спадчыны, пачынаючы са старажытнага палаца, які калісьці належаў роду Агінскіх, а пасля Манюшкам і Ваньковічам. Тут знаходзіцца і парк дрэваў-экзотаў, асобныя з якіх былі пасаджаныя Казімірам Манюшкам 200 гадоў таму.

Ёсць у Смілавічах праваслаўная царква Святога Георгія Перамаганосца — адна з дзвюх у Беларусі, дзе ў спецыяльныя дні з целаў хворых людзей выганяюць нячыстую сілу, таму тут збіраюцца паломнікі з усёй краіны. Як доказ поліэтнічнасці і шматкультурнасці мястэчка — з царквой у пасёлку суседнічае мячэць — адна з васьмі дзейсных у краіне. Турысты змогуць набыць выдатныя расшытыя валёнкі, падушкі і коўдры з авечай поўсці, зробленыя на лямца-валюшнай фабрыцы, якіх засталося толькі чатыры на ўсёй постсавецкай прасторы.

Шмат знакамітых людзей родам з гэтага пасёлка: да прыкладу, Ян Бараноўскі — вынаходнік аўтобуснага кампосцера, смілавіцкія карані мела Фаіна Ранеўская. І, канечне, Хаім Суцін. Экспазіцыя яго музея афармлена лаканічна і густоўна, яна створаная пры ўдзеле старшыні Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА Уладзіміра Шчаснага і Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. У двух залах падрабязна адлюстраваныя дзяцінства мастака ў беларускім мястэчку і французскі перыяд яго жыцця.

Саша ДОРСКАЯ

На здымку: старшыня Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА Уладзімір Шчасны і супрацоўніца Дома дзіцячай творчасці Святлана Хасіневіч падчас прэзентацыі турыстычнага маршрута і буклета.

Выставы

Агульная гісторыя

У Цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Максіма Багдановіча ў Маладзечне працуе выстава "Ад спрадвечных вытокаў..." На ёй выстаўлены 28 карцін мастака Эдуарда Мацюшонка.

Выстава праходзіць у рамках Дзён польскай культуры ў Маладзечне. І нездарма былі абраныя працы Э. Мацюшонка. На ягоных палотнах адлюстраваны нашы суайчыннікі і наша беларуская зямля, якая мае агульнае мінулае з польскай дзяржавай. Гэта партрэты Эмілії Плятэр, Язэпа Драздовіча, пейзажы. Мастак займаецца таксама рэканструкцыяй. Па старых фотаздымках ён узнаўляе на сваіх палотнах помнікі архітэктуры, якія сёння ўжо не існуюць. "Школа парфорснага палявання" ў Пастаўах, "Ганута. Гукі паланеза" — гэта беларуска-польская гісторыя. Але не трэба забываць, што "ўсе вытокі ад гэтай зямлі. Хоць Эмілія Плятэр была польскай шляхцянкай, а Язэп Драздовіч беларусам, яны абодва хадзілі па адной беларускай зямлі, толькі з розніцай у стагоддзе", — адзначае Эдуард Уладзіміравіч.

Выстава "Ад спрадвечных вытокаў..." будзе працаваць да сярэдзіны жніўня. Далей яе плануюць паказаць жыхарам Нясвіжа.

Сяргей МАКАРЭВІЧ

На здымку: карціна Э.Мацюшонка "Глыбокае".

Фота аўтара

Сярэдзіна лета і на дзіва цёплы сонечны дзень, пасля працяглых дажджоў, якія па праўдзе кажучы, ужо абрыдлі. Мы прыехалі ў Рось, што ля Ваўкавыска, дзе знаходзіцца раённы цэнтр рамёстваў.

Цэнтр яднання пакаленняў

— Мяне завуць Святлана Кудаш. Я — дырэктар, — прадставілася маладая жанчына і светла ўсміхнулася.

Начальнік раённага аддзела культуры Іван Маржала таксама заўсміхаўся, бо гаспадыня цэнтра знаходзіцца ў адпачынку, і меркавалася, што "экскурсія" пройдзе без яе, паколькі мой прыезд загадзя не планаваўся. Але Святлана на працоўным месцы.

Адчувалася, што дырэктар цэнтра не першы раз сустракае гасцей. З годнасцю паказвае "іканастас", дзе ўсю сцяну займаюць граматы, дыпломы, падзякі розных арганізацый, устаноў, мясцовага кіраўніцтва. Цэнтр, у якім 12 супрацоўнікаў, размешчаны ў добраўпарадкаваным цагляным будынку. Ёсць музей народнага побыту. Тут амаль штодзень праходзяць экскурсіі. Наведвальнікі з цікавасцю разглядаюць рэчы, якімі карысталіся нашы продкі: стогадовай даўніны чаравічкі на драўляных абцасіках, плеценыя кашы для каўбас, прылады для работы з ільном, кужэльнае палатно, вышыванкі, ходнікі, ручнікі, гарлачы, у якіх малако не пракісала некалькі дзён...

— Цэнтру нашаму ўжо дзесяць гадоў, — працягвае размову Святлана, — можна падводзіць і некаторыя вынікі. Мы ставім перад сабой і выконваем тры асноўныя задачы: вучым дзяцей традыцыйным народным рамёствам, супрацоўнічаем з народнымі ўмельцамі і праводзім даследчую работу па мадэліраванні адзення ў нашым рэгіёне. Неаднойчы выязджалі ў экспедыцыі ў розныя вёскі раёна, гутарылі са старажыламі. Дарэчы, толькі ў ваўкавыскіх жанчын былі спадніцы з "хвастамі", бо шыліся з пяці кліноў і шмат тканіны ішло на зборку ззаду, — такі фасон. Паколькі тканіна была цяжкая, то і спадніца абвісала. У музеі ёсць касцюмы як старадаўнія, так і сённяшняга часу, зробленыя сучаснымі майстрыхамі.

У раённым цэнтры рамёстваў працуе 12 гурткоў па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве: "Залатая саломка" (саломапляценне), "Беларусачка" і "Сонейка" (аплікацыі з саломкі), "Пісанка" (роспіс яек гарачым воскам), "Бабулін куфэрак" (вязанне шыдэлкам і прутkамі), "Спадчына" (роспіс па тканіне), "Чараўніца" (работа са скурай) "Ткацтва", "Выцінанка" ды іншыя. У гуртках займаецца больш 80 дзяцей. Заняткі праходзяць у спецыяльна абсталяваных творчых майстэрнях на платнай аснове.

Керамі́ка. У творчай майстэрні па гліне (майстар Святлана Дудзінская) займаюцца тры ўзроставыя групы: "Умелыя ручкі" (старшая), "Цудоўная гліна" (малодшая), "Дударыкі" (сярэдняя). Аказваецца, для работы нельга выкарыстоўваць звычайную мясцовую гліну, вырабы з яе не будуць якаснымі. Таму яе ачышчаюць ад розных прымесей да такога стану, што трапіўшы ў рукі ўмельцаў, гліна пачынае падпарадкоўвацца кожнаму руху і юных, і больш сталых майстроў. Паколькі ў звычайных умовах зрабіць ачыстку складана, на дапамогу цэнтру прыйшоў Ваўкавыскі завод керамічных вырабаў. Там разумеюць, што гэта вельмі патрэбная справа і ідуць насустрач, бо магчыма, сённяшнія выхаванцы цэнтра прыйдуць працаваць на іх прадпрыемства.

Прафесіяналы ж растуць на вачах: да прыкладу, выпускнікі цэнтра Віктар Карповіч і Вольга Мацкевіч сёння — ужо навучэнцы Мірскага мастацкага прафтэхвучылішча.

На занятках гурткоўцы атрымліваюць не толькі практычныя навыкі. Яны знаёмяцца з культурай і гісторыяй краю і рамёстваў, тэхнікай вырабаў з гліны як у Беларусі, так і ў іншых краінах.

Саломапляценне. Гэты від рамяства дзеці асвойваюць з задавальненнем. Яны шмат ведаюць пра гісторыю саломапляцення, пра асаблівасці работы з залатой сонечнай раслінкай. Таму і вырабы з цягам часу ўпрыгожваюць кватэры гурткоўцаў. Па павер'і, калі чалавек з дрэннымі думкамі трапляе ў кватэру і становіцца пад саламяным павучком, то дзіўны выраб забірае ў сябе ўсё дрэннае, з чым прыйшоў чалавек у хату, не дазваляе крыўдзіць гаспадароў. Таму павучкоў пастаянна абнаўлялі ў вясковых хатах, як правіла, не менш двух разоў на год: на Вялікдзень і Каляды.

Ткацтва. Першае, на што звяртаеш увагу, прыходзячы ў цэнтр рамёстваў, — гэта кросны. Яны вялікія, але кросны маёй бабулі Надзі былі намнога большымі, бо займалі ўвесь прыбудаваны трысцен.

І вось з такім майстэрствам я сутыкнулася ў Ваўкавыскім цэнтры. Яна Июльская, кіраўнік гуртка, паказала нам палавічок даўжынёй у адзінаццаць метраў, які выткалі дзеці. Зараз гэты экспанат займае пачэснае месца ў музеі. Вучылі ж майстэрству ткацтва дарослых і дзяцей, перадавалі свой вопыт у так званых майстар-класах вядомыя ў раёне ткачыхі Любоў Балён і Ганна Кулеш. Дарэчы, у раёне дастаткова народных умельцаў, майстар-класы праводзяцца імі і ў астатніх гуртках: Анатоль Зубанаў (разьба па дрэве), Валянціна Волкава (роспіс па бяросце), Ірына Страхава (вышыўка), Уладзімір Шэўчык, Аляксандр Прасняк і Станіслаў Кузьмар (жывапіс), Алена Маркоўская (вязанне кручком) і іншыя. Разам з моладдзю яны ўдзельнічаюць у шматлікіх выставах, адзначаюцца дыпломамі.

Сёлета раённы цэнтр рамёстваў прыняў удзел у другім рэспубліканскім фестывалі-кірмашы традыцыйнага мастацтва "Вясновы букет" у Мінску, дзе быў узнагароджаны дыпломам Міністэрства культуры ды Беларускага саюза майстроў і атрымаў грашовую прэмію. Майстар-метадыст Ірына Пекар летась удзельнічала ў конкурсе вышыўкі і карункапляцення "Чароўная нітка" на Міжнародным фестывалі мастацтва "Славянскі базар у Віцебску" і таксама вярнулася з узнагародай. Было шмат іншых мерапрыемстваў, у якіх прымалі ўдзел майстры з Ваўкавышчыны.

Ваўкавыскі раённы цэнтр рамёстваў развіваецца. Побач з, так бы мовіць, жаночымі відамі народных рамёстваў больш дасканала вывучаюцца зараз і мужчынскія: кавальская справа, пчалярства, садаводства.

Валянціна СМАНЦАР

На здымках: за ткацкім станком — Яна Іюльская; майстры цэнтра ў какошніках свайго вырабу з Іванам Маржала.

Фота аўтара

Здатнаму роду — няма зводу

З даўніх часоў наша зямля славілася сваімі выдатнымі майстрамі — вынаходнікамі, друкарамі, гравёрамі... Гэта і полацкі ювелір Лазар Богша, стваральнік напрастольнага крыжа Еўфрасінні Полацкай, і старажытны мсціслаўскі майстар Сцяпан Палубес, які ўпрыгожваў маскоўскія палацы і храмы, усім вядомы імёны нашых друкароў і гравёраў Пятра Мсціслаўца, Францыска Скарыны, Івана Фёдарава, які паходзіць з нашай зямлі. Выдатныя майстры існуюць і ў наш час. У г. Дзяржынску, на адной з ціхіх і зялёных вуліц жыве звычайная, а ў нечым і незвычайная сям'я. У гаспадара дома Андрэя Міхайлавіча Мартынюка, Майстра з вялікай літары, незвычайнае хобі: ён наш айчынны Кулібін — майстар па вырабе гадзіннікаў, і Страдзівары — майстар па вырабе скрыпак. Яго жонка — Маргарыта Станіславаўна, ці проста Маргарыта, выдатная скрыпачка, любіць паўнавартаснае жыццё, напоўненае музыкай, любіць і выхоўвае сыноў — Аляксандра і Арцёма.

З далёкіх дзіцячых гадоў нарадзілася ў Майстра задума стварыць уласны гадзіннік. Некалі бацька падарыў яму дыяфільм аб выдатным рускім вынаходніку, майстры арыгінальных гадзіннікаў Іване Кулібіне. З таго ўсё і пачалося... Сваю мару і задуму Майстар пачаў ажыццяўляць, калі пабудаваў для сям'і па ўласным праекце і сваімі рукамі невялікі двухпавярховы катэдж. На пачатку ён скончыў курсы гадзіннікавых майстроў. Навучанне, пошукі і крапатлівая праца прынеслі Майстру першы поспех: ён стварыў драўляны, без адзінай металічнай дэталі, насценны гадзіннік. Сярод іншых, пазней зробленых унікальных гадзіннікаў, якія вісяць побач, ён адрозніваецца крыху большымі памерамі і, як заўважыў Андрэй, не такі дасканалы, як пазней зробленыя. Але яго ён любіць больш за ўсіх, бо гэты — яго першынец. Драўляныя гадзіннікі — сапраўдныя творы мастацтва, якія маглі б упрыгожыць не толькі офіс ці прыватнае жыллё, але і стаць экспанатамі буйных музеяў нашай і замежных краін. Майстар — стваральнік серыі арыгінальных насценных гадзіннікаў пад агульнай назвай "Краіны і кантыненты". У калекцыі ёсць, напрыклад, гадзіннік пад назвай "Беларусь", упрыгожаны нацыянальным арнаментам, гадзіннік на кітайскую тэматыку з кітайскай стылістыкай і вершамі вядомых кітайскіх паэтаў, выкананых іерогліфамі на вісячай гірцы, гадзіннікі "Расія", "Рым"... А ў настольным гадзінніку нават спружына і тая драўляная, зробленая з бамбука. Дакладнасць ходу гэтых цуда-гадзіннікаў даволі высокая — усяго плюс-мінус адна хвіліна за месяц. Некаторыя з гадзіннікаў Андрэя Мартынюка ўжо адлічваюць час у Польшчы, Славеніі, ва Украіне, Маскве, Санкт-Пецярбургу. Таленавітымі рукамі Майстра выкананы і цалкам драўляны грамафон, музычны інструмент, пад музыку якога некалі танчылі нашыя паважаныя бабулькі і дзядулькі. У пакоі гаспадароў маю ўвагу прыцягнула незвычайная мэбля, упрыгожаная рознымі дзівоснымі фігуркамі і па-мастацку выкананымі ілюстрацыямі да твораў айчынных і замежных пісьменнікаў. Усё гэта — таксама плён працы Андрэя.

Свой першы музычны інструмент — гітару — Майстар зрабіў для старэйшага сына Аляксандра, які вучыўся ў музычнай школе (зараз ён студэнт Мінскага музычнага вучылішча імя М. Глінкі). Першая гітара не вельмі ўдалася, затое пазнейшыя — на належным узроўні. А скрыпку ён вырашыў зрабіць для Маргарыты, якая ўжо каля трыццаці гадоў працуе выкладчыцай па скрыпцы ў Дзяржынскай дзіцячай школе мастацтваў. Хоць і не з першага разу, але скрыпка атрымалася вартай увагі. У створаным тры гады таму музычным ансамблі "Пілігрымы", дзе музычным кіраўніком з'яўляецца Маргарыта, усе музычныя інструменты — электрагітары і электраскрыпкі зроблены рукамі А. Мартынюка. У складзе ансамбля ўдзельнічаюць таксама сыны Аляксандр і малодшы Арцём. Сам жа ён у ансамблі выконвае функцыі гукааператара. Дарэчы, калонкі і гукаўзмацняльнікі зроблены таксама яго рукамі.

Бацькі Майстра, па прафесіі сувязісты, у маладосці працавалі ў Казахстане на асваенні цалінных земляў.

Дзед Майстра ў час Вялікай Айчыннай вайны загінуў пад Сталінградам, бабулю за сувязь з партызанамі расстралялі гітлераўцы. А вось прадзед яго пражыў доўгае жыццё — 102 гады, ад яго застаўся на добры ўспамін старадаўні абраз.

Мяркую, увагу чытачоў газеты прыцягне і радавод Маргарыты. Яе прадзед па бацькоўскай лініі, Іосіф Мадзалеўскі, быў вельмі адукаваным, меў выдатны музыкальны слых, іграў на многіх музычных інструментах. Да таго ж ён мог вырабляць скрыпкі, цымбалы і нават фісгармоніі. Гэтага адоранага маладога чалавека ў пачатку XX стагоддзя выпісаў да сябе з Варшавы граф Юрый (Ежы Чапскі), малодшы сын вядомага калекцыянера, нумізмата Эмерыка фон Гутэн Чапскага. Тут, у Койданаве (Дзяржынску) граф ажаніў Іосіфа і прызначыў яго капельмайстрам (рэгентам) у Койданаўскі касцёл Святой Ганны. Весці службу ў касцёле дапамагала яму яго дачка, бабуля Маргарыты, Веранікa, якая, як і бацька, магла іграць на многіх інструментах, і вучыла спевам малых прыхаджан — хлопчыкаў і дзяўчынак. У 30-я гады прадзед быў рэпрэсіраваны і высланы на будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага канала, рэабілітаваны ў 1989 годзе. Бацька Маргарыты быў добрым спеваком і гітарыстам. З маленства на ўсё жыццё ёй запомніліся ў яго выкананні рамансы, песні Высоцкага, Акуджавы, Візбара... Маргарыта скончыла Мінскі дзяржаўны інстытут (зараз універсітэт) культуры. У час нашай размовы яна сказала, што і за абедзенны стол сям'я садзіцца пад гукі музыкі Вівальдзі, Моцарта. Старэйшы сын Аляксандр марыць пайсці па слядах маці — стаць музыкантам, а малодшы, Арцём, поруч з захапленнем музыкай, вялікую цікавасць праяўляе і да майстэрства бацькі. Не парываецца сувязь пакаленняў: як кажуць "Здатнаму роду — няма зводу". Гэтая выдатная сям'я Мартынюкоў з Дзяржынска, жыве па сваіх уласных гадзінніках, сваёй працай, сваімі адносінамі адзін да другога ўпрыгожвае не толькі сваё жыццё.

Лявон ЦЕЛЕШ
г.Дзяржынск
Фота аўтара

Пісьменнікі Беларусі імкнуцца заявіць пра сябе і знайсці сваю прастору і ў сучаснай расійскай літаратуры, доказам таму — шматлікія ўзнагароды ў выглядзе ганаровых дыпломаў і прэмій імя рускіх класікаў, якія апошнім часам усё часцей прывозяць беларускія пераможцы. З самых апошніх літаратурных дасягненняў — Усерасійская літаратурная Прэмія імя Ф.І.Цютчава, лаўрэатам якой нядаўна стала паэтэса Тамара Краснова-Гусачэнка, і другая ўзнагарода на Міжнародным конкурсе літаратурнага перакладу "Пушкін у Брытаніі", што прывёз з Лондана паэт Юрый Сапажкоў. Наш карэспандэнт пагутарыла з пераможцамі.

За прэміяй на радзіму

Уручэнне Прэміі імя Ф. І. Цютчава праходзіла ў роднай сядзібе паэта ў сяле Аўстуг на Браншчыне. Тут, на маляўнічым беразе ракі, сярод цяністых паркавых алей і класічнай высакароднай архітэктуры цютчаўскага дома, штогод адбываецца Усерасійскае свята паэзіі. Сёлета віцебская паэтэса Тамара Краснова-Гусачэнка прыехала сюды ў якасці лаўрэата — падчас мерапрыемства ёй уручылі дыплом, а таксама залаты медаль імя Ф. І. Цютчава і Памятны знак "Залатое пяро", уладальнікі якога атрымалі права распісацца ў ганаровай кнізе Цютчаўскага музея.

Вылучыць сваю кандыдатуру на атрыманне Прэміі імя Ф. І. Цютчава Тамару Краснову-Гусачэнку падштурхнулі калегі з бранскай пісьменніцкай арганізацыі. На разгляд шматузроўневай камісіі, якая адбірала намінантаў, прапаноўваўся яе двухтомнік "Спас", што выйшаў у мінулым, юбілейным для паэтэсы, годзе. Але, як кажа сама лаўрэат, прэміяй былі адзначаныя найперш цесныя сяброўскія кантакты з бранскімі літаратарамі:

— *Існуюць моцныя сувязі паміж віцебскай пісьменніцкай арганізацыяй, старшынёй якой я з'яўляюся, і бранскай. На Браншчыне ўвогуле праходзяць чатыры літаратурныя конкурсы. Кожны год я прывожу туды многіх паэтаў з Беларусі, дапамагаю ім там надрукавацца. У прыватнасці, у свой час дапамагла апублікаваць у Расіі вершы такіх паэтаў, як Юрый Сапажкоў, Анатоль Аўруцін, Міхась Пазнякоў, у маіх перакладах выходзілі вершы Барыса Бележэнкі, Вольгі Русілкі ды іншых.*

Разам з Тамарай Красновай-Гусачэнкай сёлета прэмію атрымалі яшчэ тры дзеячы культуры — драматург і пісьменнік з Санкт-Пецярбурга Ігар Залатускі, заслужаны мастак Расіі Яўген Антонаў і майстар жывапісу з Браншчыны Васіль Лаворка.

Прэмія імя Ф. І. Цютчава заснаваная Саюзам пісьменнікаў Расіі, Бранскай абласной Думай, Адміністрацыяй Бранскай вобласці і Міжнародным пушкінскім фондам "Класіка". Яе ўручаюць кожныя два гады, і яна з'яўляецца дастаткова прэстыжнай на постсавецкай прасторы. У розны час прэмію атрымлівалі такія расійскія пісьменнікі, як літаратуразнаўца і гісторык Вадзім Кожанаў, паэты Станіслаў Куняеў і Уладзімір Кастроў ды многія іншыя, аўтар з Беларусі атрымлівае ўзнагароду ўпершыню. Ад самой цырымоніі ў Тамары Красновай-Гусачэнкі засталіся яркія ўражанні:

— *Гэта грандыёзнае, пампезнае і ўрачыстае свята, на якім прысутнічалі прадстаўнікі ўсіх постсавецкіх краін. Сядзіба мае антураж XIX стагоддзя, на балконах і тэрасах гасцей сустракаюць скрыпачкі ў блакітных бальных сукенках, танцоры кружацца ў вальсе, і куды ні пойдзеш — паўсюль можна знайсці прыгожы камерны куток. На галоўнай пляцоўцы ўвесь вечар выступалі паэты, і каля іх не было пустых месцаў, нават калі побач ішлі гулянні. Спачатку выступілі літаратары аднаго расійскага саюза пісьменнікаў, пасля — другога...*

Сяброўства з бранскім пісьменніцкім саюзам усталявалася ў паэтэсы дзякуючы яе рускім караням, пра якія яна і распавядае:

— *Я нарадзілася ў Бранскай вобласці, у вёсцы Шчапяціна, якая цяпер закінутая і занядбаная. Некалькі гадоў шукала яе, туды немагчыма пад'ехаць — атрымалася толькі з трэцяй спробы. З намі быў мясцовы жыхар, які правёў нас праз гушчар, па бездарожжы, там ужо лапухі растуць таўшчынёй з руку, хаты — парослыя ракітай. Сваю хату я адразу не пазнала — пасля маёй сям'і ў ёй жыло некалькі гаспадароў, яна перабудоўвалася шмат разоў. Але знайшла яе па яблыках, якія назбіраў наш праваднік, у іх быў смак з майго дзяцінства. Гэта было жудаснае адчуванне, я адлюстравала свае перажыванні ў вершы "Я поеду, поеду домой этим летом...".*

У скарбонцы Тамары Красновай-Гусачэнкі ўжо ёсць Міжнародная літаратурная прэмія імя Сімяона Полацкага, але сёлетняя ўзнагарода, па яе вызначэнні, "іншага ўзроўню", бо яна дзяржаўная. На пытанне, ці прызнаюць рускамоўных аўтараў з іншых постсавецкіх краёў у Расіі, ці трэба імкнуцца адольваць расійскія конкурсы, паэтэса адказала:

— *Пішу на рускай мове. Прыехала ў Беларусь, калі была зусім яшчэ маладой дзяўчынай, мой муж быў вайсковец. Тут я пражыла ўсё сваё жыццё, нарадзіла дзяцей. Я заўсёды кажу: я беларуская пісьменніца. Я вельмі люблю беларускую мову, магу размаўляць па-беларуску, раблю пераклады. Але ў мяне не атрымліваецца на ёй так чыста выказваць свае думкі ў паэзіі, як на рускай. Не сказаць, што з-за сваёй рускамоўнасці як паэтэса пачуваю сябе ў Беларусі ніякавата. Што ж да Расіі, то мяне некалькі разоў вылучалі на Прэмію імя Ф. І. Цютчава... І ўсё ж атрымалася, відаць, іх сапраўды зачараваў мой двухтомнік "Спас". Да слова, вылучэнне літаратурных твораў на рознага кшталту прэміі — надзвычай адказная справа. Вельмі важна асцерагацца тут літаратурнай некарэктнасці. Скажам, рускамоўных і беларускамоўных пісьменнікаў трэба адзначаць не па прыналежнасці да мовы, а толькі па таленце, па глыбіні, па духоўнасці іхніх твораў. Я не прызнаю эпатаж у літаратуры. Некаторыя літаратары ўдарыліся ў постмадэрнізм, абсалютна не маючы паняцця, што гэта такое. Яшчэ не прымаю такую забойную, кусачую крытыку, якая зрэдзь часу з'ўляецца. Любога паэта ўвогуле нельга крытыкаваць. Паэт — гэта надзвычай ранімая істота. Калі вам не падабаецца яго творчасць, не кажыце пра яго нічога, і ён сам перастане пісаць, калі заўважыць, што пра яго маўчаць. А лепш пісаць пра добрае, знаходзіць вытанчанае, падкрэсліваць удалае, узвышаць прыгожае — так мы хутчэй выразцім добрую культуру.*

Аляксанра ХАЛОПІК

«Сапажкоў прагрымеў на ўвесь Лондан»

Паэт Юрый Сапажкоў дагэтуль не асабліва захапляўся перакладамі — толькі зрэдчас, калі знікала натхненне для ўласных вершаў, браўся перакладаць паэзію англійскіх класікаў, каб атрымаць творчы імпульс. Але цяпер, магчыма, літаратар больш засяродзіць увагу на гэтай творчай дзялянцы. Бо вазіў ён ажно ў Лондан на Міжнародны турнір літаратурнага перакладу "Пушкін у Брытаніі" свае перакладчыцкія набыткі, дзе атрымаў другую ўзнагароду.



Аб'яву пра конкурс ён знайшоў у "Литературной газете". Для ўдзелу трэба было прадставіць каля дзесятка перакладаў вершаў брытанскіх паэтаў. Юрый Сапажкоў адаслаў некалькі назапашаных перакладаў любімых англійскіх аўтараў — Тэда Хьюза, Нормана Маккаіга і Олдаса Хакслі. Да таго ж, усім удзельнікам прапаноўвалася перакласці санет У. Шэкспіра з паэмы "К различным музыкальным нотам":

— *Гэты твор пра пастушка, які ўгаворвае сваю каханую жыць з ім і любіць яго. Ён так і пачынаецца: "Live with me and be my love", але нават гэты радок, як пасля высветлілася, усе пераклалі па-рознаму.*

Праца над санетам заняла ў Юрыя Сапажкова каля двух тыдняў, і вось ён у ліку пятнаццаці фіналістаў быў запрошаны ў Лондан. Сем гадоў запар тут праводзіцца паэтычны конкурс для рускамоўных літаратараў, а сёлета ўпершыню паралельна з ім прайшоў і перакладчыцкі турнір. Арганізатарамі яго выступілі расійскі фонд "Русский мир", пасольствы Расіі і Вялікабрытаніі, а ідэйным натхняльнікам стаў рускі паэт, што жыве ў Лондане, Алег Барушка. Адразу ўдзельнікаў чакаў падарунак — зборнік перакладаў усіх фіналістаў.

— *Я ўзяў дазволы ўсіх аўтараў, і цяпер гэта мой рэдакцыйны партфель для часопіса "Нёман", дзе мы будзем аднаўляць "Всемирную литературу" асобным блокам, акрамя таго, плануецца яшчэ і альманах, таму, спадзяюся, гэтыя падборкі перакладаў пабачаць свет у Беларусі.*

Удалося Юрыю Сапажкову завязаць сувязі для будучага супрацоўніцтва і з некаторымі членамі журы, якое, па яго словах, было вельмі строгім. У судзейскую камісію ўваходзілі дырэктар Бібліятэкі замежнай літаратуры Кацярына Геніева, першы сакратар Саюза пісьменнікаў Масквы Яўген Сідараў, пісьменнік Міхаіл Папоў, пісьменнік і першы рускі біёграф У. Набокава Барыс Носік, які прыехаў на конкурс з Францыі, галоўны рэдактар часопіса «Иностранная литература» Аляксандр Ліверган, галоўны рэдактар часопіса "Москва" Сяргей Сяргееў ды іншыя.

Канцэпцыя турніра "Пушкін у Брытаніі" лучыць рускія і англійскія літаратурныя традыцыі — прымеркаваны конкурс да дня нараджэння А. Пушкіна, але не застаецца без увагі і У.Шэкспір, творчасць якога, дарэчы, Пушкін вельмі любіў, хоць і слаба ведаў англійскую мову.

— *Былы пасол Вялікабрытаніі ў Расіі сэр Энтані Брэнтан зрабіў цікавую заўвагу: "Перасанажы лепшых трагедый Шэкспіра — рускія, бо яны вельмі моцныя па сваім запале, па градусе духоўнага напружання".*

На турнір сабраліся рускамоўныя паэты з розных краін свету — ЗША, Партугаліі, Германіі, Ізраіля, Вялікабрытаніі — гэта было нешта кшталту перакладчыцкага злёту рускіх эмігрантаў. З Расіі быў толькі адзін прадстаўнік — томскі паэт Андрэй Арлеар, менавіта ён і стаў каралём турніра, абышоўшы беларускага ўдзельніка Юрыя Сапажкова. Трэцяе месца дасталося перакладчыцы з ЗША Алене Рэзнік.

— *Андрэй Арлеар, у адрозненне ад мяне, усё сваё жыццё аддаў перакладам. Дзякуючы яму, нават англамоўныя вершы Бродскага загучалі па-руску. Канечне, ён заслужыў быць першым.*

Само спаборніцтва праходзіла ў вялікім касцёле, сярод гледачоў прысутнічала шмат англічан, якія не разумелі рускай мовы, але ўлоўлівалі энергетыку паэтаў, манеру чытання, якая, без сумнення, грала вялікую ролю і ў размеркаванні ацэнак.

За сем бясконца паэтычных дзён у Лондане Юрый Сапажкоў спазнаў і чапурыстую элітарнасць традыцыйных англійскіх паэтычных клубаў:

— *Мы чыталі вершы ў старэйшым клубе, які калісьці наведвалі Ч. Дыкенс, У. Такірэй і многія іншыя англійскія класікі. У гэтага дома, што знаходзіцца побач з вуліцай Пікадзілі, нават няма адраса — лічыцца, што ўсе павінны яго ведаць. Аказалася, што будынак займае цэлы квартал — гэта сапраўды цудоўнае відовішча. Сюды проста немагчыма прыйсці непадрыхтаваным — трэба быць элегантным, падцягнутым, у адпрасаваным касцюме з матылём, гэта цэлы рытуал.*

Запомнілася паэту і вандроўка па Тэмзе:

— *Мы плылі па рацэ, чыталі вершы ў салоне цеплахода, і адзін паэт раптам пажартаваў: "Сапажкоў прагрымеў на ўвесь Лондан!". Аказалася, што нашыя галасы гучалі ў дынаміках на палубе, паэзія бегла па хвалях, па берагах, па лонданскіх вуліцах...*

Саша ДОРСКАЯ

Фота Кастуся Дробава

Каменціраванне шэдэўра, або Загадкі «Запісак Самсона Самасуя» А. Мрыя

Сёлета спаўняецца 80 гадоў з часу напісання і апублікавання адзінага ў беларускай літаратуры сатырычнага рамана. Нягледзячы на пільную ўвагу даследчыкаў і вялікую колькасць навуковых прац, прысвечаных разгляду твора, дагэтуль многія яго эпізоды застаюцца загадкавымі, малазразумелымі нават для прафесійнага чытача-філолага. Шмат што праясніў бы рэальны каментарый да твора, але грунтоўна ніхто з даследчыкаў ім не займаўся. Урэшце, да гэтага часу няма і навуковага выдання твораў пісьменніка, дзе такому каменціраванню знайшлося б месца.

Магчымасць растлумачыць "цёмныя месцы" рамана з дапамогай яго аўтара даўно і беззваротна страчана, у далёкім мінулым засталіся і закранутыя пісьменнікам рэаліі 1920-х. Неспрыяльным фактарам з'яўляецца таксама доўгі перыяд "забыцця" гэтага шэдэўра. Па ўсім відаць, многія таямніцы "Запісак..." так ніколі і не будуць расшыфраваны, але навуковае каменціраванне гэтага твора, як, зрэшты, і ўсёй спадчыны А. Мрыя, безумоўна, павінна мець месца. Вельмі важна, што і сам пісьменнік выказаў падобнае жаданне: у вядомым лісце да Сталіна ён прапануе да дробязей вывучыць свае творы ("дасканала, па костачках разабраць"), каб пераканацца, што нічога шкоднага ў іх няма.

Сёння адзіны шлях да раскрыцця таямніц рамана — вывучэнне "бібліятэкі" Мрыя, гэта значыць твораў, якія аказалі ўплыў на фарміраванне свядомасці пісьменніка, а таксама і сучаснай літаратуры, прысвечанай таму складанаму гістарычнаму перыяду. З кнігамі другой групы праблем няма: цяпер увазе чытача прапануюцца ўспаміны былых палітвязняў і іх аналітычныя працы з праўдзівым адлюстраваннем падзей савецкай гісторыі (яшчэ ў канцы 1980-х пачалі свабодна выдавацца творы А. Салжаніцына, В. Шаламава і інш.), сведчанні і даследаванні вядомых рэлігійных дзеячаў, святароў, царкоўных гісторыкаў (М. Ардава, У. Сцяпанава (Русака) і інш.). А вось вызначыць кнігі з "бібліятэкі" А. Мрыя вельмі складана. Дапамагчы ў гэтым могуць хіба што захаваныя С. Грахоўскім і Я. Лецкам успаміны яго родных і дэталёвае, скрупулёзнае вывучэнне тэкстаў твораў пісьменніка.

Ва ўспамінах родных Андрэй Шашалевіч паўстае як высокаадукаваны і начытаны чалавек: ён ведаў некалькі моў, быў абазнаны ў еўрапейскай літаратуры. Згадваецца таксама яго семінарская адукацыя (інфармацыя пацвярджаецца і зместам яго мастацкіх і навуковых прац.)

Увогуле, семінарскім выхаваннем і рэлігійнай адукацыяй у творчасці пісьменніка шмат што абумоўлена. Гэта ўзятая ім у спадчыну і ўласцівая яшчэ студэнтам Сярэднявечча смехавая культура з імкненнем да парадзіравання, а таксама глыбокая дасведчанасць у антычнай і раннехрысціянскай літаратуры і гісторыі, у іканаграфіі.

Пісьменнік сам падказвае даследчыку правільны шлях, называючы малавядомыя імёны, знаёмячы з загадкавымі вобразамі. Пэўнае святло на некаторыя тэмы "Запісак..." праліваюць такі твор царкоўнай літаратуры, як мартырый "Пакуты святых Хадоры і Дыдыма", што па прычыне свайго неардынарнага зместу даўно заваяваў у асяроддзі семінарыстаў вялікую папулярнасць. Відавочна, ён не пакінуў абыякавым і будучага сатырыка: даказвае гэта той факт, што імя пакутніцы некалькі разоў згадваецца на старонках рамана.

Некалькі разоў у "Запісках..." згадваецца і яшчэ адзін "святы", Лында ці Лындзій, які, праўда, нічога агульнага са святасцю не мае. Гэта выдуманы ў асяроддзі шкаляроў яшчэ ў эпоху Сярэднявечча апякун ляноты, той самы "найпадобнейшы гультай" і "святы абібок". У рамане распрацаваны нават яго іканаграфічны вобраз: Лында, намаляваны на адным з абразоў, падобны да зялёнай рапухі. А вось у апісанні мошчаў "святога" ўражвае паступовая дэманізацыя вобраза: спачатку адлюстраваны з зялёнай скурай, ён урэшце "набывае" і нечалавечую нагу з прыкарэлай звярынай поўсцю. Гэта прыкмета, уласцівая таксама замежнаму кансультанту з першых рэдакцый рамана М. Булгакава "Майстар і Маргарыта" (у таго замест ступні быў капыт), недвухсэнсоўна ўказвае на сатанінскую сутнасць яго носьбіта. На цікавыя разважанні наводзіць таксама і амаль адначасовае з'яўленне гэтых вобразаў у сусветнай літаратуры.

Дзякуючы рэлігійным алюзіям, якія шчодра рассыпаны ў рамане, больш глыбока можна зразумець і ступень самалюбавання галоўнага героя. Чаго варта толькі згадка пра "шасцікрылых і шасціногіх херувімаў і сарахвімаў", якіх ён некалі паіў сваёй чырвонай кроўю! У такім параўнанні паразітаў з асабліва набліжанымі да Бога анёламі (яўрэйскія kᵉrubīm, ахоўнікі, заступнікі, і śᵉrāphīm, вогненныя, палымяныя) адчуваецца не проста ўказанне на празмерную, гратэскавую "самасць" героя, але на вышэйшую ступень яе — бачанне сябе як цэнтру сусвету.

Уплыў класічнай адукацыі аўтара відавочны таксама ў згадках пра вядомых асоб старажытнасці, сярод якіх і славуты Пір, што здолеў перамагчы рымскія войскі коштам велізарных страт, і ўладальніца Егіпта Клеапатра, і заваёўнік Навухаданосар, пазбаўлены Богам розуму. Адчуваецца гэтае ўздзеянне і ў зашыфроўцы крылатых лацінскіх выслоўяў. Напрыклад, у выразе "як мамоны глухія" (мамон — бруха, чэрава, як сімвал сытасці) праглядаецца паралель з лацінскім выслоўем "Satur venter non studet libĭnter" ("Сытае бруха да навукі глуха"). Праўда, А. Мрый укладае ў сваё параўнанне іншы, супрацьлеглы сэнс: словы Самасуя не могуць зразумець і зусім не сытыя сяляне. А вось прапанаваны героем лозунг "Праз карняплоды да сацыялізму" — увогуле відавочнае парадзіраванне лацінскай прымаўкі "Per aspera ad astra" ("Праз церні да зорак"). Калі параўнаць змест выслоўяў, атрымаецца, што карняплоды — неабходная перашкода (!) на шляху да сацыялізму.

Падчас аналізу тэксту рамана становіцца зразумела, што твор сапраўды прадуманы да дробязей. Увогуле ж, уменне заўважыць шкодную тэндэнцыю на самым пачатку яе існавання і адлюстраваць заганную з'яву не з дапамогай разгорнутага апісання, а шляхам тонкіх намёкаў і іранізавання — тыповая рыса стылю А. Мрыя.

У "Запісках..." аўтар прымушае чытача глыбей задумацца над рэаліямі 1920-х гадоў. Але ніякай іншай з'яве не адводзіцца ў рамане столькі месца, колькі пагрозе калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

З першых радкоў твора пачынаецца высвятленне сутнасці паняцця "кулак". Гэта ўжо далёка не злосны вясковы аферыст XIX стагоддзя, нават не проста "спажывец" наёмнай працы. Напрыканцы 1920-х афіцыйная савецкая прэса распаўсюджвае паняцце на ўсіх заможных сялян, якія ўпарта трымаюцца старога ладу жыцця і не вітаюць стварэння калгасаў. Нездарма гаворыць настаўнік Цыба, што "пытанне аб прыналежнасці да гэтага заалагічнага тыпу вырашаецца часта не лікам кароў ці коней, а настроем і эксплуататарскай чыннасцю". Пагроза ў бок працавітых гаспадароў адчуваецца і ў згадцы гуртка па вывучэнні пастаноў XV з'езда, на якім быў абвешчаны курс на калектывізацыю. А вось рэалізацыя пагрозы адбываецца ў другой частцы твора, калі Самасуй дае камсамольцам параду "выкурыць" кулака з яго ўласнага дома, каб зрабіць там клуб. Уражвае лёгкасць, з якой быў аддадзены, а пасля і выкананы загад. І, нягледзячы на шчаслівы зыход гэтага высялення, прыгадваецца, што ўжо ў 1929—1932 гадах у СССР цэлыя сем'і вывозіліся ў Сібір ці на поўнач Расіі. Паводле дадзеных І. Кузняцова, толькі з Беларусі за гэтыя гады было выслана звыш ста тысяч гаспадароў. А вось А. Салжаніцын назваў агульную па СССР лічбу ахвяр "мужыцкай чумы" — каля пятнаццаці мільёнаў (улічваючы сем'і) скалечаных ці знішчаных жыццяў.

У сувязі з гэтымі дадзенымі па-іншаму чытаецца і глава "Трагладыт". Назва паходзіць ад грэчаскага слова trōglodytēs — пячорны чалавек. Паходжанне гэтай часткі рамана загадкавае: справа ў тым, што нельга з упэўненасцю сказаць, ці была сапраўды адшукана падобная першабытная гаспадарка, ці гэтак паказана неразуменне галоўным героем "уцёку ад цывілізацыі" пэўнай сям'і. На карысць апошняга гавораць як нежаданне трагладытаў ісці на кантакт з Самасуем, так і спрэчкі адносна багацця іх мовы, калі выяўляецца, што толькі пры павярхоўным вывучэнні лексічны склад яе ледзь не ў тры разы багацейшы, чым гэта здавалася на першы погляд. Уцёкі ад "сатанінскай" улады былі распаўсюджаны ў Расійскай дзяржаве яшчэ з часоў царкоўнай рэформы патрыярха Нікана (1653), мноства падобных выпадкаў было ў часы Пятра I, новая хваля пачалася і пасля рэвалюцыі...

Паступова, зыходзячы з сутнасці сварак Самасуя і сялян, чытач пачынае разумець, у якім пекле аказаліся сапраўдныя праціўнікі: бязглуздая моладзь пляжыць іх палі; замест рэальнай дапамогі і землеўпарадкавання іх кормяць пустымі прамовамі, душаць падаткамі, а яшчэ прапануюць "нацыяналізаваць усіх свіней БССР".

Вельмі асцярожна пачынае гучаць яшчэ адна хвалюючая тэма — тэма супрацьстаяння ўлады і рэлігіі, а дакладней, тэма падаўлення духоўнай свабоды чалавека, злёгку акрэсленая ў апавяданні "Рабін".

Паведамляючы пра збіранне экспанатаў для будучага музея, Самасуй адзначае, як "гвалтам вырваў з кіпцюроў фанатыкаў-прэлатаў" Баркалабаўскага кляштара мошчы святога Лындзія. Герой называе праваслаўных манахаў прэлатамі (ад познелацінскага praelatus — тытула высокапастаўленых духоўных асоб каталіцкай і некаторых пратэстанцкіх цэркваў) у сувязі з іх незвычайна моцным жаданнем абараніць святыню. Паводле інфармацыі афіцыйнай савецкай прэсы, толькі ў канцы 1921—пачатку 1922 гадоў здарылася 1414 крывавых эксцэсаў, звязаных з адабраннем царкоўных каштоўнасцей.

Зацятая барацьба з рэлігіяй вялася таксама ў ідэалагічным кірунку. З мэтай выцяснення ці замены царкоўных абрадаў ствараліся адпаведныя камуністычныя, парадзіраваліся найбольш вядомыя рэлігійныя спевы: узгадаем, як героі рамана даручылі музыку напісаць "цырыманіял чырвоных хрэсьбін, вяселля і хаўтур". Адзначыў пісьменнік і з'яўленне рэлігійных таварыстваў, што пачалі арганізоўвацца з 1918 года па закліку царкоўных уладаў і паступова сталі своеасаблівымі цэнтрамі супрацьстаяння вернікаў атэістычнай прапагандзе, духоўнаму прыгнёту з боку дзяржавы.

У рамане таварыства "Божыя дзеці" праводзіць дыспут, на якім упэўнена перамагае прадстаўнікоў новай ідэалогіі. Тут трэба адзначыць, што ў 1920-я дыспуты былі асабліва папулярным сродкам духоўнай барацьбы, але з-за поспехаў царкоўнікаў іх колькасць хутка скарацілася, і да 1929 года яны сталі рэдкасцю. Справа ў тым, што ў дыялогу "на роўных" прамоўца-атэіст часта выяўляў недастатковую падрыхтаванасць і абазнанасць у літаратуры, гісторыі, філасофіі, ды і слухач меў магчымасць ацэньваць пачутае з пазіцый асабістага вопыту і ведаў, чым адразу ж выкрываў адарванасць прадстаўніка афіцыйнай ідэалогіі ад канкрэтнага жыцця, яго пустаслоўе і непраўдзівасць.

Яшчэ больш асцярожна аўтар падводзіць чытача да самай складанай тэмы — тэмы рэпрэсій.

Апісваючы паляванне-аблаву на беспрытульных сабак мястэчка, герой як бы між іншым адзначае, што многія з іх "нічога агульнага не мелі з беспрытульнасцю і загінулі за сваю салідарнасць". Магчыма, гэты факт і не ўразіў бы так моцна, калі б не сведчанне Салжаніцына пра барацьбу савецкай улады з хатнімі сабакамі: "Их брали на учёт, свозили на живодёрню, а чаще особыми командами от местных советов застреливали каждую встречную. И на то были не санитарные и не скупостные экономические соображения, основания глубже: ведь собака не слушает радио, не читает газет, это как бы не контролируемый государственный гражданин, и физически сильный, но сила идёт не для государства, а для защиты хозяина как личности, независимо от того, какое состоится о нём постановление в местном совете и с каким ордером к нему придут ночью". Цяпер чытач можа і сам адказаць на пытанні, чаму ў мястэчку былі дакладныя статыстычныя дадзеныя пра колькасць сабак (нават беспрытульных) і чаму ў выніку сярод забітых апынулася шмат свойскіх жывёлін. Яшчэ больш пераконвае ў тым, што "паляванне" не было выключна санітарнай мерай, адно новаўвядзенне герояў, якія "на кожнай хаце надпіс прымацавалі: хто жыве, калі нарадзіўся, якое сацыяльнае паходжанне". Трэба нагадаць таксама і тое, з якой лёгкасцю, забіўшы Мілэдзі, Самасуй накіроўвае стрэльбу ў яе гаспадара Ліна, які выбег ратаваць жывёліну.

З аднаго боку, зразумела, чаму ў Самасуя такое стаўленне да Ліна: бухгалтар з'яўляецца яго паспяховым канкурэнтам у сардэчных справах. Але зусім ужо недарэчнай можна лічыць прапанову галоўнага героя выслаць Крэйну, аб'ект яго кахання, на Салаўкі.

Параўнанне дзяўчыны з шэкспіраўскай Афеліяй, якая папсавалася ў розуме, тут невыпадковае: на думку Самасуя, Крэйна, адхіляючы яго кандыдатуру, можа лічыцца псіхічна хворай. Прапанова дацкага прынца сваёй каханай пайсці ў манастыр пераламляецца Самасуем таксама тыпова па-савецку: ён заклікае ўлады выслаць Крэйну ў выпраўленча-працоўны лагер.

Увогуле ж, успамін пра Салаўкі — паказчык пэўнай грамадзянскай мужнасці пісьменніка. Гэтая тэма перастала быць папулярнай ужо ў 1927 годзе, калі быў закрыты лагерны гумарыстычны часопіс, некалі такі запатрабаваны (у 1926 годзе падпіска на яго праводзілася па ўсёй савецкай краіне). З канца дзесяцігоддзя факт існавання ў СССР лагераў пачаў замоўчвацца.

Не засталіся па-за ўвагай пісьменніка і іншыя шкодныя тэндэнцыі развіцця грамадства. Гэта і ўзмацненне цэнзуры, і прафанацыя навукі, і пагоня за гігантызмам... Не было не заўважана таксама беларускае пытанне: чаго вартыя разважанні пра стан беларусізацыі школ і прыхаванае супастаўленне адміністрацыйных і этнаграфічных межаў БССР.

Вядома, не ўсе загадкі рамана магчыма разгадаць. Відаць, так і застанецца без тлумачэнняў згадка пані Більдзюкевічыхі (нехта Більдзюкевіч быў супрацоўнікам Інбелкульта, і ў гэтай сувязі прозвішча пані магло мець для сучаснікаў пісьменніка нейкі больш істотны, з камічным адценнем, сэнс). Хутчэй за ўсё, мы ніколі не дазнаемся, хто ж паслужыў прататыпам волата Яўтуха Абжэры (а таксама аднаго з герояў апавядання "«Цар Максіміліян» у вёсцы"). І па якой прычыне названыя Самасуем у якасці сваёй уласнасці 300000 акраў чарназёму роўныя па плошчы Краснапольскаму раёну? І чаму п'есу "Каханне пад прымусам" напісала піянерка? І ў якім рамане герой цалаваў гераіню, гаворачы пры гэтым, што ўсё астатняе дасць ёй яе жаніх? Пералік "цёмных месцаў" твора можна працягваць і яшчэ. Нязменным застаецца толькі тое, што ў гісторыі нацыянальнай літаратуры ёсць таленавіты пісьменнік-сатырык і ёсць шэдэўр, варты далейшага вывучэння і, урэшце, навуковага каменціравання.

Зацятая барацьба з рэлігіяй вялася таксама ў ідэалагічным кірунку. З мэтай выцяснення ці замены царкоўных абрадаў ствараліся адпаведныя камуністычныя, парадзіраваліся найбольш вядомыя рэлігійныя спевы: узгадаем, як героі рамана даручылі музыку напісаць "цырыманіял чырвоных хрэсьбін, вяселля і хаўтур". Адзначыў пісьменнік і з'яўленне рэлігійных таварыстваў, што пачалі арганізоўвацца з 1918 года па закліку царкоўных уладаў і паступова сталі своеасаблівымі цэнтрамі супрацьстаяння вернікаў атэістычнай прапагандзе, духоўнаму прыгнёту з боку дзяржавы.

Валерый НАЗАРАЎ,
малодшы навуковы супрацоўнік аддзела выданняў і тэксталогіі Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі

Выпраменьванне любові

У 60-я гады мінулага стагоддзя, калі паэзія была на піку папулярнасці, калі ў многіх гарадах Савецкага Саюза паэты збіралі вялізныя залы і шматтысячныя стадыёны слухачоў, што будуць рабіць пазней эстрадныя зоркі, нарадзіўся і стаў крылатым выраз: "Что-то физики в почете, что-то лирики в загоне". Парадокс (ці прадбачанне?) выказвання Барыса Слуцкага? Адчуванне перспектывы?

Паэзія А. Дамброўскага ўласціва скіравана на пазітыў: светлыня і дабро, чуласць і спагадлівасць, узаемападтрымка і самаахвярнасць. Ён прынцыпова не жадае корпацца ў брудным і нізкім, не хаваецца ад злога, нахабнага, жорсткага, але не дазваляе яму разгарнуцца і гаспадарыць у сваіх вершах.

Многія сённяшнія аўтары напаўняюцца радасцю з водсмакам ніякаватасці, калі за ўласныя грошы альбо сродкі спонсараў (што здараецца надта рэдка) атрымліваюць кніжачку сваіх вершаў, выдадзеную тыражом у 50—100 экземпляраў. Сярод такіх шчасліўцаў — і Аляксандр Дамброўскі, які нарадзіўся ў вёсцы Хімы Рагачоўскага раёна ў сям'і настаўнікаў у самай сярэдзіне XX ст. Закончыў фізічны факультэт Гомельскага універсітэта, працаваў інжынерам і выкладчыкам, быў вайскоўцам. Пісаць вершы пачаў яшчэ школьнікам. Актыўна друкаваўся ў студэнцкай шматтыражцы, у газетах "Камунар", "Сельмашевец", "Гомельская праўда", у калектыўных зборніках "Дзень паэзіі", "Універсітэт літаратурны", "Западная Двина", літаратурна-мастацкім альманаху "Гоман". Па выніках усебеларускага літаратурнага конкурсу 2006 года заняў другое месца ў намінацыі "паэзія" (прыз "Сярэбранае пяро").

Усе зборнікі А. Дамброўскага (а іх на сённяшні дзень чатыры) убачылі свет у розных выдавецтвах у Мінску: "Полесские мотивы" (2007), "Поэзия любви", "Пуля" (2008) і "Задумчивый вечер" (2009). Сур'ёзна ставячыся да такой падзеі, як з'яўленне першай кніжкі, вершатворца не спяшаўся імчацца з рукапісам да выдаўцоў. Адсюль — і дэбют у такім сталым узросце, калі словы нетаропка ўзважаны душой.

Паэзія А Дамброўскага ўласціва скіравана на пазітыў: светлыня і дабро, чуласць і спагадлівасць, узаемападтрымка і самаахвярнасць. Ён прынцыпова не жадае корпацца ў брудным і нізкім, не хаваецца ад злога, нахабнага, жорсткага, але не дазваляе яму разгарнуцца і гаспадарыць у сваіх вершах. Шмат перажыўшы і спазнаўшы, творца часта адштурхоўваецца ад глыбокіх, па-філасофску ёмістых выказванняў выдатных майстроў слова — Ж. Санд, М. Прышвіна, А. Ахматавай, М. Цвятаевай, Д. Мадзіні, Р. Эмерсона, трымаючыся свайго правіла: "Отбросить всё, что мелкое в судьбе".

Невыпадкова радкі пра любоў — вызначальная дамінанта зборнікаў. Адзін з іх мае назву "Поэзия любви". Падзяляючы прызнанне К. Цілье "быць любімым — гэта болей, чым быць багатым, таму што быць любімым — значыць быць шчаслівым", А. Дамброўскі імкнецца па-свойму асэнсаваць стан закаханасці ў вершах "Свеча", "Звенит вино", "Последний роман", "У моря", "Ночь любви". Лірычны герой прымае любоў, як найвышэйшы дарунак лёсу. Для яго каханая — песня, пяшчота сонца. Разважаючы пра ўласнае жыццё, паэт імператыўна заяўляе: "Где Любовь — там и центр Земли!".

Славячы імгненні і дні, асвечаныя каханнем, лірычны герой і ростань успрымае не як безвыходнасць і нудзьгу, а як яшчэ адну прыступку "лесвіцы ў неба".

Не ўсе, аднак, вершы гэтай тэматыкі падаюцца пераканаўчымі ў мастацкіх адносінах. Асобныя з іх трапілі ў палон расцягнутасці, неабавязковага шматслоўя, дыдактычнасці ("Что говорить!", "В минуты высшего блаженства", "Не ревнуй к прошлому", "Вам я сердце свое отдаю", "Как жаль!"). Узорам альбомнай "красивости", банальнага апісальніцтва выглядаюць падобныя сентэнцыі:

Что говорить,
я в глаза голубые смотрел!
Шел разговор,
любовался с волненьем.
Свет красоты оживил
мое сердце, согрел.
Стал для меня
вдохновения чудным
явленьем.

Імкненне да ўзвышанага выяўлення пачуццяў часам абарочваецца трывіяльным наборам штампаў: "О Прекрасная Женщина", "Чувством прекрасного жизнь осветив, // Счастьем любви опустилась на плечи...", "В минуты высшего блаженства // Моя душа тобой полна..."

Асобная, балючая тэма ў творчасці аўтара — памяць пра родных яму людзей, якія дачасна пайшлі з жыцця. Бацьку скасіла франтавая куля не на вайне, а ўжо ў мірны час:

Лишь потом,
когда понял причину
(Он ведь пулю у сердца носил!),
Видел я, как большого мужчину
Тот металл
все косил и косил...

Згадваецца бураўкінскае: "Тыя кулі, што калісь заселі ў целе, даляцелі ўсё ж да сэрца, даляцелі..." Поруч з вершам "Пуля" з аднайменнага зборніка стаіць невыпадкова верш "А у убийцы нет лица" — у ім той жа роздум пра жыццё і смерць:

Грамм девять —
пуля из свинца.
И нет отца!
А пуля все летит-летит
через поля, через луга —
Все ищет нового врага...
И нет ее пути конца!
Грамм девять —
пуля из свинца.
В какой войне,
В тебе ль, во мне
Замедлится полет свинца?
...А у убийцы нет лица...

Кранаюць шчодрасцю сардэчнай самаадданчы і вершы пра маці. Іх у аўтара не вельмі многа, але ўсе яны запамінаюцца, выклікаюць суперажыванне.

Сустракаючы на вуліцы пасівелую жанчыну, паэта нібы працінае ток: "мама жива!"; ён прагне цуду, які, на вялікі жаль, немагчымы, бо маці ўжо ніколі не вернеш адтуль, адкуль яшчэ ніхто не вяртаўся. І горача, і разам з тым па-мужчынску стрымана гучаць фінальныя радкі верша "Увидел женщину":

Но горечь — рекою!
Из сердца выйдет ли?
Слезы уже потекли из глаз...
Хорошо — один.
Хорошо — не видели.
Закурю —
и выдержу на этот раз.

У адной са сваіх апошніх кніг "Сума немагчымасцяў" (2009) Алесь Разанаў разважае: "Мастацтва не мае свайго абсягу, яно рассяроджана ва ўсёй рэчаіснасці. Вобразы і тэмы аточваюць мастака, як вірусы".

Адной з вядучых тэм у зборніках А. Дамброўскага выступае наша беларуская прырода — сціплая, своеасаблівая, неадноўчы зраненая прагрэсам.

Аўтар піша на рускай мове, але ў яго вершах адчуваецца крэўная сувязь з Беларуссю, з яе гісторыяй, з яе абсягамі, краявідамі. Шчырасць і адкрытасць паэта вызначаюць ягонае вершаванае слова — зразумелае, даходлівае, немудрагелістае "Родным", "Истоки", "Полесские мотивы", "Слово". Хаця не ўсе вершы гэтай тэматыкі сталі фактам мастацкім. Асобныя з іх перанасычаны прамалінейным пералікам дэталяў без вобразна-выяўленчай палітры ("Лучик", "Окна"), перагружаны расцягнутасцю апісання ("Мое время"), іншым, болей лаканічным, не стае паэтычнай энергіі — рытмічнага дынамізму і метафарычнасці ("Воздух Родины", "Мудрая щедрость").

Іншым разам аўтару не ўдаецца пераадолець прыцягненне класікі — і ўзнікаюць запазычанні накшталт: "Готов я небо над деревнею, // Березкам ноги целовать!" Тут Сяргей Ясенін — навідавоку, у поўны рост.

У лірычных радках рускамоўнага аўтара нярэдка сустракаюцца не толькі тапанімічныя адзнакі палескага рэгіёна, але і лексічныя адзінкі, уласцівыя беларускай мове — і "жывой", размоўна-бытавой, і літаратурнай. Вершы А. Дамброўскага прасякнуты любоўю да роднай зямлі, насычаны галасамі і колерамі дарагога з маленства краю — непаўторнага ў сваёй адметнай, някідкай маляўнічасці Палесся. Для лепшых строф і радкоў аўтара ўласціва сцішаная спавядальнасць. Прызнанні, у якіх гарманічна яднаюцца шчырасць, паўната пачуццяў і паўната мастацкая, дадаюць свету новыя колеры і адценні, новыя мелодыі.

Гэта не так ужо і мала, калі ў радках рэльефна відна асоба, чалавек з выразна выяўленымі адносінамі да зямнога быцця, да ўсяго, што "дзеецца на свеце" (Ф. Багушэвіч). А пралікі і хібы на творчым шляху — засцерагальныя знакі-сігналы, што не даюць права на заспакоенасць і млявае сузіральніцтва. Вучыцца заўсёды ёсць чаму і ў каго: і ў папярэднікаў, і ў сучаснікаў.

Віктар ЯРАЦ

Тысяча гадоў пісьменства

Сярод шырокай публікі распаўсюджана думка, што ў філалогіі адкрыццяў быць не можа, што, маўляў, працы даследчыкаў у гэтай гуманітарнай сферы — перапеў даўно старога і ўсім вядомага. Але неяк неўзаметку на нашых вачах выросла пакаленне, якое зрабіла, пасля пэўнага дагматызму савецкай навукі, сапраўдны прарыў у шмат якіх галінах філалагічных ведаў. Да гэтага пакалення належыць і Алена Галубіцкая-Яскевіч — яркі і глыбокі даследчык, лаўрэат прэміі "За духоўнае адраджэнне", доктар філалагічных навук, аўтар дзесятка кніг па беларускай медыявістыцы. Яе новая кніга "Духоўная і філалагічная культура старабеларускай кніжнасці" (Частка 1) выйшла на беларускай мове ў Санкт-Пецярбургу і адразу прыцягнула ўвагу спецыялістаў не толькі Беларусі, але і Расіі. Алена Аляксандраўна вядомая і ў іншых славянскіх краінах — Украіне, Балгарыі, Сербіі, бо дыяпазон яе навуковых пошукаў надзвычай шырокі і закранае самыя розныя рэгіёны, аснову культуры якіх складае праваслаўная рэлігія.

Кніга ахоплівае амаль тысячагадовы перыяд развіцця беларускага пісьменства — да сёння такіх абагульняючых прац па медыявістыцы створана не было. Алена Аляксандраўна кіравалася пры гэтым надзвычай высакароднай задачай — даць народу адчуванне свайго быцця, занатаванага ў слове, у творах пісьменства. Прычым быцця, на думку даследчыцы, пазначанага пасіянарнасцю беларускага этнасу. Ужо адно гэта павінна зацікавіць дапытлівага чытача — якімі былі некалі беларусы (безумоўна, у асобах лепшых сваіх прадстаўнікоў). І міжволі нараджаюцца пытанні — ці засталіся іх рысы ў нас, людзей XXI стагоддзя? Як выкарыстаць найбагацейшую нацыянальную спадчыну на карысць развіцця беларускай культуры?

У раздзеле "Скразная рэцэпцыя хрысціянскай асветы. Архетыповая лінія айчыннага Адраджэння" А. Яскевіч заяўленую ў назве тэму раскрывае праз постаці першых святых і асветнікаў на беларускіх землях. Не абыходзіць яна праблему візантыйска-паўднёваславянскага ўплыву на нашых першых кніжнікаў.

Мы даведваемся, што носьбіт грэка-афонскага ўплыву на славянскіх землях у XI стагоддзі прападобны Афанасій Пячэрскі, які разам з Феадосіям лічыцца заснавальнікам манашаства на тэрыторыі ўсходніх славян, паходзіў, па лініі маці, з Гомельскага Палесся.

Пра непасрэднае перайманне традыцый хрысціянскай асветы ад візантыйскіх асветнікаў святых Кірылы і Мефодзія сведчаць кантакты святой Еўфрасінні Полацкай з перамнікамі салунскіх братоў — святымі Навумам і Кліментам Ахрыдскімі.

Шмат увагі надае Алена Яскевіч дзеячам горада Турава. Звесткі, прыведзеныя ёю, будуць цікавыя для самага шырокага чытача. Так, адным з першых прыняў святое хрышчэнне ад князя Уладзіміра Святаслававіча напаўлегендарны князь Тур, у гонар якога ў Кіеве нават захавалася царква. Аднаго з вучняў Тура — Дзіянісія Тураўскага — забілі язычнікі ў селішчы Міхнавічы, што паміж Туравам і Мазыром. Прыводзіць аўтар кнігі і малавядомыя звесткі з жыцця святога Кірылы Тураўскага.

Жыццё і дзейнасць першых хрысціянскіх вернікаў яшчэ і яшчэ раз нагадвае пра драматычны перыяд адыходу ў нябыт язычніцкай культуры і ўсталяванне хрысціянства на беларускіх землях.

У працы праводзіцца навацарская думка, што "сама ідэя Адраджэння вызначылася ў Візантыі і славянскіх краінах у XII стагоддзі (значна раней за Італію) як рэстаўрацыя спрадвечных мадэляў духоўнай і моўнай дасканаласці, кананічнай чысціні веравызнання". А. Яскевіч сцвярджае законы, якія злучаюць эстэтыку з этыкай і рэлігіяй. Крок за крокам, услед за аўтарам, мы пазнаем "звёны пераемнасці" і этапы старабеларускай духоўнай асветы, знаёмімся з традыцыямі старабеларускай біблеістыкі, перакладчыкамі і даследчыкамі Святога Пісання. Мы спазнаем вяршынныя дасягненні айчыннай філалогіі, станаўленне розных жанраў літаратуры і красамоўства. Гэтаму прысвечаны другі, трэці, чацвёрты раздзелы даследавання.

Што яшчэ звяртае тут на сябе ўвагу? Перш за ўсё, настойлівае імкненне паказаць каласальны рост, агромністую духоўную творчасць беларускіх кніжнікаў, якая мала заўважалася цэлымі пакаленнямі адукаваных нашчадкаў. Пры гэтым уводзіцца корпус зусім новых ці малавядомых, ці ўжо напаўзабытых звестак пра выдатных дзеячаў беларускай культуры. Скажам, пра Францыска Скарыну. Аўтар кнігі не толькі высвятляе шматлікія традыцыі перакладу і экзэгезы, якіх трымаўся Ф. Скарына у сваім перакладзе Бібліі, але яна аналізуе і ролю першадрукара як тэкстолага, этымолага, паказвае яго як вытанчанага красамоўцу, "новага Златавуста ў пакаленнях беларускіх кніжнікаў".

А. Яскевіч падрабязна гаворыць пра культурныя цэнтры, дзе працягвалі традыцыі Ф. Скарыны, у прыватнасці пра Супрасльскую Лаўру, якая ў сярэдзіне XVI стагоддзя займала вядучыя пазіцыі сярод праваслаўных манастыроў Вялікага княства Літоўскага, а таксама з'яўлялася цэнтрам рэлігійна-культурнага жыцця Кіеўскай мітраполіі.

Дастаткова падрабязна А. Галубіцкая-Яскевіч гаворыць пра самы яркі вынік дзейнасці заблудаўска-супрасльскага інтэлектуальнага цэнтра — выданне ў маёнтку князя Канстанціна Канстанцінавіча Астрожскага поўнай кананічнай царкоўнаславянскай Бібліі (бо Біблія Ф. Скарыны не была кананічнай). Характэрна, што менавіта на землях ВКЛ была "здзейснена асноўная тэксталагічная, перакладчая, рэдактарская, выдавецкая праца па стварэнні кананічнага тэксту — славянскай Бібліі — друкаванай Астрожскай Бібліі 1580—1581 гг., паводле канчатковай рэдакцыі якой — Елізавецінскай Бібліі — на працягу многіх стагоддзяў спраўляецца царкоўная служба ва ўсіх славянаправаслаўных аўтакефаліях".

Гэтай найвялікшай з'яве ў славянскім пісьменстве папярэднічалі пэўныя падзеі, пра якія падрабязна распавядае аўтар. Шмат увагі аддадзена дзейнасці Канстанціна Астрожскага, першага пасля караля ў іерархіі свецкіх феадалаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай, прыводзіцца нават яго радавод. Даследчыца спыняецца і на тых кніжніках, якія ўдасканальвалі астрожскі пераклад — у прыватнасці, філолагах Кіева-Магілянскай акадэміі на чале з Епіфаніем Славінецкім.

Марыя ШАМЯКІНА

Казімір КАМЕЙША

Кляновы ўспамін

Яго няма.
Але быў ён калісь.
Стаяў гэты дом.
Так і памяць даводзіць.
У галубіным памёце карніз,
Стаптаны парог
да гасцінца выводзіць.
Туліўся дом той пры трох клянах,
Як храм пушчанскі пры трох званах.
Хто не спыняўся ў цяністым двары,
Каб скінуцца ў карты,
Падужацца з квартай.
Заскочыць анучнік, бывала, стары,
З куфэркам іголак,
і шпілек,
і жартаў.
То Рубін-пчаляр,
то ляснік з Лубяня,
То партызан налібоцкі Соза...
Ім ночы мала і мала дня,
Яны пад кляны паўцякалі з марозу.
Як жар, расчырвоньвае твары жарт,
Ад жару таго, гасцей набярэцца.
Марозным вечарам
сам Банапарт
Заходзіў сюды гарбатай пагрэцца.
Цяжэе шпулька,
Гудзе калаўрот,
І ніткай адной прадзецца гамонка.
П'яніць кляновік, цягучы, як мёд,
І з бульбай саганчык сапе на ўслонку.
Як добра схавацца з нагоды такой,
Пакуль там дурэюць,
Дымяць і балусяць,
І ціха на печы
спакуснай рукой
Гарсэцік тугі
расшпіліць папрадусе!
— А сэрцайка, дзе ж яно?
— Недзечка там...
А ў шклянцы, што выпіта, —
толькі мута ўся.
— Усё табе, Рэнечка, сёння аддам...
— А я не... аддамся!
Загадкавы скрып і прытомлены ўздых,
І гул калаўрота распеўны...
А мне сем гадкоў, і сакрэтаў маіх
Да старасці хопіць, напэўна.
А старасць далёка, за пушчай была.
Яна толькі потым
здалёку прыблудзіць
І колькі б ты, пташка,
мне год не дала,
А лепшых, як тыя, не будзе.
Зноў дзень мой паменшаў
яшчэ на аршын,
Мой шлях размывае паводка.
Таму і салодкі мне гэты ўспамін,
Што гэты кляновік салодкі.

* * *

На сподку жалезным антэны
Падносіць мне новы наш век
Такія займальныя сцэны,
Падобныя часам на здзек.

А свет той грыміць перунамі,
Кіпіць, як у печы гаршчок.
І нас там саміх распранаюць,
І нашых гвалтуюць дачок.

І порах,
і кроў там,
і слёзы,
Як сны самай страшнай вайны.
Такія жукі і стракозы
Там таньчаць у танцы адным.

А маці з-за печы гарачай
Прамовіць, зірнуўшы ў акно:
— Каб бацька падняўся, пабачыў,
Якое тут круцяць кіно...

А бацька за вёскай, на грудзе,
Спакой свой адвечны знайшоў.
І як яго Памяць не будзіць,
Яго не разбудзіш ужо.

* * *

Ужо нішто не вернецца,
Чаго было з вяршком.
У ціхай хаце вербачка
Смяецца каташком.
Зімую я ці летую,
Твой шчэбет ловіць слых.
Даўно я неба гэтае
Дзялю на два крылы.

З глытком вясны,
з цяплінкаю,
З мядком на варажбе.
Мне ўсё, што ёсць,
з хмурынкаю,
А светлае — табе!

Мой дзень табой нядзеліцца,
Твой боль і мне баліць.
А тое, что не дзеліцца,
Навошта нам дзяліць?!

У парку Чэлюскінцаў

Лагодзіць сэрца ціш нязвычная
У ліставеі залатой.
Суседні, з Сада батанічнага,
Сюды заглядвае лісток.

Ліне часамі дожджык спорненькі
Да і засне на тым лісце,
І вецер сам бязмётлым дворнікам
Усе алеі падмяце.

Так дзень і сыдзе з перазовамі
Ды з перамігамі расы.
Прапіска ёсць,
і не часовая,
У гэтай сонечнай красы.

Студэнтачка, дзіця правінцыі,
Цябе я згледзеў за вярсту.
Галінкі, у зіму правіслыя.
Ужо і ў снах тваіх растуць.

Сядзіш на лаўцы, пад ялінаю.
Сініцу кормячы з рукі.
Хвіліна тае за хвілінаю
У гулкім моры гарадскім.

Цячэ з мабільніка мелодыя,
І ты за ёй кудысь ляціш.
І ўсё ж над векам,
смуткам,
модаю
Нябесная ўдарыць ціш!

* * *

— Савэрка, мілы мой,
прачніся! —
Спрасоння нехта прашаптаў.
Нібыта ў нейкай даўняй кнізе
Я гэта сёння прачытаў.

А мы на той Савэркаў хутар
Хадзілі ў ягады з табой.
Там часу дым усё ахутаў,
Буяе жоўты зверабой.

Там космы дзікага гароху
Агорклі ў сховах палыну.
І камень там, парослы мохам,
Як чэрап прадзеда заснуў.

Ці ні з яго сівога моху
І думка вытчацца нітом,
Што мы жывём і перад Богам
Не грэшны здрадаю ніхто;

Што лад свой звыклы
ладзім самі,
Клянёмся праўдзе на крыжы.
Які б свой боль не быў часамі,
А помнім мы пра боль чужы.

Не прачынаецца Савэры,
А вокам кветкі падміргне:
— Жыві, сынок!
Хай толькі вера
Ніколі наша не засне!

Чаканне свята

Жаданняў ветразь мой
заплыў далёка,
Спавіты быў смугой стары абшар.
Як свет чакае новага прарока,
Чакала свята новага душа.

Ужо мядзведзь прачнуўся, лежабока,
І бор ствалы зарубцаваў смалой,
Зямля купала ў Нёмане аблокі.
Спявала ўсё, а свята не было.

Чаканне часам цягнецца,
як вечнасць,
А век хвілінай важыцца адной.
Быў дзень,
За ім ступаў паволі вечар,
І ўсе вятры марудзілі з вясной.
І тут сяйвом агністым
і з-пад аблокаў
Прабілася і ўспыхнула святло,
Нібыта позірк новага прарока.
Было святло, а свята не было.

Вада ў рацэ зайграла віравока,
І мост стары на трэскі разнясло.
Ішла вясна.
Хоць не было прарока,
А свята ўсё ж вясновае было!..

Выпраўленая рака

Рака цячэ як сэрца б'ецца,
Як і з вачэй цячэ сляза.
"Не так цячэш!"
— яшчэ, здаецца,
Ніхто ніколі не казаў.

А тут нахлынулі, знайшліся,
Як той знянацку ураган.
І глуму плугам так прайшліся
Па выгінастых берагах.
Той шлях працяты быў вякамі,
Ды хто пытаецца ў вякоў?
Усё рашылі ў выкапкаме,
Ніхто не раіўся з ракой.

Яе спрамлялі ўжо аднойчы,
Ёй нехта новы шлях шукаў.
Але рака цячэ, як хоча,
Не так, як хоча выкапкам.

Зімовая дарога

Калючага ветру надрывы,
Сячэ дзіўным шротам сякач.
І белыя снежныя грывы
Нясуцца праз поле наўскач.

Паўзуць недзе белыя змеі
Па гэтым сляпым цаліку.
Шалёнымі жорнамі меле
Для белага балю муку.

Зацягне і зычна, і тонка,
Ва ўсе свае дудкі падзьме.
А вочы заплюшчацца толькі —
І цёпла ў той даўняй зіме.

* * *

Да гуменца — наўпрост
Сцежка ў рыжай мякіне.
Дрозд садзіцца на хвост
Зазімелай галіне.

І гайдае сваю
Верабей на таполі.
Капяжы адтаюць
Пад страхою паволі.

Кожны сам па сабе
Мітусіцца, цікуе.
Там, дзе дрозд не здзяўбе,
Верабей пасмакуе!...

Галіна НІЧЫПАРОВІЧ

Сінявокая Беларусь

Той, хто позірк спыніў аднойчы
На разлогах гэтых мясцін,
Дзе натхненнем напоены ночы
І блукае сівы ўспамін,

Застанецца душой назаўсёды —
У палон забярэ прыгажосць.
Нёман коціць-нясе свае воды,
Кожны тут гаспадар, а не госць.

Ззяе сонца, плывуць аблокі,
Ладзіць песню сваю жаўрук,
Бо вясны прыход недалёкі,
Праца ў полі папросіць рук.

Берагчы трэба гэтую веліч
Краю роднага, родных мясцін,
Бо ад нас толькі ўсё залежыць
І Чарнобыль — таму напамін.

* * *

Калі існасць
Струну кранае —
Зорапад.
У чаканні
Вечнасць лунае —
Крок назад.
Безвыходнасць
Свечкай згарае —
Чысціня,
Прамяніста
Сумленне ззяе —
Вышыня.

Падарунак

Там дзе Нёмна бераг,
Травы аксаміт,
Упляту ў вяночак
Васілька блакіт.
Каласочкі нівы,
Дзьмухаўца цяпло,
Золак і расінкі,
Сонейка святло,
Белыя рамонкі,
Церпкі пах лугоў,
Лёгкасць незабудкі
І сугучча слоў:
Беларускай песні
Будзе каляровы
Мой вяночак весні,
І духмяны, звонкі —
Для маёй старонкі.

Фота Уладзіслава Баська

Маці

Алесь АЛЯШКЕВІЧ

Апавяданне

Бяда ў дом Надзеі Міхайлаўны прыйшла пад канец восені, калі дрэвы ўжо стаялі аголеныя, а ночы зрабіліся доўгімі і прахалоднымі. Быў пахмурны, з нізкім выцвілым шэрым небам і знобкім паўночным ветрам дзень. Міхайлаўна ў абед, як звычайна, завіхалася на калгаснай ферме. Адносячы цёплы сырадой у невялічкіх бідонах у зборны цэх, яна час ад часу кідала неспакойны позірк праз вузкае сценнае акенца на ўтаптаную сцяжыну, што вужакай вілася з пагорка, дзе стаяла ферма, да ўскраіны вёскі. Час ужо перапаўзаў за поўдзень, але ейнага сямігадовага Петруська са школы штосьці не было відаць...

Хлопчык заўсёды пасля заняткаў зазіраў да яе на ферму; спацелы ад хуткай хады, з ускудлачанымі русымі валасамі і прыгожай чырванню на кругленькіх шчочках, ён прагна піў з вялікага кубка сырадой. Міхайлаўна замілавана глядзела на сваю крывінку.

Потым, пасля дойкі, яны разам ішлі дахаты праз прыбалотны поплаў, з якім межавала высокая асока і сакавітая трава.

Але сёння Петрусёк чамусьці затрымліваўся. Міхайлаўна адвяла позірк ад недалёкай, сцішанай пад высокімі голымі бярозамі вёскі і выпрастала ацёклую спіну. І раптам убачыла побач мажную постаць загадчыцы фермы. Твар невысокай пажылой жанчыны быў нейкі шэры, у ейных раскосых вачах свяціліся спачуванне і жаль.

— Надзейка, паслухай, што табе мушу сказаць, — нервова прашаптала яна. — Ты толькі моцна не хвалюйся. На гурт дзяцей, што ішлі са школы, наехаў п'яны вадзіцель. Сярод дзяцей быў і твой хлопчык...

Ад пачутага ў Міхайлаўны запякло ў сэрцы, вочы затуманіліся; галава, рукі сталі цяжкія, яна асела на металічнае вечка бідона.

— Ты толькі не хвалюйся так, — даляталі, нібы з-за якой сцяны, да яе трывожныя словы жанчыны. — Усе дзеці жывыя, але ёсць пераломы... Іх адвезлі ў горад у бальніцу. Ты бяры нашу машыну, едзь да свайго хлопчыка. Яна там, на двары.

Устрапянуўшыся, Міхайлаўна прымусіла сябе ўзняцца з бідона. Сапраўды, што гэта яна села: яна ж так патрэбна зараз сыну...

Праз гадзіну яна ўжо была ў раённай бальніцы. Петрусёк ляжаў у вялікай белай палаце разам з іншымі вясковымі хлопчыкамі, якіх падбіла машына — надзвычай белы, аніводнай крывінкі на ўсім дробным спужаным твары. Дзве ягоныя нагі былі ўзятыя ў тоўсты гіпс. Убачыўшы маці, ён паспрабаваў павярнуцца і ўсміхнуцца ёй, але не змог — перасмыкнуўся ад моцнага болю, які працяў яго хударлявае цела. Міхайлаўна ледзь стрымала слёзы ад жалю, што агарнуў ейнае мацярынскае сэрца.

— Ты ляжы, сынок, не варушыся, — прысеўшы побач з сынам на край ложка, пяшчотна дакранулася яна дрыготкімі пальцамі да гарачага дзіцячага ілба.

У бальніцы яна прабыла да вечара, перагаварыла з урачамі, схадзіла ў магазін, купіла сыну свежай садавіны, прымусіла яго крыху перакусіць, і толькі тады заспяшалася на аўтобус.

Волю сваім гаротным пачуццям яна дала, калі ўжо вярнулася дамоў — праплакала амаль усю ночку на халодным ложку. Гадавала сына Міхайлаўна адна. Муж Міхась, добры і спагадлівы чалавек, чатыры гады таму раптоўна памёр ад сардэчнай хваробы. Таму ўсе думкі і намеры Міхайлаўны былі скіраваны на малалетняга сына — каб той ні ў чым не меў нястачы; заўжды быў у цяпле і накормлены, хадзіў у добрым адзенні і абутку. Для гэтага і працавала яна з раніцы да позняга вечара на ферме, ды яшчэ трымала сваю вялікую гаспадарку: карову, парасят, куры... І вось не зберагла свайго светлалобіка ад бяды.

Раніцой Міхайлаўна, дагледзеўшы ўласную гаспадарку, заспяшалася на ферму, апоўдні ж зноў паехала ў бальніцу...

Яна наведвала сына амаль кожны дзень.

Праз тры месяцы Петруську знялі з ног гіпс. З надзеяй, што яе крывінку нарэшце выпішуць і дазволяць забраць дамоў, Міхайлаўна пайшла да ўрача, які лячыў сына. Той быў у прасторным кабінеце з трыма сваімі калегамі, якія па чарзе разглядалі ля акна невялічкі шэры рэнтгенаўскі здымак.

— А вось і маці нашага пацыента, — прыкмеціўшы Міхайлаўну, сумна сказаў калегам лечачы ўрач і паправіў на сваім маладым доўгім твары акуляры. — Вы, відаць, наконт выпіскі вашага сына?..

Міхайлаўна ледзь бачна кіўнула галавой. Ад прысутнасці ў кабінеце столькіх задуменных урачоў у ейным сэрцы зварухнулася трывога. Няўжо што няддобрае з Петруськом? Што за здымак урачы так незадаволена разглядалі?

— З выпіскай вашага хлопца, на жаль, пакуль давядзецца пачакаць, — раптам суха прамовіў стары сівы ўрач, які, відаць, быў галоўным сярод сваіх калег.

— Як гэта не цяжка, але мушу сказаць вам, як маці, праўду, — узняў ён на Міхайлаўну свае маленькія сумныя вочы, у якіх выступала спачуванне. — У выніку моцнага ўдару пры аварыі ў вашага сына здарылася вельмі рэдкая костная траўма рукі, якая перайшла ў гангрэну... На жаль, гэтая хвароба пакуль невылечная . І ва ўсім свеце толькі ў Амерыцы, ды яшчэ ў Маскве прафесар Ліманаў, робяць па ёй першыя доследы. Таму прыйдзецца адняць паражоны ўчастак, — змоўк урач.

— Майму хлопчыку што, адымуць руку? — ад нечаканасці Міхайлаўна вырачыла вочы, няўцямна зірнула на сівога ўрача.

— Так, тыдні праз тры вашаму сыну трэба будзе рабіць аперацыю, — ціха ўдакладніў той.

Міхайлаўна нават не памятала, як на здранцвелых нагах пакінула бальніцу, даехала дамоў. Прыгнечаная, апусцілася ў хаце на табурэт. Яна доўга пазірала патухлымі вачыма праз акно на двор, па якім некалі бегаў ейны вясёлы і неўтамонны Петрусёк, потым адвяла позірк ад недалёкай, сцішанай на гародзе разгалістай ліпы, зірнула ў адчаі на вячэрняе цярушліва-хмарнае неба, каб туды адпусціць свой нясцерпны мацярынскі боль, але супакою не атрымлівала. Цяжка ўзняўшыся з табурэта, яна выйшла на двор. Калі ў прыцемках лягла ў ложак і засяродзілася сама на сабе, зноў наплылі горкія думкі. Сыну адымуць руку? І ейная крывінка назаўсёды застанецца калекай, як жа гэта, га?..

Страшныя думкі даймалі яе амаль усю ночку, і толькі пад раніцу, калі акраец неба ў акне пачаў наліваццца перадсвітальным *марывам*, Міхайлаўна раптам страпянулася. Чакай, чаго ж гэта яна так раскісла? Трэба ж ратаваць сваю крывінку... Стары ўрач у бальніцы, здаецца ж, казаў, што ў Маскве хваробу сына ўжо спрабуе лячыць нейкі прафесар Ліманаў...

"Трэба неадкладна ехаць у Маскву! — агарнула Міхайлаўну выратавальная думка. — Знайсці гэтага прафесара..."

Падхапіўшыся з ложка, яна ступіла да старой шафы, дрыжачымі рукамі выцягнула з-пад коўдры на паліцы грошы, што прыхоўвала на чорны дзень, і таропка пералічыла іх. Вядома ж, гэтых капейчын для паездкі ў Маскву было мала. Але ёсць жа ў хляве яшчэ карова, трое гадавалых парсюкоў, якіх можна здаць у калгас. Ды яшчэ можна пазычыць у суседзяў — свет жа не без добрых людзей. Апрануўшыся, Міхайлаўна выйшла на вуліцу, таропка пашыбавала па поплаве да суседняй вёскі ў праўленне калгаса...

...Цягнік прыйшоў у Маскву на досвітку. Пакінуўшы цеснаваты, але ўтульны вагон, Міхайлаўна апынулася ў шматталосным вірлівым натоўпе, і адразу разгубілася, адчуўшы сябе сярод безупыннага людскога струменя, што плыў па доўгаму шэраму перону, нібыта ў нейкім мураш-ніку. Натоўп зацягнуў яе спачатку ў нейкі шырокі прыцемнены падземны пераход, потым выкінуў на вялікую прывакзальную плошчу, рассыпаўшыся на ёй на жвавыя ручаі. Адзін з гэтых ручаёў і вынес Міхайлаўну да аўтобуснага прыпынку. Масква ўжо была пазбаўлена снегу; вясна нагадвала пра сябе падсохлымі асфальтавымі тратуарамі і свежым нехалодным ветрам. Міхайлаўна доўга распытвала, як ёй праехаць да патрэбнага медыцынскага інстытута, але прахожыя раўнадушна паціскалі плячамі, іншыя з іх наогул не звярталі ўвагі на прыезджую вясковую жанчыну, і толькі адна дзяўчына ў доўгім чырвоным паліто, прыпынілася і паказала рукой на прыпынак, што быў на процілеглым баку вуліцы...

А дзевятай гадзіне — з дзвюма перасадкамі — Міхайлаўна нарэшце дабралася да інстытута. Шматпавярховы, шырачэзны, з вялікімі прамавугольнымі вокнамі, ён стаяў на рагу дзвюх шумных вуліц. Яна не адразу адшукала сярод мноства празрыстых шкляных дзвярэй патрэбны ўваход. Але імя прафесара, якое яна назвала пажылому падцягнутаму вахцёру, падзейнічала на таго магічна, і мужчына паказаў на доўгі і шырокі бакавы калідор...

Прафесар Ліманаў прыняў яе па запісе толькі пасля абеду. Высокі, хударлявы, з маленькімі і чорнымі, як смала, вусікамі, у карткаватым белым халаце, ён доўга свідраваў глыбока пасаджанымі вачыма здымак, які прывезла Міхайлаўна, нарэшце, зморшчыўшыся, перавёў на вясковую жанчыну свой задуменны позірк.

— Дарэмна вы, шаноўная, прыехалі ў такую далеч, — сумна сказаў ён. — Наш інстытут не робіць пацыентам падобныя аперацыі. Пакуль па гэтай хваробе мы ставім доследы толькі на жывёлах, і не вельмі ўдалыя...

Ён хвіліну памаўчаў, задумліва разглядаючы здымак, пасля скрушліва дадаў:

— Таму, на жаль, нічым не магу дапамагчы вашаму сыну. Дарэмна вы ехалі...

Прыкусіўшы да болю і крыві ніжнюю губу, Міхайлаўна ацяжэлымі нагамі пакінула інстытут. Яна доўга ішла па вуліцах, размаўляючы сама з сабой. На вакзал прыехала ужо ў прыцемках. Доўга выглядала ў раскладзе зваротны цягнік на Мінск. Той ішоў толькі раніцай. Яна апусцілася ў шумнай зале чакання на пластмасавую лаўку і адразу, знясіленая, правалілася ў нейкі неспакойны трывожны сон...

На досвітку, падхапіўшыся, рушыла на перон да цягніка і раптам, павярнуўшыся, пайшла да аўтобуснага прыпынку. Не, не для гэтага яна ехала ў такую далеч, каб вярнуцца дамоў да сваёй гаротнай крывінкі з нічым. Не для гэтага...

Даехаўшы да інстытута, Міхайлаўна цярпліва стаяла на ягоным пляцы перад уваходнымі дзвярыма, абмацваючы вачыма людскі натоўп, які спяшаўся ў будынак, пакуль нарэшце не прыкмеціла ў ім знаёмую хударлявую фігуру прафесара, і тут жа апусцілася перад ім на калені...

Устала яна з прахалоднага каменя толькі ўвечары, калі гучны людскі струмень, раўнадушна абцякаючы яе, прасунуўся міма... Назаўтра, неяк агараўшы ночку на цвёрдай вакзальнай лаўцы, яна зноў прыехала да інстытута...

Прафесар Ліманаў пасля завяршэння аперацыі ў аддзяленні хірургіі падняўся на ліфце ў свой кабінет, спаласнуў рукі і спацелы лоб, выцерся мягкім ручніком, з палёгкай уздыхнуў, узняў вочы на медсястру, што сядзела за сталом і штосьці пісала ў тоўсты сшытак.

— Стаіць тая беларуская жанчына? — ціха пацікавіўся ён.

Мажная маладая жанчына адарвала вочы ад паперы, па ейным круглым ружовым твары прабег цень спачування і жалю.

— Стаіць, Аляксандр Мікалаевіч! Ужо сёмы дзень,— з раніцы да позняга вечара. І адкуль толькі ў яе бяруцца сілы? Ці гэта мацярынскае сэрца іх так надае?

Прафесар Ліманаў павесіў ручнік, ступіў да акна, адсунуў рукой рог фіранкі, зірнуў на вуліцу. Жанчына сіратліва стаяла на каленях пасярод шэрага інстытуцкага пляца. Парывісты вецер кудлаціў на галаве доўгія русыя валасы, што выглядалі з-пад лёгкай цёмнай хустачкі...

— Ідзіце, прывядзіце гэтую жанчыну сюды, — задумліва сказаў прафесар. — Толькі адагрэйце яе спачатку кавай...

— Вы вырашылі ўзяцца за аперацыю? — спытала медсястра. — Але ж яна вельмі складаная, і ў гэтай вясковай жанчыны не будзе чым заплаціць...

— Афармім за кошт інстытута, як першы добраахвотны эксперымент на чалавеку. Руку яе малому сыну мы ж у любы час паспеем адняць. А раптам што і атрымаецца? Завіце жанчыну. Няхай едзе, вязе свайго хлопца...

* * *

Калі праз прыадчыненае акенца пачуўся гук матора, Міхайлаўна, пакінуўшы завіхацца ля печы з чыгунамі, у якіх гатавала вячэру, выбегла на двор. Каля веснічак стаяла вялікая чорная сынава машына. З яе вылез Пятрусь — высокі, статны, з мужным загарэлым тварам, у шыкоўным цёмным касцюме.

— Ну, прывітанне, маманя. Як ты тут пажываеш?

— Ды так нічога, у мяне ўсё добра, сынок, — радасна прамовіла Міхайлаўна і пяшчотна дакранулася да сынавай левай рукі. — А як у цябе справы — рука не баліць?

— Ды што ты, маманя, усё прыстаеш з гэтай рукой, — злёгку абурыўся сын. — Ты ж бачыш, які я здаровы. Хоць зараз у воз запрагай! — ён пайграў пругкімі мускуламі.

— Ну і дзякуй Богу, сынок, — з палёгкай уздыхнула Міхайлаўна.

Пасля таго, як Петрусю зрабілі ў Маскве ўдалую аперацыю, яна яшчэ цэлыя чатыры гады вазіла хлопца туды на нагляд за прыжыўленай донарскай косткай. Потым сын падрос, паступіў у сельскагаспадарчы тэхнікум, але пасля яго заканчэння пайшоў у гандаль — адкрыў у Мінску на кірмашы некалькі кропак. І цяпер у сына ўсё слаўна: уласны катэдж пад Мінскам, замежная машына, маладая прыгожая жонка... Праўда, бацькоўскую хату Пятрусь наведваў не часта, але Міхайлаўна не крыўдавала на яго. У сына ж столькі клопатаў на гэтым кірмашы — з раніцы і да позняга вечара кожны Божы дзень на ім! Таму была вельмі рада кожнаму ягонаму прыезду...

Прайшоўшы з сынам у хату, яна хуценька накрыла на стол. Счакала, пакуль сын уволю пачастуецца хатняй ежай, спыталася з надзеяй у голасе:

— Ты мо пераначуеш, сынок? На дварэ ж ужо шарэе...

— Не, я ненадоўга, маманя. І са справай да цябе, — выцер аб працягнуты маці ручнік Пятрусь рукі і, устаўшы з табурэта, палез у чорную скураную барсетку, якую прывёз з сабой, выцягнуў адтуль нейкую паперу, паклаў яе на чысты ўскраек стала.

— Хопіць табе, маманя, тут ужо адной гараваць, — вымавіў ён. — Дом прададзім. Мне якраз грошы патрэбны. Хачу новы шапік на кірмашы паставіць. Я ўжо і пакупніка на дом знайшоў. Падпішы вось гэтую паперу,— выцягнуў сын з кішэні пінжака залацістую ручку.

— Як скажаш, сынок, — схіліўшыся над аркушам, Міхайлаўна паставіла ў падказаным месцы сваю нязграбную закавыку.

Разагнула паволі старую спіну, запыталася:

— А я куды, сынок, да цябе ў Мінск?

— Ды не, маманя, — хутка адказаў Пятрусь, падхапіўшы са стала паперу. — Ты ж ведаеш, мы ж з жонкай увесь час на рабоце. А за табой нагляд патрэбен. Я дамовіўся у райвыканкаме, каб табе выдзелілі месца ў інтэрнаце пад Мінскам. Там добра кормяць, даглядаюць, урачы заўсёды на месцы... На днях заеду за табой, адвязу. Ну ўсё, мне ўжо трэба ехаць. Тавар новы прывязуць вечарам, — зашпіліў сын сваю скураную барсетку.

Міхайлаўна пайшла следам за сынам на двор.

— Ты толькі хутка не гані машыну, — папрасіла яна, калі Пятрусь усеўся за руль.

Счакала, пакуль сынава машына схаваецца за паваротам, вярнулася ў хату, акінуўшы яе, бы тую сіраціну, жалобным позіркам, скрушна глянула ў акно на хмарнае неба, што пачынала ўжо наліваццца чарнатой на ўсходзе. Яе агортвалі самотныя думкі. Не, не прыме яна прапанову сына — не паедзе ў гэты інтэрнат для старых. Навошта жыць сярод незнаёмых чужых людзей без усялякай справы? Няхай сын, калі яму так патрэбны грошы, прадае дом. А яна знойдзе дзенебудзь сабе прытулак... Вось толькі шкада было развітвацца з тым кутком, дзе прайшло ўсё яе гаротнае жыццё. Міхайлаўна, азірнуўшыся на пакой, ражком белай хустачкі выцерла на вачах слёзы. І, узняўшыся з табурэта, прыбрала посуд са стала ўжо не свайго, а чужога дома...

Раніцай, перахрысціўшы асірацелую хату, яна з невялічкім клункам за спінай пакінула назаўсёды родны падворак...

Больш у вёсцы пра Міхайлаўну нічога не чулі, толькі аднойчы сярод вяскоўцаў прайшла чутка, што падобную на яе жанчыну нібыта бачылі ў адным далёкім жаночым манастыры. Стоячы на каленях перад абразком Маці Боскай, сівая манашка з раніцы і да вечара бесперапынна малілася — прасіла ў нябеснай заступніцы здароўя і дабрабыту для свайго заблукалага ў свеце сына...

Ісціна – у параўнанні...

Год культуры Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь, урачыста адкрыты вясной паказам маскоўскай пастаноўкі балета "Лебядзінае возера", працягваецца. Не так даўно на сцэне Цэнтральнага дома афіцэраў маскоўскі тэатр "Современник" прадставіў беларускім гледачам спектакль "Мёртвыя душы" паводле М. Гогаля.

Гісторыя "Современника" пачалася ў 1956 годзе, калі некалькі выпускнікоў Школы-студыі МХАТ пакляліся адно адному заўсёды заставацца вернымі вучэнню К. Станіслаўскага. Неўзабаве яны заснавалі тэатр на чале з Алегам Яфрэмавым, які адкрыўся пастаноўкай п'есы В. Розава "Вечна жывыя". Першыя ж спектаклі, ролі ў якіх выконвалі А. Табакоў, Я. Еўсцігнееў, І. Кваша, М. Казакоў стварылі "Современніку" рэпутацыю аднаго з самых папулярных тэатраў СССР. У 1970-м А. Яфрэмаў быў запрошаны ўзначаліць МХАТ, а яго месца праз два гады заняла Галіна Волчак, якая і цяпер з'яўляецца мастацкім кіраўніком "Современника". Сёння тут працуюць такія зоркі, як Л. Ахеджакава, С. Гармаш, В. Гафт, М. Няёлава, Ч. Хаматава, А. Якаўлева...

У 2000-м 25-гадовы артыст тэатра Дзмітрый Жамойда ажыццявіў на Малой сцэне "Современника" (рэпетыцыйная зала на пятым паверсе) свой рэжысёрскі дэбют: пастаноўку "Мёртвых душ", прачытаных "блізка да тэксту аўтара". Акрамя таго ён паспеў паставіць толькі п'есу "З Новым годам, Белград" у "Нашым тэатры". У 2006 г. рэжысёр трагічна загінуў у Маскве...

Беларускім гледачам, якім знаёмая сённяшняя трактоўка "Мёртвых душ" Купалаўскім тэатрам (пад назвай "Чычыкаў"), маскоўская версія дала багата падстаў для разваг і параўнанняў.

"Мёртвыя душы" ў версіі Д. Жамойды тыпова камерны спектакль, які найбольш удала выглядае на малой сцэне і губляе некаторыя свае вартасці пры пераносе на вялікую. У пастаноўцы зусім адсутнічаюць дэкарацыі, з рэквізіту ёсць толькі стол ды некалькі лавак, якія пазначаюцца для гледачоў то трактір, то маёнткі памешчыкаў. Дзейных асоб толькі пяць. І калі Ілья Драўноў выступае ў ролі Прыезджага (фактычна, Чычыкава), дык акцёры ў абліччы Жыхароў N-скай губерні (Кірыла Мажараў, Яна Раманчанка, Таццяна Карэцкая і Рашыд Незаметдзінаў) змяняюць маскі і адзенне сваіх герояў, нібы ў стыхіі карнавала. Напрыклад, К. Мажараў выконвае ролі Манілава, Наздрова, Сабакевіча і Плюшкіна. Прычым, пераапрананні адбываюцца тут жа, на сцэне. Дзякуючы гэтаму спектакль выйграе ў лёгкасці, там зусім няма статычных сцэн, але адначасова, на маю думку, прайграе ў псіхалагічнай відовішчнасці і глыбіні, а героі здаюцца занадта універсальнымі.

Хоць жанр і "Чычыкава", і "Мёртвых душ" пазначаны як камедыя, масквічы ў асобных сцэнах выходзяць за яе межы, нейкія элементы іх пастаноўкі набліжаюць жанр да камедыі-фарса, разлічанага на знешні эфект. Для беларускай версіі (рэжысёр В. Раеўскі), наадварот, больш характэрна трагедыйнае гучанне. Купалаўскі спектакль больш акадэмічны і манументальны, часам празмерна статычны, але пры гэтым надзіва багаты на ўдалыя акцёрскія работы і яркія характары: В. Манаеў — Манілаў, А. Кавальчук — Наздроў, Г. Аўсяннікаў — Сабакевіч, А. Сідарава — Каробачка, А. Мілаванаў — Плюшкін і, нарэшце, А. Гарбуз — Чычыкаў. Таму "Чычыкава" можна назваць класічным акцёрскім спектаклем, а "Мёртвыя душы" – рэжысёрскім. Беларуская пастаноўка прыклад узнаўлення атмасферы часу, адлюстраванага ў творы М. Гогаля. Маскоўскі рэжысёр, наадварот, імкнуўся "асучасніць" твор. Таму ў Прыезджага раптам з'яўляюцца чорныя акуляры — як у Джэймса Бонда, сяляне Каробачкі нагадваюць "крутых хлопцаў" з таннага галівудскага баевіка, а сама памешчыца ўвачавідкі ператвараецца ў прывабную напаўраспранутую маладзіцу, якая фліртуе з Чычыкавым.

Фінал маскоўскіх "Мёртвых душ" успрымаеш як моцны, упэўнены клічнік. Прыезджы, патрапіўшы ў затхлы, душны свет Плюшкіна, уладальніка найбольшай колькасці "мёртвых душ", раптам разумее: ён настолькі пагрузіўся ў іх нежывы свет, што выбрацца адтуль самастойна ўжо не можа. "Заставайцеся, Павел Іванавіч!" — кажуць яму гаспадар і яго мёртвыя сяляне. І Прыезджы, каб вызваліцца і ўсё-ткі пазбегнуць іх лёсу, пачынае раскідваць па сцэне паперы пра пакупку сялян. Нібы разумее сутнасць зробленага і выкідае набытыя "мёртвыя душы" са свайго жыцця.

Такая версія класікі, безумоўна, мае права на існаванне. "Чаго не хачу — спектакля, які хоць неяк асацыіраваўся б са звыклымі "Мёртвымі душамі" ў рускім тэатры. Не — складанаму грыму, які робіць з твара маску. Не — узроставым ролям. Не — стараннаму адлюстраванню сюжэта. Пачуццё навізны, актуальнасці Гогаля, (...), было галоўным..." — казаў Д. Жымойда, чыя рэжысёрская стылістыка вытрымлівалася на працягу спектакля бездакорна.

Аднак гастролі суседзяў пераконваюць, што айчыннаму гледачу варта высока ацэньваць свой беларускі тэатр, які, магчыма, без гучнай рэкламы, прапануе ўласнае і адметнае бачанне хрэстаматыйных твораў. Прынамсі, не горшае за пастаноўку славутага "Современника".

Дзяніс МАРЦІНОВІЧ

Радуемся разам



Прэзентацыя чарговага, 13-га, выпуску часопіса "Монолог. Свободное творчество" адбылася ў сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва. Кіраўнік гэтага вядомага ў асяроддзі творчай інтэлігенцыі праекта — знаны беларускі тэатральны крытык, журналіст, прафесар Таццяна Арлова, выдавец і галоўны рэдактар — Аляксей Андрэеў. Сярод герояў і аўтараў новага "Маналога" такія адметныя асобы, як Арлен Кашкурэвіч, Вірджыні Шыманец, Алена Папова, Уладзімір Сцяпан...

У часопісе прадстаўлена мастацкая графіка і фота А. Кашкурэвіча, А. Барташэвіча, Д. Парнюка, У. Парфянка, А. Глобуса, І. Цішына, студыі "Басталія" ды інш. У афармленні вокладкі скарыстана работа мастака Андрэя Радзіёнава.

Гэтым летам Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача парадаваў сваіх самых маленькіх сяброў прэм'ерай "Па зялёных гурбах акіяна" паводле п'есы расійскага драматурга Сяргея Казлова. Спектакль, жанр якога вызначаны як "казка воўчага лесу на дзве дзеі", — рэжысёрскі дэбют знанага акцёра ТЮГа Ігара Сідорчыка. Поруч з ім працавалі мастак Сяргей Антонаў, акцёры Аляксандр Зелянко, Аляксандр Гладкі, Раіса Астрадзінава, Міхаіл Есьман, Аляксандр Станілевіч (ён жа — аўтар песень да спектакля) ды інш. Тэатр запрашае гледачоў паразважаць пра дзівакоў і летуценнікаў, на якіх трымаецца свет. Такімі людзьмі кіруюць Вера, Надзея, Любоў, а натхняюць іх Неспасціжнасць і Прыгажосць. Неаспрэчна, што трымаецца свет... на Дзяцінстве. Хоць многія з нас, пасталеўшы, забываюцца на свае мары і прыгожыя памкненні, страчваюць веру, надзею, любоў і натхненне, кпяць з "абраных" дзівакоў. Але ўрэшце пагаджаюцца, што жыццё трывае і робіцца радасным шмат у чым дзякуючы такім дзівакам, якія захавалі ў сабе чысты свет дзяцінства. Пастаноўка, прымеркаваная да Года роднай зямлі, закранае экалагічную праблематыку, скіраваная на тое, каб абудзіць і развіць у дзецях любоў да прыроды, адданасць сваім марам.

Годам Фрыдэрыка Шапэна абвясціў 2010 год Сейм Польшчы — у сувязі з двухвяковым юбілеем гэтага выдатнага прадстаўніка музычнага рамантызму. Пад знакам 200-годдзя з дня нараджэння Ф. Шапэна Польскі інстытут у Мінску ладзіць шматлікія адмысловыя імпрэзы. Сярод іх, напрыклад, — вечарына з удзелам маладых беларускіх выканаўцаў "Пад зоркаю Шапэна", якая прайшла ў зале Беларускага саюза кампазітараў, а таксама праграма, складзеная з шэдэўраў польскай камернай музыкі, што адбылася ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Там, у Малой зале імя Р. Шырмы, выступіла бліскучае трыо з Варшавы "Varsovia Piano Trio", творчае крэда якога — прадстаўленне ў сваіх канцэртах творчасці перадусім польскіх і славянскіх аўтараў. У мінскую афішу ансамбль выдатных польскіх музыкантаў уключыў, апроч Фартэпіяннага трыо соль мінор Фрыдэрыка Шапэна, творы ў гэтым жанры, напісаныя нашымі сучаснікамі — знанымі польскімі кампазітарамі Рамуальдам Твардоўскім і Паўлам Лукашэўскім.

Лана ІВАНОВА

На здымках: вокладка новага выпуску "Маналога"; кіраўнік праекта Т. Арлова на прэзентацыі; плакат спектакля "Па зялёных гурбах акіяна".

Фота Святланы Берасцень

Адметная дынастыя

У Крупскай карціннай галерэі наладзілі мастацкую выставу "Дынастыя Аракчэевых". Увогуле, гэта ўжо не першая сумесная экспазіцыя вядомай творчай сям'і, а вось для невялічкага горада Крупкі яна сталася з'явай, бо такіх выстаў са сталіцы сюды яшчэ не прывозілі.

Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Барыс Аракчэеў, "галава" дынастыі, жыве толькі мастацтвам, жонка — яго муза, дзеці, унукі — яго любоў, а жывапіс — яго жыццё. Працуе мастак актыўна, хоць даўно ўжо яму за 80, любіць і падарожнічаць. Пасля адкрыцця выставы ў Крупках з малодшай дачкой Аксанай вандравалі 10 дзён па Расіі. Наведаліся ў мясціны, дзе жыў і вучыўся Максім Багдановіч, пабывалі на радзіме Барыса Уладзіміравіча. Мастачку Аксану Аракчэеву ўразілі сваёй велічнасцю Растоў Вялікі, яраслаўскі крэмль, Спаса-Прэабражэнскі сабор 1152 года, мясцовасць, дзе нарадзіўся Аляксандр Неўскі. Але па-сапраўднаму ўзрушыла Тройца-Сергіева лаўра з яе кранальнымі купаламі-"цыбулінкамі" і унікальнымі фрэскамі, зробленымі майстрамі школы Андрэя Рублёва, і асабліва Траецкі сабор, спецыяльна для якога пісаў Рублёў сваю "Тройцу".

Колькі сябе помняць дзеці Барыса Аракчэева, маці ішла на працу, а яны ўвесь час бавілі з бацькам у яго майстэрні. І не мог ён не перадаць любоў да вялікага мастацтва сваім тром дочкам — Алене, Марыне, Аксане. Яны скончылі ў свой час Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, а іх дзеткі вучацца ў розных мастацкіх установах сталіцы. Сын Марыны ўжо скончыў нашу акадэмію мастацтваў і працуе ў Санкт-Пецярбургу разам з жонкай-мастачкай, і яны, дарэчы, прадставілі на сямейнай выставе карціны, выкананыя ў розных тэхніках і розных жанрах.

Барыс Уладзіміравіч, які аднойчы ўжо зрабіў крупчанам неацэнны жывапісны падарунак, зноў падараваў карціннай галерэі Крупак дзве манументальныя карціны, прысвечаныя легендарнай цытадэлі над Бугам, — "Абаронцы Брэсцкай крэпасці" (1983). Палотны выставілі ў вялікай зале побач з падоранай раней карцінай "Гродзенскія гусары. Атака ў Клясціцах". Цёплыя словы прагучалі ў адрас ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Барыса Аракчэева ад намесніка райвыканкама Уладзіміра Загорскага.

Вялізнае палатно Б. Аракчэева "Венера і бэз" прыцягнула сваёй велічнасцю і нейкай святочнасцю ўвагу ўсіх, хто прыйшоў на адкрыццё выставы. Ды і ўвесь час прыходзяць у галерэю мастакі і жыхары Крупшчыны, каб палюбавацца на гэты твор, якому месца ў лепшых музеях свету, але аўтар падараваў яго Крупкам. Заўсёды чакаюць старэйшага майстра жывапісу ў гэтым горадзе самадзейныя мастакі — з марай трапіць на майстар-клас Барыса Уладзіміравіча. Ён абяцаў зноў прыехаць з дочкамі і ўнукамі на цудоўны бераг ракі Бобр і правесці пленэр, як калісьці, падчас працы са студэнтамі ў акадэміі мастацтваў.

Прадстаўленыя на выстаўцы партрэты, выкананыя Аленай Аракчэевай, уразілі сваім высокім майстэрствам і ўменнем перадаць унутраны стан мадэляў (трэба адзначыць, што мастачка пэўны час працавала ў Польшчы і пісала там знакамітых гістарычных асоб і партрэты сучасных палякаў). Вялікая калекцыя партрэтаў усіх, за гісторыю БДУ, рэктараў сёння прадстаўлена ў музеі універсітэта. Аксана паказала свае творы з серыі "Мінскія вокны" і "Нам засталася спадчына", а таксама ілюстрацыі да кніг "Гарэза-хахатушка", "Мышка Пік-Пік" Людмілы Рублеўскай і інш.

Унукі Барыса Аракчэева Уладзімір, Андрэй, Ягор паказалі свае малюнкі і невялікія творы, намаляваныя каляровымі алоўкамі, ды акварэлі.

Месца ў невялічкай галерэі не хапіла, каб паказаць усе прывезеныя творы, а таму экспазіцыю, разгорнутую тут на два месяцы, вырашылі перыядычна мяняць.

Трэба адзначыць, што і традыцыі Аракчэева-педагога маюць працяг у дзейнасці яго дачок: яны шмат часу аддаюць выкладанню, усе працуюць у мастацкіх вучэльнях сталіцы. Але знаходзяць творчае натхненне і ў сям'і.

Галія ФАТЫХАВА

На здымках: творчая сям'я Аракчэевых; палатно Б. Аракчэева "Венера і бэз".

Канцэрт, музычная прастора якога напоўненая гукамі класічнай гітары, — гэта заўсёды штосьці асаблівае. Бо гітара, паводле слоў знакамітага расійскага гітарыста А. Фраўчы, "сваім высакародным, інтымным гучаннем здатная ствараць ні да чаго не падобную ўнутраную, можна сказаць, філасофскую цішыню". А калі гэты выдатны інструмент — у руках Майстра, які можа раскрыць праз сваё выкананне найшырэйшы спектр выразных магчымасцей гітары, дык рэдкі слухач не адчуе магічнае ўздзеянне гэтых гукаў. Слухачы аднаго з летніх канцэртаў у Малой зале Белдзяржфілармоніі апынуліся ў эпіцэнтры такой гітарнай магіі. А Майстрам, што стварыў яе, стаў малады беларускі музыкант Павел Кухта.

Музычны краявід са святам

Хоць фармальна гэты канцэрт уяўляў сабой экзаменацыйнае выступленне студэнта магістратуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, па сутнасці, ён стаўся вельмі яркай і пераканаўчай дэманстрацыяй дасягнення музыкантам найвысокага ўзроўню выканальніцкага майстэрства. Станаўленне Паўла як музыканта праходзіла не толькі ў Беларусі, але і па-за яе межамі (Польшча, Славакія, Чэхія, Аўстрыя, Расія і інш.), дзе ён выступаў з канцэртамі. Істотна спрыялі гэтаму яго поспехі на многіх (больш як дзесяці) міжнародных конкурсах. Адна з самых знамянальных перамог — І прэмія на конкурсе імя Джона Дзюарта ў г. Русце (Аўстрыя), якая падаравала музыканту магчымасць даць серыю канцэртаў у ЗША, Мексіцы, Швейцарыі і запісаць сольны кампакт-дыск у Вене. А зусім нядаўна ён стаў лаўрэатам прэстыжнага Міжнароднага конкурсу ў Францыі, прысвечанага Леа Браўэру, дзе быў удастоены II прэміі і Прыза сімпатый слухачоў. Варта адзначыць і тое, што Павел Кухта з'яўляецца стыпендыятам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Несумненна, паспяховаму развіццю выканальніцкага майстэрства маладога гітарыста спрыялі заняткі ў аднаго з вядучых педагогаў Беларусі —дацэнта БДАМ Яўгена Грыдзюшкі, а таксама ўдзел у майстар-класах такіх сусветна вядомых майстраў, як П. Рамэра, Д. Расэл, О. Гілля, А. Папандрэу ды інш.

Першае, што прыцягнула ўвагу на філарманічным канцэрце, — поўная зала. Нікога не "напалохала" складанасць і аб'ёмнасць замоўленых у праграме твораў, пераважна буйной формы — разгорнутых музычных палотнаў з багатай і разнастайнай драматургічнай лініяй, мноствам тэм ці вобразнай рознахарактарнасцю варыяцый. Адным з найцікавых адкрыццяў нават для абазнанай у гітарным рэпертуары публікі сталася выкананне маштабнай Фантазіі на тэмы оперы Д. Вердзі "Сіцылійская вячэрня" аўстрыйскага кампазітара XIX ст. Ёгана Каспара Мерца. Падчас выканання П. Кухтам гэтага твора яскравыя вобразы оперы зіхацелі рознымі гранямі, увасабляючыся ў непарыўную цэласнасць, што імчыць у нястрымным карагодзе музычных тэм і сцэнічных падзей.

Мала хто нават з гітарыстаў-прафесіяналаў знаёмы і з Фантазіяй "Карыёка" Серджа Асада, у якой з адмысловым пачуццём нацыянальнага стылю ўвасоблены дух музычнай сталіцы яго радзімы — Рыа-дэ-Жанейра. Бліскуча быў выкананы гэты твор! А сапраўдным сюрпрызам для ўсіх прысутных на канцэрце аказалася выкананне п'есы, напісанай меней як два гады таму буйным сучасным кампазітарам, дырыжорам, музычна-грамадскім дзеячам Леа Браўэрам, — "Кубінскі краявід са святам". Наогул, гэта — чарговы опус у серыі твораў для гітары маэстра Браўэра, у якіх ён увасабляе захапленне прыродай сваёй зямлі. Яркая і магутная эмацыйнасць, увасобленая аўтарам у музычнай тканіне, прасякнутай характэрнымі рытмамі ды інтанацыямі, напоўніцу выявілася ў выкананні П. Кухты.

Шмат у чым нечакана для слухачоў раскрыўся ён у той частцы свайго выступлення, якую можна было б назваць "Гітара ў джазавых тонах". Тут Павел адмыслова вытанчана і пранікліва, з дзівосна дакладным адчуваннем стылю і эмацыйна-вобразнага ладу выканаў дзве п'есы масцітых джазавых музыкаў — Джанга Рэйнхардта ("Аблокі") і Тэлоніуса Монка ("Вакол поўначы"). А пры канцы сваёй праграмы П. Кухта падараваў слухачам сустрэчу з цудоўнай музыкай, мабыць, самага цяпер выконваемага (і не толькі гітарыстамі) кампазітара Астора П'яцолы. Гэта былі дзве часткі знакамітага цыкла "Паравіны года ў Буэнас-Айрэсе" — "Зіма" і "Вясна". Такія розныя і сапраўды непаўторныя, прасякнутыя каларытам п'янкога і дурманлівага танга, гэтыя часткі цыкла праляцелі для слухачоў на адным уздыху.

Шчодры россып музычных твораў замежных кампазітараў з усяго свету ў праграме канцэрта арганічна спалучыўся з выдатнай музыкай, напісанай нашым суайчыннікам Уладзімірам Захаравым — адным з самых цікавых беларускіх гітарыстаў-кампазітараў, у класе якога, дарэчы, займаўся Павел, калі быў студэнтам Гродзенскай музычнай вучэльні. І, думаю, не толькі ў знак адмысловай удзячнасці Настаўніку, але і для таго, каб падкрэсліць значнасць твора ва ўсёй праграме канцэрта, сваё выступленне малады гітарыст пачаў з цыкла У. Захарава "Прэлюд і фугета на славянскія тэмы". Дзівоснае спалучэнне шчымліва-далікатных і пранікліва гукаў каталіцкага напеву і энергічных інтанацый беларускай калядкі, увасобленае ў гэтым творы, трапятліва было перададзена П. Кухтам у яго музычнай інтэрпрэтацыі.

Публіка доўга выклікала музыканта "на біс", да слёз узрушыўшы яго такой шчырай слухацкай цікавасцю. У той вечар адбылося вялікае Свята Гітарнага Мастацтва, створанае маладым беларускім музыкантам Паўлам Кухтам.

Кірыла УСПЕНСКІ

Вандроўка да Напалеона

Яскравымі разнажанравымі праграмамі завяршыў свой чарговы сезон заслужаны калектыў Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі.

Падчас XVIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" гэтыя выдатныя музыканты пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны Міхаіла Фінберга, як і штогод, суправаджалі выступленні ўдзельнікаў конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні ў другі дзень спаборніцтва, а таксама бліскуча прадставілі свае новыя канцэртныя праграмы. І пасля паспяховых выступленняў у фестывальнай "паўночнаўсходняй сталіцы" давялося адразу выпраўляцца ў дарогу на захад краіны — на Брэстчыну.

Там, у Іванаўскім раёне, пры падтрымцы Міністэрства культуры Беларусі ды мясцовага райвыканкама, аркестр ужо трэці год запар ладзіў адметны праект, які вобразна завецца "Музычная гасцёўня Напалеона Орды". Запрасіўшы на свята ў гонар выдатнай асобы нашага земляка, музычнага дзеяча, кампазітара, мастака, ураджэнца гэтага самабытнага кутка Беларускага Палесся, арганізатары праекта прапанавалі змястоўную і разнастайную праграму. "Сёлетняя гасцёўня атрымалася незвычайная, — падкрэслівае маэстра М. Фінберг. — І не толькі таму, што Камерны аркестр, які ўваходзіць у склад нашага вялікага калектыву, падрыхтаваў новую цудоўную праграму "Успамін пра Напалеона Орду". У гонар 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і ў Год роднай зямлі мы прывезлі іванаўцам свой шчыры падарунак — два канцэрты з удзелам лепшых музыкантаў і салістаў".

Такім чынам, на гарадскім стадыёне адбылася прэзентацыя песенных шлягераў — "Нашы шлягеры пяём і танцуем", а вечаровую танцавальную пляцоўку ўпрыгожыў Біг-бэнд аркестра — "Дыялог з джазам". Але зразумела, што вызначальнае месца на свяце пад назвою "Гасцёўня Напалеона Орды" займала яго музыка, якая прагучала ў новай праграме разам з творамі іншых кампазітараў, што нарадзіліся на нашай зямлі, знаходзілі тут сваё творчае натхненне, былі сучаснікамі "беларускага Напалеона" ці спадкаемцамі яго традыцый.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымку: Напалеон Орда, (фота 1880 года).

...І мудрасць педагога

"Юнацтва. Творчасць. Каханне для вас!" — так называўся канцэрт-прэзентацыя навучэнцаў і выкладчыкаў Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў, прысвечаны 65-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Імпрэзу ладзіла аддзяленне "Мастацтва эстрады (спевы)" у сталічным Палацы чыгуначнікаў.

Вядома, эстрада заўсёды належала да жанраў найбольш дэмакратычных і запатрабаваных публікай. Яна мае нязменна вялікую папулярнасць і ў слухача, і ў тых, хто змалку горача марыць зрабіцца артыстам. Магчыма, таму аддзяленне "Мастацтва эстрады (спевы)", якое з'явілася ў Мінскім дзяржаўным каледжы мастацтваў толькі тры гады таму, карыстаецца такой неверагоднай папулярнасцю. Дастаткова сказаць, што летась конкурс абітурыентаў складаў ажно 14 (!) чалавек на месца. Болей, як у ВНУ на прэстыжны "дызайн". Думаю, аўтарытэту ўстанове і аддзяленню дадало тое, што ўзначальвае яго вядомы і таленавіты беларускі кампазітар і педагог Алена Атрашкевіч.

Яна здолела прыцягнуць да выкладання аўтарытэтных асоб у беларускім музычным мастацтве — напрыклад, кампазітара Алега Хадоску, спевака Алега Сямёнава. Выкладаецца на эстрадным аддзяленні і джазавы вакал (юныя артысты пераканальна дэманстравалі яго на канцэрце), і такая неабходная дысцыпліна, як "сцэнічная мова".

Канцэрт-прэзентацыя, або справаздачны канцэрт, паказаны шырокай публіцы, фактычна стаўся першым за тры гады. І хоць таямніцам эстраднага жанру навучаецца на трох курсах толькі 30 чалавек, праграма атрымалася даволі прадстаўнічая, у двух аддзяленнях, ды па 15 нумароў у кожным. Гучалі творы розных жанраў і кірункаў: беларуская песня (аўтарская і народная), шлягеры савецкай эпохі, вакал джазавы і блюзавы.

Заўсёды з павагай стаўлюся да канцэртых праграм, дзе ярка і адметна прадстаўленыя творы беларускіх кампазітараў і паэтаў. Згаданая праграма тым і прываблівала. У ёй прагучалі песні Ігара Паліводы, Дзмітрыя Далгалёва, Алены Атрашкевіч на вершы Максіма Багдановіча, Сяргея Грахоўскага, Васіля Жуковіча, Валянціны Паліканінай, а таксама кампазіцыі з рэпертуару ансамбля "Песняры". У першай палове канцэрта пераважалі творы нацыянальных аўтараў і беларуская мова, у другой — англамоўныя кампазіцыі, блізкія сучаснай моладзі, і джазавы вакал.

Тэатралізацыі праграмы і больш яркаму ўспрыманню эстрадных нумароў спрыялі ўдзел у канцэрце навучэнцаў харэаграфічнага аддзялення каледжа, узорнай студыі "Спяваем разам" з Маладзечна, а таксама Біг-бэнда Салігорскай дзіцячай школы мастацтваў.

Запомніліся пранікнёнае і прачулае выкананне Галіны Клабуковай, лаўрэта міжнародных конкурсаў (у песнях "Адлятала птушка" і "Балада аб маці") і Шаміль Мамедаў, які сваім выступленнем нагадаў пра лепшых спевакоў савецкага часу, іх высакародную і эмацыйна-стрыманую манеру (у вакальным творы "Несупадзенне"). А таксама — артыстычная Таццяна Сямко ў нечаканай і стыльнай песні "Парыжскі верабей" (музыка А. Атрашкевіч, словы А. Душачкіна-Клімава)...

На маю думку, аналагічныя канцэрты адлюстроўваюць, як мінімум, дзве акалічнасці. Па-першае, ступень сур'ёзнасці падрыхтоўкі будучых артыстаў, іх захопленасць прафесіяй. І па-другое, наяўнасць або адсутнасць дальнабачнасці і мудрасці ў выкладчыкаў. Апошняя якасць, думаю, заключаецца ў не тым, каб не дэманстраваць уласныя таленты (праз сваіх вучняў і выхаванцаў), а ў тым, каб клапаціцца і дбаць пра іх творчае і артыстычнае развіццё. Паступова ўскладняць задачы, дакладна адчуваць, хто на пэўным этапе свайго развіцця задачу якой складанасці можа адолець. Навучыць на эстрадзе мастацкаму густу (а гэта, паверце, — ці не адна з найбольш складаных праблем песеннага выканальніцтва) можна толькі на прыкладах і ўзорах песень сапраўды густоўных і змястоўных. Калі прытым бездакорны мастацкі густ маюць і самі выкладчыкі. Відавочна, з гэтым на эстрадным аддзяленні ўсё ў парадку...

Таццяна МУШЫНСКАЯ

Фота Ігара Кузняцова

У пошуках культурнага сумоўя

Ужо традыцыйнымі ў сучасным культурным жыцці літоўскага і беларускага народаў сталі творчыя сустрэчы пісьменнікаў, перакладчыкаў і навукоўцаў, якія збіраюцца не толькі для таго, каб падзяліцца ўласным досведам, прадставіць набыткі ў духоўнай культуры сваіх народаў, але перш за ўсё для развіцця творчага супрацоўніцтва паміж нашчадкамі Вялікага княства Літоўскага.

Мерыдыяны лучнасці

17 чэрвеня ў Пасольстве Літоўскай Рэспублікі ў Мінску адбылася чарговая сустрэча прадстаўнікоў літоўскай і беларускай інтэлігенцыі, прысвечаная абмеркаванню найбольш праблемных момантаў гэтага супрацоўніцтва. Сустрэча прайшла ў форме вольнай дыскусіі і завяршылася чытаннем паэтычных твораў і іх перасварэнняў на іншай мове, якія прагучалі з вуснаў саміх аўтараў і перакладчыкаў. Адкрыла сустрэчу трэці сакратар Амбасады Літоўскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь спадарыня Эгле Норвайшэне, якая адзначыла актуальнасць культурных сувязяў паміж Літвой і Беларуссю ў сучасны момант. Важнасць літоўска-беларускіх культурных стасункаў падкрэсліў таксама саветнік-пасланнік амбасады Дарыюс Віткаўскас.

Сярод гасцей з літоўскага боку ў сустрэчы прыняло ўдзел шэсць творцаў і навукоўцаў, у тым ліку прадстаўнік выдавецтва «Homo liber» Віліус Гужаускіс. Трое з удзельнікаў гэтай групы — вядомы навуковец Альма Лапінскене, паэт Владас Бразюнас і пісьменніца Бірута Янушкайтэ — з'яўляюцца сябрамі Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў (МАБ). У пэўнай ступені гэта прадвызначыла кола праблем, узнятых падчас дыскусіі, таму што з беларускага боку на сустрэчы прысутнічалі паэт Алесь Разанаў, старшыня МАБ Сяргей Запрудскі, старшыня Рэспубліканскага аддзялення гэтай арганізацыі Ірына Багдановіч, літаратуразнаўцы-медыявісты Уладзімір Караткі і Жана Некрашэвіч-Караткая.

Адкрываючы сустрэчу, літаратуразнаўца і перакладчыца Альма Лапінскене звярнула ўвагу слухачоў на перадгісторыю гэтага творчага сходу: «Першапачаткова мэта прыезду ў Мінск бачылася нам у тым, каб прадставіць вынікі працы, якую мы ажыццяўляем на карысць творчага збліжэння з Беларуссю, арганізаваць выставу і прэзентацыю новых выданняў, якія датычацца нашага супрацоўніцтва. Пасля ж вырашылі проста абмяркоўваць канкрэтныя праблемы, якія паўстаюць на гэтым шляху». Працягваючы думку Альмы Лапінскене, Владас Бразюнас, які таксама вельмі актыўна займаецца перакладам сучаснай беларускай паэзіі на літоўскую мову, падкрэсліў, што галоўная ўмова развіцця ўзаемаперакладу ў нашых літаратурах — арганізацыя міжнародных творчых мерапрыемстваў, якія б дамапагалі пазнаёміцца не толькі з творчасцю канкрэтнага аўтара, але і з яго асобаю: «Акрамя чытання паэзіі, вельмі важна чуць голас самога паэта, яго манеру дэкламавання, каб больш дакладна ўлавіць тыя сэнсавыя нюансы, якія знаходзяцца ў падтэксце. Лёгка заўважыць, што на гэтай сустрэчы сабраліся прадстаўнікі большасці земляў Вялікага княства Літоўскага. Цяпер жа мы маем адзінае княства паэзіі. І таму хацелася б часцей ладзіць сумесныя творчыя праекты». Адным з такіх праектаў, як адзначыў В. Бразюнас, з'яўляецца серыя дзвюхмоўных кніг «Magnus. Ducatus. Poesios». Падобны характар мае таксама дзвюхмоўная анталогія сучаснай беларускай паэзіі «Святло ў вокнах» («Sviesa languose»), выдадзеная ў Вільні ў 2008 г. Істотную частку перакладаў на літоўскую мову ў гэтай анталогіі ажыццявілі, між іншым, Альма Лапінскене і Владас Бразюнас. Падчас свайго выступлення В. Бразюнас паведаміў таксама пра паэтычныя злёты, якія маюць адбыцца ў верасні гэтага года ў Мінску і Вільні.

Пра міжнародныя мерапрыемствах, якія ладзіліся раней сумесна з беларускімі і літоўскімі творцамі, сціслa распавяла намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Літвы Бірута Янушкайтэ: «Упершыню ідэя правядзення мастацка-паэтычных пленэраў узнікла ў 2007 годзе. У літоўскі горад Ніда з'ехалася па пяць літаратараў з Беларусі, Польшчы і Літвы. На працягу некалькіх дзён яны павінны былі перакласці па некалькі вершаў паэта з кожнай краіны. У пленэры ўдзельнічалі таксама мастакі, якія адпаведна мелі сваё заданне». Вынікам праведзенага пленэру было выданне надзвычай прыгожага трохмоўнага альманаха прац беларускіх, польскіх і літоўскіх паэтаў і мастакоў пад назваю «Словы і колеры» (2008 г.). Як падкрэсліла спадарыня Бірута, «такія пленэры вельмі спрыяюць пашырэнню асабістых сувязяў паміж творцамі з розных народаў, становяцца штуршком для далейшых кантактаў і сумеснай арганізацыі падобных мерапрыемстваў у будучым». Падчас наступнага пленэру, які праводзіўся ў Друскенікаў у 2008 г., да былых краін-удзельнікаў далучылася Украіна. А чарговы — чатырохмоўны — альманах «У каралеўскіх далонях» дапоўнены музычным дыскам з песнямі на словы змешчаных у кнізе паэтычных твораў. Б. Янушкайтэ адзначыла, што сёлета плануецца правядзенне падобнага пленэру ў Паланзе, і да ўдзелу ў ім будуць запрошаныя прадстаўнікі новых краін.

Міні-прэзентацыю іншых выданняў шматмоўнай літаратуры і ўзаемаперакладаў літоўскіх і беларускіх аўтараў працягнулі мовазнаўцы з Інстытута літоўскай мовы Надзея Марозава і Галіна Мішкенене, якія даследуюць разнамоўнае пісьменства Вялікага Княства Літоўскага. «Істотна тое, — падкрэсліла Н. Марозава, — што паміж літоўскімі і беларускімі навукоўцамі існуе праблема абмену навуковай літаратурай і знаёмства з новым культурным набыткам краіны-суседа». У сваю чаргу А. Лапінскене дадала, што гэтая праблема, як і праца над узаемаперакладам, ускладняецца адсутнасцю літоўска-беларускага і беларуска-літоўскага слоўніка і неабходнасцю карыстацца пры гэтым трэцяю моваю-пасрэднікам, у дадзеным выпадку — рускаю. Безумоўна, на запаўненне такога прагалу спатрэбяцца гады напружанай спецыялізаванай працы. У сувязі з гэтым падчас сустрэчы было ўзнята пытанне аб магчымасці адкрыцця літуаністыкі як спецыялізацыі на філалагічных факультэтах ВНУ ў нашай краіне і перш за ўсё ў БДУ.

Відавочна, моўная праблема не з'яўляецца адзінаю на шляху супрацоўніцтва літоўскай і беларускай інтэлігенцыі. Ёсць шэраг пытанняў навуковага характару, якія патрабуюць сур'ёзнага даследавання і ўнёску абодвух народаў. Гэтую тэму закранула ў сваім выступленні літаратуразнаўца і паэт Ірына Багдановіч. Яна прапанавала ідэю арганізацыі беларуска-літоўскіх навуковых канферэнцый, дзе будуць мець актуальнасць прынамсі тры праблемныя блокі: па-першае, культурнае жыццё літоўскага і беларускага народаў у складзе ВКЛ; па-другое, паняцце літвінскасці і яго суадносіны з беларускасцю ў XIX — пачатку XX ст., гістарычны і культурны лёс абодвух народаў у гэты перыяд; па-трэцяе, лёс і супрацоўніцтва Беларусі і Літвы ў сучаснасці. Даследчык гісторыі беларускай мовы Сяргей Запрудскі прапанаваў частковае вырашэнне пытання аб навуковым супрацоўніцтве беларускага і літоўскага народаў у межах V Міжнароднага кангрэса беларусістаў, які плануецца ў маі 2010 года. Уладзімір Караткі, даследчык гісторыі беларускай літаратуры, у сваіх разважаннях пра культурны лёс абодвух народаў і пра неабходнасць навуковага супрацоўніцтва пацвердзіў, што на сучасным этапе «беларусы і літоўцы, нарэшце, могуць чытаць гісторыю аднымі вачыма», таму ўзнікае заканамернае пытанне аб адзінай тэрміналогіі ў галіне гісторыі культуры, а што датычыць літаратуразнаўства, то ўжо даўно наспела пытанне аб стварэнні агульнай дзвюхмоўнай анталогіі, якая ўтрымлівала б найкаштоўнейшыя пярлінкі славеснага мастацтва ВКЛ.

Напрыканцы гэтай творчай дыскусіі Алесь Разанаў, працягваючы развагі над праблемаю вывучэння і актуалізацыі нашай агульнай з літоўскім народам спадчыны, нібы падагульніў сказанае вышэй: «У спадчыне ёсць дзве каардынаты — даўно мінулае і сучаснасць. Без гэтага спадчыны няма. Магутны патэнцыял, закладзены ў мастацкіх творах нашых старажытных продкаў, застаецца мёртвым без новага прачытання. А ён жа закранае праблемы, якія непасрэдна датычацца і сучаснага свету». Як адзначыў паэт, менавіта гэтыя меркаванні сталі штуршком для стварэння яго паэтычнай кнігі «Узнаўленні», дзе па-мастацку вырашаецца задача сучаснай інтэрпрэтацыі нашай старажытнай літаратурнай спадчыны.

Як бачым, сёння культура беларусаў адчувае асаблівую патрэбу ў сумоўі з яе духоўнымі пабрацімамі, якое ў сваю чаргу дазволіць весці глыбокі і грунтоўны дыялог паміж гісторыяй і сучаснасцю, ператвараць наш супольны з іншымі нацыямі духоўны патэнцыял у надзейную крыніцу самапазнання і творчага развіцця, што так важна ў сітуацыі, калі сённяшняй постмадэрновай культурай ставіцца пад сумненне сам факт творчасці і магчымасці пазнання чагосьці новага.

Ганна СЕРЭХАН

На здымку: падчас сустрэчы.

Міф пра 25-ы кадр

З пошты "ЛіМа"

Святлана Берасцень у артыкуле "Дайце дваццаць пяты кадр!" ("ЛіМ" за 22.05.09) піша: "Гледзячы на экран, мы свядома ўспрымаем 24 кадры за секунду — менавіта з такой хуткасцю рухаецца кінастужка. Таму калі пры мантажы фільма пасля кожнага 24-га кадра ўстаўляць дадатковы 25-ы кадр з пэўным тэкстам, дык ён будзе ўспрымацца намі ўжо на ўзроўні падсвядомасці. Ніякіх дадатковых карцінак мы не ўбачым, адна "прыхаваная" у дваццаць пятым кадры ключавая інфармацыя трапіць на-пасткі ў нашу памяць і трывала прапішацца ў ёй..." Аб праслаўтым "25-м кадры" чую амаль паўстагоддзя — з пачатку 1960-х гадоў, калі "Неделя", штотыднёвы дадатак да газеты "Известия", надрукавала артыкул на гэтую тэму.

Апісанне эфекту 25-га кадра было прыблізна такое ж, як вышэй, і прыводзіўся прыклад, што пасля фільма, дзе 25-ы кадр рэкламаваў "паветраную кукурузу" (папкорн), гледачы больш купляліі гэтай кукурузы. Такое апісанне адразу здалося недарэчным. Не можа трапіць у падсвядомасць рэклама з кадра, які мільгае так хутка, што вока не паспявае яе ўбачыць: вядома, што ў падсвядомасць, як і ў свядомасць, трапляе толькі тое, што прайшло ў мозг праз органы пачуццяў, у дадзеным выпадку — праз зрок. Таму я напісаў у "Неделю" пра немагчымасць існавання гэтага "эфекту" у тым выглядзе, у якім ён прадстаўлены ў газеце, і прасіў удакладніць апісанне механізму дзеяння "эфекту". Адказу я не атрымаў.

Пасля гэтага яшчэ некалькі разоў чытаў у прэсе артыкулы пра "25-ы кадр" (згадак пра яго было, мабыць, некалькі соцень), але ні разу не сустрэлася прыймальнага тлумачэння механізму "эфекту", тым больш што артыкулы былі не навуковыя, а папулярызатарскія. Амаль кожны раз я прасіў удакладніць, якім чынам інфармацыя з "25-га кадра" трапляе ў мозг, абмінуўшы зрок, або надрукаваць мой ліст аб тым, што такі "эфект" немагчымы. Апошні раз мой зварот быў у мінскую газету "Частная собственность" у 1990-х гадах (цяпер яна ўжо не выдаецца), але газета, як і ўсе папярэднія выданні, не надрукавала майго ліста або дадатковага тлумачэння. Тое, што не ўдалося за столькі гадоў апублікаваць скептычны погляд адносна "25-га кадра", сведчыць, па-мойму, пра адно: аддаючы перавагу домыслам перад цвярозымі ацэнкамі, у прэсе блытаюць журналістыку з пісьменніцтвам, хоць розніца ііж імі прынцыповая: пісьменнік стварае выдуманы свет, а журналіст прытрымліваецца фактаў і не можа выдаваць домысел за праўду.

У тыя ж 90-я гады газета "КП Белоруссии" змясціла рэкламу касет для вывучэння англійскай мовы з выкарыстаннем "25-га кадра" (так нібыта вывучалі замежныя мовы ў сістэме КДБ СССР). Я звярнуўся па названым у рэкламе адрасе з просьбай даць мне магчымасць убачыць, што ў касеце сапраўды ёсць 25-ы кадр, паколькі жадаю купіць касету, але ходзяць чуткі, што "25-ы кадр" — гэта падман. Маю просьбу доўга абмяркоўвалі і потым адмовілі мне ў яе задавальненні, спаслаўшыся на нейкія тэхнічныя цяжкасці. Мая ўпэўненасць, што "25-ы кадр" — гэта міф, яшчэ больш узмацнілася.

Неаднаразова я шукаў у энцыклапедыях і слоўніках артыкулы пра "25-ы кадр", у падручніках — хаця б згадку аб выкарыстанні "эфекту" пры вывучэнні замежных моў. І нічога мне не траплялася. А калі б эфект сапраўды існаваў, то нешта пра яго ў сур'ёзных кнігах сустрэў бы за гэтыя дзесяцігоддзі нават выпадкова, без пошукаў. З'явіліся б ужо і кнігі — тэрмін дастатковы. А пасля артыкула ў "ЛіМе" зазірнуў у Інтэрнет, карыстацца якім раней не меў магчымасці, дый жадання, паколькі чуў, што дакладнасць звестак у ім ніхто не можа гарантаваць. Але ўсё ж прывяду некаторыя з іх.

У 1957 годзе амерыканец Джэймс Вайкеры заявіў, што ён правёў у кінатэатры (штат Нью-Джэрсі) эксперымент са "схаванай рэкламай" на "25-м кадры". Гэта выклікала цікавасць, і Вайкеры прапанавалі паўтарыць эксперымент. Але ён скончыўся беспаспяхова. Тады ад яго патрабавалі прадаставіць звесткі і апісанне яго нібыта паспяховага эксперыменту, аднак ён адмовіўся гэта зрабіць. Дырэктар кінатэатра, у якім нібыта праводзіўся эксперымент 1957 года, заявіў, што ніколі не чуў, што ў ягоным кінатэатры праводзіўся нейкі эксперымент. Амерыканская псіхалагічная асацыяцыя ў 1958 годзе афіцыйна абвергла наяўнасць псіхалагічнага эфекту "25-га кадра". Нарэшце ў 1962 годзе сам Вайкеры прызнаўся, што эксперымэнт 1957 года і ўся ягоная статыстыка былі ім сфабрыкаваныя. З гэтага вынікае, што псеўдасенсацыя аб эфекце "25-га кадра" трапіла да нас ужо пасля яе абвяржэння на яе радзіме, у ЗША, і тым не менш амаль паўстагоддзя доўжыцца яе трыумфальнае шэсце па прасторах раней СССР, а цяпер — СНД. На мінскай тэлевізіі ёсць нават перадача "25-ы кадр" (дабаўка да маскоўскага канала "ТДК. Медыясетка..."), дзе гаворка ідзе пра рэпертуар беларускіх кінатэатраў, а зусім не пра існуючы кадр, г. зн. з'явілася мода на гэты самы "25-ы кадр" (!).

А. ІВАНЧАНКА

Артыкул "Шэсць прычын не любіць крытыкаў" Жанны Капусты падаўся мне даволі статычным і ўмоўным. Для высноў аўтару не хапае вопыту і практыкі, звязаных з адкрыццямі ў літаратуразнаўстве. Праўда, у логіцы адчуваецца добрая школа. Мне, як шараговаму чытачу, падалося нават дзіўным рабіць такія абагульненні: любіць ці не любіць крытыкаў. Аказваецца гэта своеасаблівае нагадванне пісьменніку, як пазбегнуць нелюбові крытыка. Праўда, крытык сціпла прамоўчвае, што яна таксама творца, і здольная асабіста адчуць асалоду ад адкрыцця новай пісьменніцкай зоркі.

Ад нянавісці да ўзаемаразумення

"Шэсць прычын..." маюць добрую аснову: у іх шмат спасылак на практыку разгляду твораў, а таксама рэагаванні аўтараў на крытыку. Усё гэта патрабуе аб'ектыўнасці, справядлівасці і доказу, найперш, для аўтара і, вядома, шырокага кола зацікаўленых чытачоў. Ці кіруецца гэтым у сваім артыкуле Капуста? Па-мойму — не. Паразважаем.

Пісьменнік абсалютызуе мастацкую задуму. Калі ён, ствараючы мастацкае палатно, займаецца толькі гэтым, крытык мае прычыну для "сваркі" з крытыкам.

Вядома, што твор павінен адпавядаць эстэтычным крытэрыям. Прызнаюся, што не чытаў яшчэ антыэстэтычнай літаратуры (мо якая парнаграфія). Бо можа, твор выдатны, а вось персанальна крытыку не па гусце. І яшчэ: крытык у сваёй спасылцы адмаўляе ў прызнанні твору літаратурнай каштоўнасці нават пры цудоўнай ідэі і высакародных галоўных героях. Чаму? Са школы вядома, што ідэя выцякае са зместу, героі прыкмячаюцца, калі яны жывыя, яркія, а без гэтага пра такі твор і гаворкі няма...

Досыць дзіўна, што Жанна Капуста ва ўсіх сваіх "прычынах" выбудоўвае пазіцыю крытыка з ухілам на глыбокі аналіз твора, дзе ўзважваецца кожны яго элемент-складнік, і пры гэтым спасылаецца на нейкія нетыповыя прыклады, на нейкіх наіўных пачаткоўцаў у літаратуры, кар'ерыстаў, якія прагнуць, каб іх заўважалі, хвалілі...

Дзе можна ўбачыць такога дзіваказаіка, які б свой твор толькі сыходзячы з патрыятычнай ідэі лічыў бы высокамастацкім?! Можа, толькі які кан'юнктуршчык.

"Пісьменнік чакае пахвалы", а чаму — не? У "прычынах" гэта не патлумачана. "Пісьменнік настолькі перакананы ў сваёй таленавітасці, што з вялікай цяжкасцю дапускае думку", што яго твор можа не спадабацца. Думаю, што такіх многа. "Святая наіўнасць", — скажа ці падумае аўтар артыкула. Мо і "святая", але ж, па-мойму, калі такія праявы сённяшняй літаратуры заўважныя, то, прабачце, гэта недавыхаванне ваша — крытыкі. Вы адукаваныя, дасведчаныя і начытаныя і вашыя рэцэнзіі, агляды і артыкулы прымаюцца, як кажуць, на веру. Але вы і не вышэйшы суд.

Хоць, вядома, крытыка патрэбная. Узаемаадносіны пісьменніка і крытыка, на мой погляд, гэта як судовы працэс, дзе ўсё даследуецца, даказваецца, пацвярджаецца, каб *прысуд* урэшце выносіўся без парушэнняў "закону". Крытыка фармуе літаратуру, калі яна яе ведае і правільна ацэньвае, а таксама вучыць пісьменніка заўважаць тое, чаго ён не бачыць. Вядома, у межах этыкі і этыкету. Ад крытыка залежыць, каб літаратурны талент засвяціўся. Але "дзякуючы" неаб'ектыўнай крытыцы шмат і загублених надзей нашай літаратуры. У канцы свайго артыкула аўтар зазначае: "Ёсць магчымасць дыялога. Пытанне ў тым, ці ёсць у гэтым зацікаўленасць". Зацікаўленасць заўсёды была і ёсць. Яе і арганізуе сама крытыка, калі яна не скочваецца да бытавых і выпадковых заўваг ды інсінуацый, аддаленых ад самой мастацкай літаратуры.

Мікола ДУБОЎСКІ

Як і каму пісаць?

Рэдакцыя "ЛіМа" ўразіла мяне артыкуламі аб адносінах паміж аўтарамі і крытыкамі. І, калі з аўтарам артыкула "Шэсць прычын не любіць крытыка" (Жанна Капуста) я цалкам салідарны, то другі артыкул "Каго ўзносіць Праметэеў дух?" (Мікола Бусько) уражвае процілеглымі адносінамі да аўтара і, найперш, да яго меркаванняў. Атрымліваецца, што крытыкі маюць права ў сваіх ацэнках і падыходах да творчасці аўтараў карыстацца падвойнымі стандартамі. Ці можа, такая думка ўзнікла толькі з таго, што за крытыку бяруцца не прафесіяналы ў гэтай справе, ці крытыку выкарыстоўваюць з іншымі мэтамі?

М. Бусько аналізуе твор, як зборнік вершаў, наўмысна не заўважаючы, што гэта вершаваны аповед у выглядзе дзённіка лірычнага героя, дзе кожны верш (дакладней — дзень) мае лагічную сувязь з іншымі, мае сувязь з сюжэтам твора. Таму эпітэты, таксама як і апісанне бэзу аўтар падае так, як патрабуе сюжэт, а не фантазія чалавека, які ўрыўкамі чытае кніжачку. Не сакрэт, што ў кнізе нараўне з вершамі маецца і рыфмаваная проза, без якой у дадзеным выпадку нельга абысціся.

Яшчэ больш уражвае прэамбула артыкула. Аўтар зборніка вершаў "Пад зоркай Мілавіцай" дамовіўся з крытыкам аб сяброўскай сустрэчы, каб паказаць яму свае творы. Тым больш, адзін і другі жывуць у адным гарадку, і не раз сустракаліся ў творчым асяродку.

М. Бусько даўно ўжо займаецца літаратурнай творчасцю, выдаў 5 кніг у дзяржаўных выдавецтвах, з іх апошнія тры — для дзяцей. А вось паэт Алесь Корнеў выдае творы за свой кошт невялікім накладам і ў продаж іх не аддае, бо чакае сустрэчы з больш вопытным стваральнікам твораў, каб скарыстаць яго парады і добрыя пажаданні. Тым больш паэт Бусько, прачытаўшы кнігі Корнева, паабяцаў напісаць аб'ектыўны водгук. Ды дзе там! Замест "творчай буські" — знішчальны крытычны артыкул! Чытаў яго і я. Але дзе ж грунтоўны аналіз кніжачкі, дзе сяброўскія парады? Бусько выкарыстоўвае стары савецкі падыход: аналізуецца не столькі твор, колькі яго аўтар. Гэта ж трэба, пенсіянер узяўся пісаць! Прынёс ажно дзве кніжкі. Ды яшчэ піша пра каханне ў такім узросце. Сам крытык, як відаць, даўно ўжо адцураўся ад такіх якасцей і стаў пісаць вершы для дзяцей. Тады, зыходзячы з логікі М.Бусько, трэба падняць пытанне ці варта пісаць вершы для дзяцей у пенсійным узросце?

А горш за ўсё крытыка ўстрывожыла тое, што слабы ў творчым плане аўтар кніжачкі "Пад зоркай Мілавіцай" яшчэ і мроіць стаць паэтам, "спадзяецца здабыць (сваімі працамі) права на прапіску ў паэзіі". Ніколі гэтаму не быць! Трэба наскрэбці як мага больш "блох" у ягоных тэкстах! Бо ў нас даўно ўсталявалася правіла: мае рацыю той, каму дазволена біць.

Вось які вынік выцякае з гэтага артыкула. І таму пытанне ў загалоўку артыкула ("Каго ўзносіць Праметэеў дух?") можна зняць, бо стала ясна, што Праметэеў дух надта ўжо высока ўзносіць народжанага "крытыка".

А кніжка Алеся Корнева "Пад зоркай Мілавіцай", калі не ўсім, то многім у нас падабаецца, асабліва тым, хто яе чытаў удумліва і без папярэдняй прадузятасці.

Так што я вельмі ўдзячны спадарыне Ж. Капусце і рэдкалегіі газеты за прапанову прымаць удзел і чытачам у аналізе літаратурнай творчасці, чым я і скарыстаўся ў дадзеным выпадку.

Віктар СЫРЫЦА

г. Баранавічы

P.S. Рэдакцыя друкуе гэты матэрыял з павагай да меркаванняў аўтара, але не падзяляючы іх.

Забаўляць і няньчыць

Пра сучаснага чытача і, у прыватнасці, чытача сучаснай беларускай літаратуры амаль ніколі не пішуць. І ён сам не так часта ўмешваецца ў інтымны (хаця і публічны) дыялог паміж аўтарам твора і яго рэцэнзентам...

Ж. КАПУСТА

Стасункі паміж крытыкам і пісьменнікам захапляюць, як разборкі каханкаў.

Найбольшае захапленне атрымліваеш, калі згадваеш чытача — пікантны трэці элемент, без якога ўсе лятучыя талеркі так і заставаліся б на літаратурнай кухні. У любоўным трохкутніку пісьменнік-крытык-чытач апошняму адводзіцца пасіўная (і самая вычварэнска-юрлівая) роля сузіральніка, а часам — незаконнага каханка, які сочыць за літаратурным карнавалам замкнёны ў цёмнай шафе.

Што гэта за ідэальны чытач, на якога ўсе арыентуюцца, што за умбэртаэкаўскі носьбіт унутранай энцыклапедыі? Абстрактнае футра панятку "чытач" прыкрывае: пісьменнікаў і іх блізкіх, крытыкаў і іх блізкіх, студэнтаў-філолагаў і студэнтаў-журналістаў у час пошукаў месца для практыкі / матэрыялу для дыплома, з тузін філосафаў і культуролагаў, этнамолага (для калекцыі) і незлічона аднарогаў — пра якіх усе чулі, але ніхто не бачыў. Вось каб кожнага пакупніка "ЛіМа" ў шапіку кальцавалі, а потым спецыяльным прыборам фіксавалі, колькі часу і на якой старонцы заставаліся чытацкія вочы, пры гэтым замяралі ўзровень эндарфіну ў крыві, каб пабачыць, які артыкул выклікаў найбольшае задавальненне — было б зразумела, нашто ствараць тэкст (калі забыцца на такую драбязу, як развіццё літаратуры ці — гора вам, творцы! — звядзенне асабістых рахункаў). Можна абысціся і без фантастыкі: сачыць за аўдыторыяй блогаў крытыкаў і літаратараў. Хай сабе да Інтэрнету далучаны далёка не кожны аматар літаратуры, але тых, хто рэгулярна бывае ў сеціве, можна палічыць, апытаць, уцягнуць у інтэрактыўную гульню ці справакаваць абмеркаванне — і, вывучыўшы густы, прыстасавацца да іх. Тут, аднак, выяўляецца, што вымкнуты з багатага гаспадарчага футра аднарог выглядае зусім непрывабна — шчупленькі такі, бледнаскуры, у літаратуры не разбіраецца, любіць тых, хто пра сябе грамчэй заявіць і горкім яблыкам разладу вабіць. Што рабіць крытыку, як не даць бедаку хлеба й відовішч? Вось і пачынаецца наноў згаданае шпурлянне талерак і высвятленне стасункаў, падчас якога кантрабандай правозяцца веды пра літаратуру і ўпотайкі вядзецца выхаванне густаў.

У іншай культурнай сітуацыі крытыкі прыкладалі б усе намаганні, каб спакойна займацца ўлюбёнай справай — аналізаваць творы, не асабліва слухаючы абураныя ці ўхвальныя рэплікі пісьменнікаў. У сітуацыі канкурэнцыі з экраннай культурай часткаю працы становіцца стварэнне рэзанансу вакол вартых мастацкіх твораў праз скандал як сродак прыцягнення ўвагі. Праблема нашага літаратурнага серыялу ў тым, што пра яго мала хто ведае — ні табе ролікаў па тэлебачанні ў прайм-тайме (пісьменнік Х дае па пысе зарваўшамуся крытыку У), ні бігбордаў па краіне (а ты прачытаў блог крытыка Z?), ні выяваў крытычнага накдаўну на запалках. Забаўленне ідзе поўным ходам: агаляюцца літаратары, разварочваюць бялізну асабістых стасункаў крытыкі — а ніхто не глядзіць! Крыўдна і смешна, фінал — назідальны: "дзеўчына пела ў шыкоўным бары / танчыла і абдымала шост <...> дзеўчына проста шукала пары / не ацанілі / і з гэтых пор / кожнага ранку ходзіць на пары / і рэгулярна ў царкоўны хор" (А. Хадановіч, "Пост"). Нічога, падрастае новая плеяда таленавітых менеджэраў культуры, пазбавіць цнатлівасці самотны літпрацэс, дачакаемся — пачнуць пра беларускую літаратуру і ў электрычках гаварыць, і на кірмашы, мо што і прачытаюць, суседцы парають (а гэны ж той, Х, што па пысе У з'ездзіў, ага, ну, той самы, кучаравенькі), заверціцца кола, павялічацца накклады, будуць у выдавецтваў сродкі і на тое, каб неакупляльныя праекты запускаць... Так што крытыцы забаўляць і яшчэ забаўляць — чым больш цырку на дроце, тым для літаратуры лепш.

Каб крытыкі з літаратарамі ў забаўляльным запале не перабілі адно аднаго, варта чаргаваць аплявухі з няньчаннем. Так, крытыкі мусяць перыядычна нагадваць літаратарам, якія тыя разумныя, таленавітыя і самастойныя — хай сабе гэтыя калыханкі з мамчынага рэпертуару, затое наступным разам вузельчыкі будуць завязаныя ў чаканні новай порцыі пахвалы-пахлавы, а крытык-нянька вазьмі ды іншую добрую рысу адзнач. Тады надыдзе час паклапаціцца пра ўзровень цукру ў пісьменніцкай крыві, аддупцаваць дзеля прамоўшну і паставіць на гарох за няўцямнасць інтэртэксту.

Аля ШКЕВІЧ

Галоўны вынік таго адрэзку жыцця, які пражывае юбіляр, — гэта пераканаўчая самарэалізацыя па многіх прынцыпова важных пазіцыях. Святлана Яўгенаўна Куль-Сяльверстава, прафесар Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы, адбылася як буйны навукоўца, даўно і трывала займела рэпутацыю выкладчыка высокага ўзроўню, на працягу многіх гадоў з'яўляецца актыўным грамадскім дзеячам.

Патрыётка сваёй Айчыны

Увесь жыццёвы шлях і, зразумела, самарэалізацыя Святланы Яўгенаўны звязаны з горадам Гродна. Тут яна пачала свой жыццёвы шлях. Яшчэ ў школе ў дзяўчыны пераважала цікавасць да гісторыі і таму быў слушным яе выбар — гісторыка-педагагічны факультэт ГрДУ. Патрэбнасць у атрыманні грунтоўных ведаў задавальнялася наяўнасцю на факультэце моцнага прафесарска-выкладчыцкага складу, найбольш аўтарытэтнымі прадстаўнікамі якога былі Якаў Мараш, Барыс Клейн. На першым этапе яна з'яўлялася аспіранткай ГрДУ, а на другім і трэцім прадстаўляла яго выкладчыцкі корпус, прайшоўшы шлях ад асістэнта да прафесара. У 1996—1999 гг. яна часова адыходзіць ад непасрэдных выкладчыцкіх спраў і поўнасцю канцэнтруецца на напісанні доктарскай дысертацыі. Агульны назоўнік усіх пералічаных этапаў у навуковай кар'еры Святланы Яўгенаўны — распрацоўка грунтоўных праблем гісторыі айчыннай культуры сярэдзіны XVIII — сярэдзіны XIX стст. Менавіта па гэтым пытанні напісаны яе найбольш значныя працы, сфармулявана арыгінальная і ў той жа час пераканаўчая аўтарская канцэпцыя, якая накіравана на пераадольванне стэрэатыпаў, якія засталіся ў спадчыну ад савецкай гістарыяграфіі.

У гісторыка-культурных даследаваннях юбіляра заслугоўваюць быць адзначанымі наступныя моманты. Ажыццёўлена сістэмная рэканструкцыя культурных працэсаў на беларускіх землях у Новы час. Пераканаўча абгрунтавана наступная выснова: эпоха Новага часу "была часам карэннага пераўладкавання ўсіх бакоў культурнага жыцця на беларускіх землях. З'явы, якія назіраліся ў культуры і грамадстве — Асветніцтва, пачатак складвання сучасных этнасаў; дапаўняліся лёсаноснымі пераменамі ў палітычным жыцці рэгіёна — падзеламі Рэчы Паспалітай. Усё гэта прывяло да супярэчлівасці і складанасці гісторыка-культурнага працэсу."

Святлана Яўгенаўна ўпершыню прапанавала цывілізацыйнае вымярэнне культурных адрозненняў паміж захадам і ўсходам Беларусі ў Новы час."Падзел беларускіх земляў дзяржаўнай мяжой у 1772 г. меў не толькі палітычнае значэнне, гэта быў не толькі падзел на два рэгіёны — захад і ўсход Беларусі, гэта быў падзел на Захад і Усход у сэнсе цывілізацыйным.

Магілёўшчына і Віцебшчына, апынуўшыся ў складзе Расійскай імперыі, трапілі ў становішча далёкай правінцыі... З гэтага часу самаўладдзе становіцца наймацнейшым сістэмаўтваральным фактарам у жыцці беларускіх земляў. Цэнтралізацыя і рэгламентацыя культурнага і грамадскага жыцця, магутная ўлада бюракратыі, характэрная для імперыі, абумоўліваюць пачатак нівеліроўкі сацыякультурных асаблівасцяў рэгіёна.

Сацыякультурнае развіццё заходніх і цэнтральных земляў Беларусі развівалася па іншай мадэлі. Адсутнасць цэнтралізаванай дзяржавы, ярка акрэсленых супрацьлеглясцей паміж сталіцай і перыферыяй вызначылі поліцэнтрычнасць культурных працэсаў. Беларускія (літвінскія) землі не былі ў Рэчы Паспалітай на становішчы правінцыі. Яны ўтваралі дастаткова развіты рэгіён, са сваімі гісторыка-культурнымі традыцыямі, дзе было некалькі буйных культурных цэнтраў (Вільня, Гродна), магнацкіх сядзібаў, якія ў часы Асветніцтва сталі асяродкамі інтэнсіўнага культурнага жыцця (Нясвіж, Слонім)."

Святланай Яўгенаўнай упершыню даследавана літвінская культурная традыцыя ў кантэксце беларускай культуры сярэдзіны XVIII — сярэдзіны XIX стст.

Навукоўца і педагог надае таксама вялікую ўвагу выразнаму акрэсленню межаў спрадвечных беларускіх земляў, дэманструючы пры гэтым сур'ёзную здольнасць да ваенна-гістарычных даследаванняў. Невыпадкова яна абрана правадзейным членам Акадэміі ваенных навук Расійскай Федэрацыі.

Шэраг прац юбіляра прысвечаны зняццю праблемных комплексаў у галіне рэгіяналістыкі. У прафесара маюцца цікавыя працы па метадалогіі, методыцы мікрарэгіянальных даследаванняў. Святлана Яўгенаўна варта праявіла сябе ў плане арганізацыі і каардынацыі падобных даследаванняў. Аб гэтым, напрыклад, сведчаць яе кіраўніцтва лабараторыяй рэгіянальнай культуры ГрДУ, членства ў каардынацыйнай радзе па турызме Гродзенскага аблвыканкама, статус эксперта міжнародных праграм па развіцці турызму. Адзін з турыстычных праектаў, у якіх яна прымала чынны ўдзел як навуковец — аднаўленне Аўгустоўскага канала.

З сярэдзіны 1990-х гг. стала актыўна прасочвацца дачыненне С. Куль-Сяльверставай да паўнавартаснага навучальна-метадычнага забеспячэння дапаможных гістарычных дысцыплін. У гэтым плане заслугоўвае быць асабліва адзначаным яе вельмі ўдалы падручнік па беларускай палеаграфіі.

Прафесар сістэматычна займаецца выхаваннем студэнцкай і аспіранцкай моладзі. С. Куль-Сяльверстава пастаянна імкнецца да таго, каб яе выхаванцы сталі сапраўднымі патрыётамі Айчыны.

Міхаіл СТРАЛЕЦ

Верш — песня душы

Кожны чалавек, у пэўным сэнсе, — паэт, бо ўсе мы ўмеем вобразна, асацыятыўна мысліць, імправізаваць. Любы чалавек павінен чымсьці захапляцца, натхняцца, цешыць душу. Для мяне згаданым захапленнем з'яўляюцца вершы.

На адной з творчых сустрэч у Полацкім літсаюзе аматары паэтычнага слова давалі азначэнне вершу. З разнастайных меркаванняў сфармулявалася бясспрэчная выснова: верш — залатая думка ў залатой аблямоўцы; у ім схаваны і моц, і загадка, і лёс.

Шчыра кажучы, я не ўяўляю свайго жыцця без дасціпнага, жывога, паэтычнага слова. На нашай блакітнавокай Міёршчыне шмат выдатных паэтаў. Я не буду зараз пералічваць іх, бо баюся пакрыўдзіць таго, каго не ведаю, з творчасцю якога незнаёма. Я проста назаву імя паэта, добра вядомае нашым землякам, — Браніслаў Мароз. Калі мы чуем ці чытаем гэтае імя, то чакаем высокамастацкага, жывога, крыштальна-чыстага слова.

— Верш — песня душы, — мяркуе Б. Мароз, — сапраўдны паэт той, чые вершы пакладзены на музыку. Для мяне такім узорам з'яўляецца Адам Русак. У яго што ні верш, то песня. Хто не ведае знакамітую развітальную "Бывайце здаровы, жывіце багата..." ці лірычную "Толькі з табою мне хочацца жыць, толькі з табою...". Люблю Багдановічаву "Зорку Венеру", "Алесю" Куляшова.

Да дзевяці вершаў Б. Мароза напісана музыка. На свяце 350-годдзя нашага горада песню "Міёрскія зоры" на словы Б. Мароза выконвалі школьнікі райцэнтра. Песня "Вызваленне Міёр" гучала 9 мая з нагоды 50-годдзя вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дзякуючы словам да гэтай песні на творчай руцэ паэта цікае прыгожанькі гадзіннік.

Служыў Б. Мароз на Волхве пад Ноўгарадам. У арміі спрабаваў пісаць і дасылаць творы ў газету "Баявая трывога". Там зрабілі "разбор" яго вершаў. У іх, маўляў, многа беларускасці. Аднак, калі ўзнікла пытанне, каго паслаць вучыцца на ваеннага журналіста, адразу прапанавалі маладому вайскоўцу.

— Але каб паехаць вучыцца, трэба было быць кандыдатам у члены КПСС ці яе членам, — згадвае пісьменнік. — Я не быў ні тым, ні іншым. Палітычны аддзел паабяцаў мне даць рэкамендацыі. Далі вучыць статут партыі. Да канца службы заставалася ўсяго 3 месяцы. Я перадумаў вучыцца. Прыйшоў да зампаліта і катэгарычна адмовіўся.

Падчас службы ў арміі Б. Мароз удзельнічаў у падрыхтоўцы насценных газет. Выкрывалі вострым слоўцам гультаяватых вайскоўцаў, апісвалі стрэльбішчы ды іншыя армейскія падзеі.

Сем гадоў прысвячаў свае творы жыццю калгаса "Парыжская камуна". З-пад пяра Б. Мароза выйшла некалькі дзесяткаў "усхваленняў" і столькі ж "выкрыванняў". І ўсе з гумарам. А як жа без сатыры, і п'яніцы трапляюцца ў калгасе, і гультаі. А прачытаюць сатырычны верш, соромна стане, не заўважыш, як і выправяцца.

На радзіме, лічыць Б. Мароз, пішацца лепш. Шчаслівы той паэт, які нарадзіўся ў вёсцы, бо мае цесную сувязь з прыродай.

Нарадзіўся Б. Мароз у вёсцы Дубашынскі Двор (прыкладна за 3 кіламетры ад Міёр). Там быў панскі палац, капліца, парк, Асінаўскае возера. Многае дала сельская школа: займаліся апантана, пасля настаўніца адпускала пагуляць на гадзіну, набегаўшыся, малыя школьнікі зноў прыходзілі ў клас. Хлопцы, дзяўчаты апраналіся проста. Толькі калі пайшлі ў Міёрскую школу, сталі падзяляцца на гарадскіх і вясковых...

— Ці хапае аднаго таленту, каб быць паэтам? — пытаюся ў свайго субяседніка.

— Працытую класічны выраз: 99 працэнтаў працы і жадання і 1 працэнт таленту. Які б талент выдатны ні быў, трэба шмат працаваць, — упэўнены паэт.

Узоры паэтычных вяршынь для Б. Мароза — Купала, Багдановіч, Танк. З празаікаў любіць чытаць Мележа, Коласа.

Б. Мароз друкуецца шмат. Яго вершы і апавяданні, гумарэскі і байкі з'яўляюцца ў "Міёрскіх навінах", "Вожыку", "Віцебскім рабочым", "Знамя юности", "Браслаўскай звяздзе", часопісе "Маладосць", калектыўных зборніках.

Проза, на думку творцы, пішацца лягчэй, чым вершы:

— Я стараюся, каб у кожным маім апавяданні была інтрыга. Чытач не павінен ведаць, чым скончыцца твор, а "развязка" павінна быць ашаламляльнай.

Адпрацаваўшы больш паўстагоддзя механікам у раённым кінатэатры "Колас", зараз Б. Мароз знаходзіцца на заслужаным адпачынку. Цікавы паэт, любімы муж, руплівы бацька і дзядуля, дбайны гаспадар. Хочацца пажадаць яму шчаслівага жыцця і паэтычнага натхнення.

Алена БАСІКІРСКАЯ

Беларуска-балгарская сустрэча

У Інстытуце мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі адбылася сустрэча беларускіх навукоўцаў з балгарскімі паэтамі, перакладчыкамі Н. Вылчавым і А. Алекавай. Адкрываючы мерапрыемства, Г. Цыхун узгадаў, што беларуска-балгарскае супрацоўніцтва на культурна-літаратурнай ніве за час свайго існавання зведала як перыяды ўздыму, так і паступовага запавольвання актыўнасці. Аднак сёння, на думку даследчыка, ёсць усе падставы для таго, каб творчыя кантакты паміж "малымі" славянскімі народамі былі адроджаны і выйшлі на новы ўзровень развіцця.

Асаблівы эмацыйны тон сустрэчы задалі ўспаміны Н.Вылчава пра першае знаходжанне на беларускай зямлі ў 60-я гг. мінулага стагоддзя, якое падаравала яму сяброўства з пісьменнікамі-беларусамі, дало магчымасць увайсці ў свет блізкага па духу пісьменства. Неўзабаве пабачылі свет пераклады, дзякуючы якім балгарскія чытачы змаглі пазнаёміцца як з класічнай спадчынай беларускай літаратуры, прадстаўленай імёнамі Купалы, Коласа, так і з творамі Танка, Куляшова, а пазней — Янішчыц, Някляева, Законнікава ды іншых. Кранальныя словы прагучалі на адрас балгарскага перакладчыка А. Германава, які намагаўся перастварыць "Песню пра зубра" М. Гусоўскага, але, на жаль, лёс склаўся так, што завяршыць распачатую таварышам працу давялося Н. Вылчаву. Выдадзены ў 1998 годзе пераклад быў прыхільна сустрэты ў Балгарыі. Акрамя таго, дзякуючы яго намаганням, у апошні час на балгарскай мове загучалі паэмы "Тарас на Парнасе", "Бандароўна" Янкі Купалы, "Сымон-музыка" Якуба Коласа, вершы А. Вярцінскага, Н. Гілевіча, Г. Каржанеўскай, У. Карызны, А. Пісьмянкова, проза В. Быкава. Дзелячыся творчымі планамі з прысутнымі, Н. Вылчаў адзначыў, што на дадзеным этапе ён не толькі па-ранейшаму займаецца перакладамі, але і рыхтуе даследаванне, прысвечанае Г. Цамблаку.

А. Алекава прыняла актыўны ўдзел у дыскусіі, прысвечанай актуальным праблемам літаратуразнаўства. У прыватнасці, гаворка вялася аб пераспектывах развіцця беларуска-балгарскіх узаемасувязяў, закраналіся пытанні пра стан кнігавыдавецкай справы ў Балгарыі і ролі крытыкі ў сучасным балгарскім літаратурным працэсе. З беларускага боку ў абмеркаванні прынялі ўдзел У. Гніламёдаў, В. Жураўлёў, А. Ліс, М. Мікуліч ды іншыя. В. Куляшова адзначыла неабходнасць далейшай працы, скіраванай на пошук новых звестак, якія б дапоўнілі гісторыю беларуска-балгарскіх творчых кантактаў.

Закончылася сустрэча на высокай паэтычнай ноце. Па просьбе прысутных у аўтарскім выкананні на балгарскай мове прагучалі вершы А. Алекавай і творы беларускіх аўтараў у перакладзе Н. Вылчава.

Алена ВАЛЬЧУК

Першы двойчы Герой Савецкага Саюза

Выдатны ваенны лётчык Сяргей Іванавіч Грыцавец пражыў толькі трыццаць гадоў. Аднак вартасць кожнага чалавечага жыцця вызначаецца не колькасцю дзён, адпушчаных лёсам, а значнасцю спраў, напоўненасцю і акрыленасцю імкненняў. У гэтым сэнсе маёр С. Грыцавец — сапраўдны прыклад мужнасці, адвагі, душэўнай стойкасці, прыклад таго, як павінен жыць чалавек.

Сын селяніна, народжаны 6 ліпеня 1909 года ў вёсцы Бараўцы, што непадалёку ад Баранавіч, ён пасля заканчэння сямігодкі працаваў слесарам на Златаустаўскім механічным заводзе (сям'я Грыцаўцоў у 1915 г. выехала з Беларусі на Урал). У 1932 г. скончыў Арэнбургскую ваенную школу лётчыкаў, а ў 1936 г. — Адэскую школу паветранага бою. Мужнасць С. Грыцаўца, яго арганізатарскія здольнасці, высокае лётнае майстэрства асабліва поўна раскрыліся ў час баёў у Іспаніі. Тут ён збіў трыццаць фашысцкіх самалётаў, у тым ліку сем за адзін дзень. За выкананне спецыяльнага задання ўрада і інтэрнацыянальнага абавязку старшы лейтэнант С. Грыцавец быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. У 1939 г. С. Грыцавец змагаўся супраць японскіх войск на рацэ Халхін-Гол у Манголіі, дзе збіў 12 самалётаў. На Халхін-Голе здзейсніў бяспрыкладны ў авіяцыі подзвіг. У адным з баёў быў збіты камандзір 70-га знішчальнага палка. З парашутам ён выкінуўся і трапіў у размяшчэнне праціўніка. С. Грыцавец прызямліўся побач, узяў камандзіра ў свой аднамесны самалёт і на вачах у ворагаў узняўся ў паветра. За гэта адважнаму лётчыку было ў другі раз прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. З верасня 1939 г. С. Грыцавец стаў камандзірам знішчальнага авіяпалка. Загінуў Сяргей Іванавіч 16 верасня 1939 г. у авіякатастрофе каля в. Балбасава Аршанскага раёна, але вечна жыве памяць аб ім. У Мінску, Оршы, Баранавічах, Балбасаве, в. Моўчадзь Баранавіцкага раёна ўстаноўлены помнікі С. Грыцаўцу. Яго імем названы вуліцы ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, Мінску, Оршы, Баранавічах, Ганцавічах, а таксама Харкаўскае ваенна-авіяцыйнае вучылішча.

Кацярына ВАРАНЬКО

Звузлаванае памяццю

Незадоўга да сваёй трагічнай смерці Уладзіслаў Нядзведскі напісаў верш "Вузлы". І сёння гэты верш падаецца даволі складаным. Крыху дзіўнаватая і канцоўка ў ім:

Жыццё! Навучы мяне ў слове
Вузлоў навязаць вялікіх.

Звычайна сваё маленства людзі згадваюць з добрай, нават шчаслівай усмешкай, як даўно вядомую казку. У яго ж біяграфіі не атрымалася той казкі, азірнуўшыся на якую можна было б весела ўсміхнуцца. Нават у тым светлым, што часам згадвалася, прадчувалася нейкая блізкая бяда. Яе, здаецца, адчуваем і мы, калі разам з аўтарам узнаўляем далёкія матуліны праводзіны сына ў школу: "Узышоў на ганак, азірнуўся, а яна стаіць і выцірае слёзы. Не ведаю, чаго яна заплакала. Малы быў — не спытаў, а пасля — было позна".

Пэўна, не таму заплакала маці, што ў школе, куды яна адвяла свайго маленькага сына, вучобу падмацоўвалі і муштрой: цягалі малых за вушы, лупцавалі лінейкай па далонях (гэта была завядзёнка старой польскай школы). Плакала маці, відаць, таму, што прадчуваліся нейкія хуткія і нядобрыя змены ў гэтым свеце. Сумныя весткі даходзілі і да Рахавіцкіх хутароў на Лунінеччыне, дзе жылі Нядзведскія. 2 верасня 1939 года, праз дзень пасля нападу гітлераўцаў на Польшчу бацьку мабілізавалі ў польскае войска. Служыў побач, у Лунінцы. Хлапчук быў здзіўлены, нават расплакаўся, калі неўзабаве вечарам убачыў бацьку на парозе роднай хаты ў адным споднім. Гэтым і запомніліся славутыя вераснёўскія падзеі. У тым верасні хлапчук пайшоў у трэці клас. У той самай школе яго вучыў той жа настаўнік, але размаўляў ён ужо не па-польску, а на роднай мове.

Пачатковая школа была скончана, ішоў 1941 год. Вось тут і пачалі спраўджвацца тыя страшныя прадчуванні. Пазней ужо, у сталым узросце самі сабой напішуцца радкі:

Я помню ўсё...
Я стаў дарослым рана —
У дваццаць год
на скронях сівізна.
Зноў у грудзях
занылі моцна раны,
І праклінаю я цябе, вайна!..

На вачах хлапчука фашысты і паліцаі паляць школьную бібліятэку. Гараць кнігі, а хтосьці з гэтага дзіка пацяшаецца. А неўзабаве запалаюць і хаты, у жудасным агні будуць гарэць людзі.

Летам 1942 года вёска Рахавічы ўвайшла ў партызанскую зону. Жыццё ў ёй пайшло як быццам тым жа даваенным парадкам, нават мастацкая самадзейнасць прыязджала з канцэртамі. І малому Уладзю падалося, што вайна іх урэшце абмінула. А ў лютым 1943 года пачалася блакада. Падчас аблаў карнікі пачэсвалі лес, палілі і знішчалі ўсё на сваім шляху. Вось сведчанне пра тыя падзеі самога У. Нядзведскага: "16 лютага хмурай раніцай карнікі па следу знайшлі ў лесе месца, дзе хавалася наша сям'я. Мне і малодшай сястры Віні ўдалося ўцячы. Маці, бацьку, малодшага брата Антося і сястру Стэфу фашысты забілі. Два тыдні туляліся мы ў лясах разам з суседзямі, пакуль закончылася аблава. Пасля хавалі вяскоўцаў — каго выкопвалі і пераносілі на могілкі з лесу, каго — толькі кучку абгарэлых касцей — з пажарышчаў".

Па першым часе ўцекачы жылі ў матчынага брата. А ў таго была свая сям'я, і немалая. Ратункам для хлапчука стане дзіцячы дом у Мікашэвічах, куды яго неўзабаве накіруе райкам камсамола. Тут ён зразумеў: жыццё сваё мусіць ладзіць сам, сваімі намаганнямі і высілкамі. Тут пачаў пісаць і вершы. На пытанне, чаму пачаў пісаць, паэт так і не даў пэўнага адказу. Але ёсць здагадка, што гэтаму паспрыяла сустрэча з Якубам Коласам, калі той аднойчы прыязджаў да сваіх выбаршчыкаў у Мікашэвічы. Згадваў часта У. Нядзведскі і верш Пімена Панчанкі "Балада пра Міколу Сасноўскага", які ён прачытаў у лістоўцы, скінутай з самалёта ў партызанскім лесе, і які яго дужа крануў. Хіба думаў юнак, што некалі яму давядзецца працаваць у часопісе "Маладосць", узначальваць які будзе той самы Пімен Панчанка. Там жа надрукуюць і ягоную аповесць "Хлопцы з другога корпуса". Ён некалі пабяцаў сябрам з дзіцячага дома напісаць такі твор. І сваё абяцанне выканаў. Як многа значыла для паэта тое асяроддзе, можна меркаваць і па наступных радках:

У доме дзіцячым
я кожнай сцяне
Складаць абавязан паэму.

Ён і сапраўды рана стаў дарослым, а цяжкое, горкае ваеннае маленства хадзіла ўслед за ім і часта не давала ўтрымлівацца ў межах строгіх камсамольскіх правіл паводзін. Пра свае універсітэцкія гады паэт згадвае так: "Вучыўся я ва універсітэце без асаблівага энтузіязму, часта ў шматтыражную ці факультэцкую газету траплялі мае вершы, і нярэдка там жа змяшчаліся карыкатуры і фельетоны на мяне. Наогул, выхоўвалі мяне, як належыць, не толькі друкаваным, але і вусным словам на розных сходках і пасяджэннях".

А паэтам ён быў таленавітым. Працаваў У. Нядзведскі нейкі час і настаўнікам, але гэта было не яго прызванне. Найлепш пачуваўся на журналісцкай працы, калі быў рэдактарам на тэлебачанні і ў часопісе "Маладосць". Ён адразу палюбіў журналісцкія дарогі, якія дарылі яму шмат сустрэч, знаёмстваў. Любіў і шанаваў людзей працы. Тую ж, як тады казалі, "ствараль-ную працу" славіў і ў сваіх вершах.

Назва першай кнігі гаворыць сама за сябе "Вясновыя барозны". Тэматычна блізкая да яе і другая — "Запрашэнне". Запрашаў паэт усіх, хто мае "свой пашпарт — мазольныя рукі", не на нейкі там шпацыр, а на нялёгкую працу ў вёску. А што тычыцца так званай "шчымлівай лірыкі", дык яе ў Нядзведскага амаль не знойдзеш.

Напісаў за сваё кароткае творчае жыццё У. Нядзведскі не так і мала. Як дарагі падарунак я захоўваю ў сябе тую танюткую ў чорнай вокладцы, з чырвонай, як рана, плямкай унізе кнігу "Размова з адсутнымі". Разгортваю яе, і адразу згадваю сакавіцкі сонечны дзень 1970 года, рэдакцыйны пакой Беларускага радыё. Мы толькі што вярнуліся са студыі, дзе запісвалі яго новы верш, а цяпер ён сядзіць за сталом і падпісвае мне кнігу. У пакоі разам з намі бывалыя радыйцы Юрась Свірка і Іван Калеснік. Кніга падпісана. "Схавай, потым пачытаеш", — кажа ён. І мы ўчатырох адпраўляемся на традыцыйнае піва, будзем яшчэ доўга блукаць ля берагоў Свіслачы. І праз гады я перачытваю яго аўтограф:

"Казіміру Камейшу!
Каб ён сядзеў на радыё
І ўсіх адсутных радаваў,
Прыветліва і горача,
Пра родны край гаворачы!
У. Нядзведскі
30.03.1970"

Пагартаў старонкі кнігі і спыніўся на вершы "Размова з бацькам". І праляцела перад вачыма цэлае чалавечае жыццё, якое тварыў ён сам, і якое ад самага пачатку запатрабавала незвычайнай самаахвярнасці, самых сапраўдных іспытаў, пошукаў ды расчараванняў.

Пасля ў шырокі свет
Свой скіраваў я след
І выжыў у лютай бядзе,
Бо хлеб свой еў недарэмна.
Шанцавала на добрых людзей
Больш, чым на дрэнных.
Яны, як каму наплыве,
Чалавека з мяне рабілі:
То гладзілі па галаве,
То моцна па ёй жа білі.

...Вайна проста так не выпусціла са сваіх кіпцюроў мужнага палешука: ці не з яе ласкі меў цяжкую хваробу. Але што там хвароба, калі перад ім сама смерць аднойчы адступіла. Ён годна жыў і працаваў, знаходзіў час нават для гумару (мае ў сваім набытку кнігі гумару "Капронавыя галёшы" і "Начная пагоня").

Загінуў паэт трагічна кастрычніцкай ноччу 1973 года. Размова выходзіць сумнай, калі вядзеш яе з адсутнымі. Хоць пра адсутнасць гаварыць зусім не хочацца. Бо паэтам У. Нядзведскі быў сапраўдным, сваімі лепшымі творамі ён застанецца прысутным...

Казімір КАМЕЙША

Душа твая – малюнак артыстычны...

Душа твая — малюнак артыстычны:
Пад лютняў звон прыгожы масак рой
Танцуе там, адзеўшыся нязвычна,
Ў надзеі скрыць праз гэта смутак свой...

М. Багдановіч

Максім Багдановіч — адзін з самых любімых беларускіх паэтаў. Яго вершы прасякнуты любоўю да жыцця, тонкім адчуваннем прыгажосці, глыбокімі перажываннямі, напоўнены філасофскімі думкамі.

Знёмства з аўтарам шэдэўраў можа раскрыць дадатковыя грані яго творчасці. Праз кнігі, апісанні, лісты і іншыя дакументы ствараецца яго адметны вобраз творцы, для кожнага даследчыка свой, непаўторны.

Мне хацелася б расказаць пра вобраз "майго" М. Багдановіча. І лепшы спосаб гэта зрабіць — намаляваць яго партрэт, хай сабе і словамі, таму што партрэт — гэта не толькі знешні воблік чалавека, але і адлюстраванне яго душы, жыцця, характару і памкненняў.

Адна з асноўных вартасцей партрэта — гэта знешняе падабенства. Сёння мы можам даведацца, як выглядаў М. Багдановіч, толькі па фотаздымках ці ўспамінах людзей, якія былі з ім знаёмыя. Хацелася б намаляваць вобраз чалавека, асоба якога ўжо сфарміравалася, таму звярнуся да двух самых позніх з вядомых фотаздымкаў Багдановіча.

Апошні з іх датуецца 1915 годам. Гэта выкадроўка з групавога здымка супрацоўнікаў яраслаўскай газеты "Голас". М. Багдановіч на ім ужо зусім дарослы, з вусамі, з вачамі чалавека, упэўненага ў сваім шляху. 1915 год для Максіма — час плённай творчай і грамадскай працы.

Многія мастакі, малюючы партрэт М. Багдановіча, абапіраюцца на гэты фотаздымак, таму што менавіта так выглядаў паэт і ў дваццаць пяць гадоў. Людвіка Сівіцкая (Зоська Верас) пісала ў сваім лісце да супрацоўнікаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча: "Я асабіста трымаюся свайго пагляду: для мяне найбольш падобны, "як жывы" той з 1915 г. газэты "Голос". Такім быў Максім Багд[ановіч — ***К.К.***] і ў 1916 г. у Менску. Такім я яго бачыла кожны дзень праз усе 5 месяцаў. Я ведаю, што тэхнічна ён [фотаздымак — ***К.К.***] вельмі няўдалы. Перазьняты з газэты ня мог быць іншым. Але падабенства твару — выключнае. Такім я яго помню" (захавана арфаграфія і стылістыка арыгінала).

Каб намаляваць чалавека з мэтай перадаць яго знешні выгляд, сапраўды лепш за ўсё звярнуцца да апошняга фотаздымка. Але ж я хачу намаляваць вобраз "майго" Максіма — чалавека натхнёнага, неабыякавага, рамантычнага і чуллівага, упэўненага ў сваіх сілах, упартага ў памкненнях. Такога чалавека я бачу на іншым фотаздымку.

Ён зроблены ў 1911 годзе, калі Максім скончыў гімназію. На мой погляд, гэта адзін з самых шчаслівых гадоў яго жыцця. Паэт упершыню пасля ад'езду ў Расію наведаў Беларусь, патрапіўшы нарэшце ў беларускае асяроддзе, якога ён так прагнуў. Тут яго сустрэлі "завочныя" сябры Антон Луцкевіч і Вацлаў Ластоўскі; яго захапіў подых даўніны ў калекцыі Івана Луцкевіча, брук віленскіх вулак і кветкі беларускай вёскі. На гэтым фотаздымку мы бачым юнака з задуменным позіркам, поўнага ідэй і надзеі.

Варта яшчэ раз звярнуцца да ўспамінаў тых, хто ведаў паэта.

"Росту быў высокага, добра складзены, але трымаўся крыху сутулавата. Валасы меў густыя, крыху хвалістыя, цёмна-русыя, у барадзе і вусах каштанавыя. Вочы шэрыя", – так апісваў знешні выгляд свайго сына Адам Ягоравіч Багдановіч. Захаваліся ўспаміны іншых людзей, якія адзначалі прывабную знешнасць Максіма, але большасць з іх спынялі сваю ўвагу на яго рысах характару, якія выклікалі прыхільнасць. Напрыклад, гімназічны сябра Ціхан Годнеў так гаварыў пра яго: "Сціплага, выхаванага і таварыскага, яго адразу палюбіў клас". І такое ўменне выклікаць сімпатыю з першага позірка Багдановіч пранёс з сабой праз усё жыццё. Нават апошнія яго сябры, з якімі Максім пазнаёміўся ў Мінску, успрынялі паэта менавіта так: "Сардэчны, скромны і просты М. Багдановіч адразу заваяваў агульную сімпатыю", — пісала Зоська Верас.

Вельмі цікавую рысу характару Максіма ўзгадваў яго бацька: "Натуру меў вясёлую, асабліва ў дзяцінстве і юнацтве. Смяшлівы, гэту рысу асабліва адзначаю... Рэдка што-небудзь без смеху ён мог перадаць, ва ўсім знаходзіў смешны бок... Пазней, у юнацтве, калі ў ім выявілася грудная хвароба, гэты прастадушны дзіцячы смех замяніўся лёгкай усмешкай, якая нязменна праглядвалася на яго вуснах і сыходзіла з вуснаў толькі тады, калі ён чым-небудзь раздражняўся".

Такім чынам, я малюю партрэт юнака без вусоў, з каштанавымі валасамі, усмешкай і вачыма, у якіх змяшчаецца цэлы свет. Наступны крок у стварэнні партрэта — выбар фону, асяроддзя, дэкарацый, у якія змяшчаецца мадэль. Магчыма, у дадзеным выпадку гэта адзін з самых цяжкіх момантаў, таму што асяроддзе М. Багдановіча было вельмі разнастайным, па-рознаму раскрывала яго асобу і адпавядала яго настрою.

Ён ідзе босы па полі і дыхае водарам
кветак Ракуцёўшчыны?
Ён крочыць па віленскім бруку?
Ён гуляе па ўзбярэжжы Волгі?
Ён рухаецца...
Ён розны...

На маю думку, гэта самы важны момант у раскрыцці вобраза М. Багдановіча. Ён рухаўся па жыцці, пастаянна здабываў новыя веды, шукаў магчымасці данесці да людзей як мага больш сваіх душэўных памкненняў, прычым рабіў гэта як сапраўдны мастак — прыгожа, вытанчана.

Але ўсё ж такі трэба вызначыцца з фонам для партрэта М. Багдановіча. Мне больш за ўсё імпануе час сустрэчы паэта з Вільняй. На маю думку, менавіта гэты перыяд наталіў яго смагу беларускасці, падтрымаў веру ў неабходнасць той працы, якой ён прысвяціў сваё жыццё. З усіх гарадоў толькі Вільня пакінула настолькі глыбокі след у творчасці паэта.

Хай на партрэце Максім гуляе па брукаваных вуліцах старажытнага беларускага горада побач з касцёлам святой Ганны, які яго моцна ўразіў.

Ён апрануты ў гімназічную вопратку, трымае ў руках кнігі і з цікаўнасцю глядзіць уперад. Самае галоўнае ў партрэтнай выяве — гэта позірк. Праз позірк, скіраваны на гледача, перадаецца душа.

Кацярына КАНДРАЦЕНКА,
загадчык навукова-экспазіцыйнага аддзела Літаратурнага музея Максіма Багдановіча

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва" выказвае глыбокае спачуванне сакратару Саюза пісьменнікаў Беларусі, намесніку галоўнага рэдактара часопіса "Маладосць" Алесю Марціновічу з прычыны смерці ягонай МАЦІ.

Супрацоўнікі часопіса "Маладосць" выказваюць глыбокае спачуванне намесніку галоўнага рэдактара Марціновічу Алесю Андрэевічу з прычыны вялікай страты — смерці МАЦІ.

Канец васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя вызначаецца ўздымам нацыянальнай свядомасці, сацыяльнай актывізацыяй і нацыянальным адраджэннем. У беларускай літаратуры замільгалі новыя імёны, а паэзія ўвогуле нарадзіла і развіла новы, да таго часу амаль не апрабаваны жанр — аўтарскую або, па-іншаму, бардаўскую песню. У шэраг пачынальнікаў нацыянальнай бардаўскай песні многія даследчыкі запісваюць Алеся Камоцкага, Сержука Сокалова-Воюша, Леру Сом, Аляксея Мельнікава, Кастуся Герашчанку... Не апошнім у гэтым пераліку стаіць імя барда Віктара Шалкевіча. З бардам сустрэўся наш карэспандэнт.

Унутранае святло барда

— Аглядваючыся на пройдзены шлях, заўважаеш — мала хто з былых куміраў застаўся на паэтычным алімпе аўтарскай песні. Сокалаў-Воюш працуе недзе на радыё Еўропы, Уладзімір Клімковіч з'ехаў у Лацінскую Амерыку, не чутно Ланы Медзіч, вельмі рэдка чуваць песні Алеся Камоцкага, а многія ўвогуле перасталі спяваць. Адзін Віктар Шалкевіч застаўся верным свайму прызванню. Віктар, што для цябе ёсць бардаўская песня?

— Бардаўская песня для мяне — гэта спосаб самавыказвання. Тое ж самае, як для токара — тачыць гайкі, а для даяркі — даіць каровы. Я не магу нічога не пісаць. Ёсць у кожнага, хто піша, своеасаблівая ўласцівасць натуры. Адзін адгукаецца гэтым, другі — іншым, а трэці — затоіць у сабе што-небудзь: носіць-носіць, а потым выплёскваецца ў чатыры ці восем радкоў. Гэта і ёсць творчы пачатак у чалавеку.

У сувязі з гэтым пытаннем успомніў такую смешную, ці то показку, ці то анекдот. "Шчірліц зрабіў кату ін'екцыю бензіна. Кот прабег некалькі метраў і здох. Бензін скончыўся, — падумаў Шчірліц". Так і тут. Усё залежыць ад таго, наколькі хапае ў нас гэтага бензіну, а менавіта, магчымасці рэагаваць на з'явы: грамадскія, палітычныя, на чалавечыя з'явы, ці проста на з'явы прыроды. Вось гэта і ёсць для мяне аўтарская песня.

— Быў такі вядомы бард — Алег Атаманаў. Пісаў на роднай мове. Калі ж амплітуда зацікаўленасці мовай змянілася — ён адразу пераключыўся на рускую мову. Табе не хацелася змяніць свайго слухача? Выйшаў бы, напрыклад, на шырокую рускамоўную аўдыторыю, і цяпер ездзіў бы ў шыкоўным лімузіне?

— Жыццё з намі яшчэ і не тое робіць. Можна аб'явіць сябе не тое, што "Баянам усяе Русі", а нават — "Акардэонам усёй Галактыкі". Але, каб пісаць па-расійску, трэба адчуваць рускую мову. Я адчуваю сябе беларусам, таму што чую ў душы толькі беларускую мову.

— Ты ж і па-польску пісаў. У тваіх ранейшых песнях праклёўваліся не толькі асобныя польскія словы, а нават цэлыя выразы і строфы.

— Пісаў і пішу. У мяне ёсць цэльная польская праграма на паўтары гадзіны, якую магу ў любы час праспяваць. Калі здараюцца канцэрты ў Маскве, спачатку я проста тлумачу на рускай мове тое, што буду спяваць па-беларуску. А потым выходзяць рэцэнзіі кшталту: "Боже мой! Какой чудесный архаичный язык!". Разумееш, што ўсе гэтыя спробы спяваць па-англійску, ці па-французску — ні да чога добрага не прывялі. Чалавек спачатку павінен адбыцца «тутака». А калі адбыўся «тутака», то ён набывае магчымасць "з лаўрамі адбыўшагася тутака" ехаць куды заўгодна.

— Наконт лаўраў. Ці не распесцілі цябе лаўры славы і прызнання?

— Некаторыя з маіх калег думаюць, што на тым, што яны робяць, можна зарабляць вялікія грошы. Зусім не. У нас вельмі маленькая краіна, маленькае кола слухачоў. Гэта нават не Польшча з сарака мільёнамі, не Злучаныя Штаты Амерыкі, і не Расія. Па-першае, робіш усё дзеля прыемнасці. Вялікіх грошай гэта ніколі не прыносіць. Па-другое, вельмі цяжка ўвесь час бегчы наперадзе. Нейкім чынам хочацца пажыць і для сябе. Хочацца сапраўды адрэагаваць і на ўзыход сонца, і на тое, напрыклад, што сядзіш на сваім кавалку зямлі: прыбег заяц, паглядзеў на цябе і раптам уцёк... Тая ж зязюля табе лічыць гады... Прагнеш нейкай прыватнасці. Гэта мне падабаецца. Калі я стаў менш пісаць, гэта не значыць, што стаў пісаць горш.

— Пятнаццаць гадоў таму Віктар Шалкевіч пазнаваўся па песнях "Кароткая гісторыя Беларусі", "Ганка — дзеўка з Пагулянкі", быў яшчэ цыкл тваіх прыкметных блюзаў: "Сярэднявеча", "Добрай раніцы...". Калі хто патрапіць на твой канцэрт сёння — якія песні Віктара Шалкевіча пачуе?

— Можа быць, мая паэзія стала менш палітызаванай, зрабілася больш асабістай, магчыма, стала больш лірычнай. Увесь ранейшы пафас ператварыўся ў нейкую вельмі рамантычную песню "Жанчына з бутэлькай піва", ці ў "Баладу пра шчаслівага бамжа". Ніхто не кажа, што памяняліся палітычныя погляды, або стаўленне да жыцця. У што верыў, у тое і працягваю верыць. Што любіў, тое і любіцца. Бывае ж і так: чалавек любіў адно, а стаў любіць зусім іншае. З якімі сябрамі сябраваў, з тымі сябрую да гэтага часу. Праўда, жыццё расстаўляе акцэнты, ставіць і кропкі, і коскі, часам — і шматкроп'і. Трэба ісці праз гэтае жыццё, збіраць свае ўражанні і пераліваць іх на паперу — гэта самае важнае для мяне.

— Калі я першы раз убачыў цябе на сцэне "Басовішча" — ты выклікаў неадназначнае ўражанне. Потым я заўважыў, што бард Віктар Шалкевіч не пакідае слухачоў абыякавымі да сябе. Яго або любяць, або, часам, ён кагосьці вельмі раздражняе. У прыватнасці, я быў сведкам, як жанчына пасля канцэрта кідалася на цябе з кулакамі. Як ты ставішся, калі твае песні неадэкватна ўспрымаюцца і слухач прачытвае тое, чаго ты зусім не ўкладваў у тэкст?

— Ты ведаеш, мне здаецца, усе тыя, хто мяне ненавідзеў, зараз мыюць брудны посуд у танных барах Злучаных Штатаў Амерыкі. Я сустракаў гэтых людзей. Нават доўга размаўляў з імі. Я памятаю, гэта была рэакцыя на "Жлобскую нацыю", былі такія крыкі: "У вас извращённое сознание!". Маўляў, Беларусь адраджаецца, а вы... Гэта было дзесьці на першым-другім годзе незалежнасці. Мы ўсе ведаем, што нічога адразу не бывае. Праходзіць вельмі доўгі і складаны працэс перш чым нешта павінна адбыцца і сцвердзіцца.

Цяпер народ крыху паразумнеў і калі яму не падабаецца — ён проста не ходзіць на канцэрты. Але для мяне асноўны паказальнік той, што калі быў канцэрт у Палацы прафсаюзаў — білетаў усім не хапіла.

— Найперш — нагода, з якой пішацца тая ці іншая песня. Напрыклад, апошнюю песню "У мяне была такая доўгая зіма" — пісаў гадоў пяць, нават болей. Я запомніў эпізод, калі мы ў Вільні на ноч пакінулі пад яблыняй кубкі з гарбатай, прыйшлі раніцай — у іх нацякла вада. Было так здорава ўбачыць у гарбаце пялёсткі і сухія лісты... І гэта зачапіла. І тады прыйшлі радкі "паволі ўцякае час, а ў жніўні, у садзе каля хаты, пад яблыняй чакаюць нас недапітыя кубкі гарбаты".

— Ты і цяпер працуеш у Гродзенскім тэатры лялек?

— На палову стаўкі.

— І як цябе хапае: працаваць, пісаць песні, даваць канцэрты па Беларусі, у Расіі і Польшчы?

— Хапае... Зараз у мяне такі перыяд настаў, што я займаюся тым, чым люблю займацца. Ці я сам сабе так жыццё зрабіў, ці яно само так выкіравалася. Мая мама заўжды казала: "У цябе, сынку, лёгкі хлеб". Але ж на гэты лёгкі хлеб трэба было зарабіць? Канечне, гэта не лапата і не граблі. Хаця і гэта трэба не забываць — раз-пораз узяць у рукі гнойныя вілы, каб адчуць, што такое мазалі, хаця, як кажуць, гультай на поле — мазоль на руку. Так атрымалася — я ж не вінаваты ў гэтым.

— Бард — гэта спалучэнне аўтарскай імпрэсіі, артыстычны вобраз, абаянне асобы аўтара, і гэта таксама тэкставае напаўненне, мелодыя, інструмент... Што для цябе першаснае ў тэкстах аўтарскіх песень?

— Найперш — нагода, з якой пішацца тая ці іншая песня. Напрыклад, апошнюю песню "У мяне была такая доўгая зіма" — пісаў гадоў пяць, нават болей. Я запомніў эпізод, калі мы ў Вільні на ноч пакінулі пад яблыняй кубкі з гарбатай, прыйшлі раніцай — у іх нацякла вада. Было так здорава ўбачыць у гарбаце пялёсткі і сухія лісты... І гэта зачапіла. І тады прыйшлі радкі "паволі ўцякае час, а ў жніўні, у садзе каля хаты, пад яблыняй чакаюць нас недапітыя кубкі гарбаты". Вельмі доўга пісалася песня. Ёсць маса літаратараў, якія зараз жа адгукаюцца на падзею вершам, ці нават трыма такімі доўгімі, можа быць, не вельмі талковымі. Я думаю, варта напісаць меней, ды лепей, каб потым не было брыдка за кожны верш.

— Колькі дыскаў у цябе выйшла?

— Я ўжо перастаў лічыць. Калі ўласных, дык, пэўна, пяць, ці шэсць.

— Ты не спрабаваў тэксты песень выдаць асобнай кніжкай?

— Зараз павінна выйсці кніга пры дапамозе маіх сяброў з Масквы, Валеры Казакова, беларуса, які жыве ў Маскве. Выйдзе кніжачка, і там будзе ўкладыш у выглядзе кампакт-дыска. Калі тэксты чытаеш асобна ад песні, то яны зусім па-другому ўспрымаюцца.

— Агульначалавечае пытанне. Тры асноўныя якасці, якія табе падабаюцца ў людзях, і якія ты хацеў бы мець у сваёй душы?

— Давай падзелім людзей на мужчын і жанчын. У мужчынах мне падабаецца, калі чалавек даў слова і трымае яго. Гэта вельмі важна. Калі ён мала гаворыць, а многа робіць. І трэцяе, калі ён — нармальна выхаваны: можа і ў касцеле і ў пасцелі, і да танца і да ружанца, і з шабляй і з чаркай... Вельмі здорава знаходзіцца сярод такіх людзей, адчуваеш, што ты жывеш паўнакроўна, і прыемна адчуваць, што ёсць людзі падобныя да цябе. У жанчын люблю выхаванасць і шляхетнасць. Добра, калі жанчына любіць музыку, умее на нечым іграць, напрыклад, на фартэпіяна. Мяне заўсёды цягнула да такіх асоб. Ёсць у кожнай жанчыны ўнутранае святло, якое падсвечвае знутры, калі яно ёсць — жанчына заўсёды прыгожая. І гэта адразу заўважальна. Ці яна нараджаецца з гэтым, ці яно прыходзіць з векам, але мне гэта заўсёды падабаецца ў жанчынах — унутранае святло.

Гутарыў
Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Лім

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
крытыкі
і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3117
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 5.08.2009 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 7
Заказ — № 4156

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686